Г. В. Штыхаў, С. М. Цемушаў, В. У. Ракуць

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.

Вучэбны дапаможнік
для 6 класа агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай мовай навучання

Пад рэдакцыяй доктара гістарычных навук, прафесара Г. В. Штыхава
і доктара гістарычных навук Ю. М. Бохана

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Выдавецкі цэнтр БДУ»
2009

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

УДК 94(476)(075.3=161.3)
ББК 63.3(4Беи)я721
Ш94

А ў т а р ы:
Г. В. Штыхаў — «Слова да вучняў», «Звесткі пра вучэбны дапаможнік», «Уводзіны», «Заключэнне», «Слоўнік гістарычных паняццяў і тэрмінаў», § 1—7;
С. М. Цемушаў — § 8—14; § 15, 26 (у сааўт. з В. У. Ракуцем);
В. У. Ракуць — § 16—25; § 15, 26 (у сааўт. з С. М. Цемушавым)

Р э ц э н з е н т ы:
кафедра гісторыі і культуры Беларусі Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Куляшова (канд. гіст. навук, дац. *Т. У. Апіок*);
канд. гіст. навук, праф. каф. гісторыі і культуры Беларусі Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта імя А. А. Куляшова *П. Ф. Дзмітрачкоў;*
метадыст першай катэгорыі ўпраўлення вучэбна-метадычнай работы Акадэміі паслядыпломнай адукацыі *В. М. Вараловіч;*
настаўнік гісторыі вышэйшай катэгорыі гімназіі № 11 г. Мінска *І. Р. Драгавоз*

**Штыхаў, Г. В.**
Ш94 Гісторыя Беларусі са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст. : вучэб. дапам. для 6-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / Г. В. Штыхаў, С. М. Цемушаў, В. У. Ракуць ; пад рэд. Г. В. Штыхава, Ю. М. Бохана. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2009. — 143 с. : іл.
ISBN 978-985-476-693-5.

**УДК 94(476)(075.3=161.3)**
**ББК 63.3(4Беи)я721**

**ISBN 978-985-476-693-5**

© Штыхаў Г. В., Цемушаў С. М., Ракуць В. У., 2009
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2009

Правообладатель Издательский центр БГУ

# СЛОВА ДА ВУЧНЯЎ

Юныя сябры! Перад вамі вучэбны дапаможнік па гісторыі нашага краю ў старажытныя часы і сярэднія вякі.

Вы ўжо ведаеце, што старажытная (першабытная) гісторыя — першая агульная ступень у гісторыі ўсіх народаў свету. Гэты перыяд быў самым працяглым у гісторыі чалавецтва. Першабытнае грамадства заклала аснову, на якой развівалася ўся далейшая сусветная культура.

У канцы V ст., з падзеннем Заходняй Рымскай імперыі, закончылася гісторыя старажытнага свету. Пачалася гісторыя сярэдневякоўя, якая доўжылася больш за тысячу гадоў (да пачатку новага часу) і была багатай на яскравыя і важныя падзеі.

У Заходняй Еўропе ў сярэднія вякі існаваў феадалізм, узнікалі і развіваліся дзяржавы, фарміравалася своеасаблівая культура. Падобныя з'явы адбываліся тады і на беларускіх землях.

Вывучаючы гісторыю Беларусі, вы даведаецеся пра князёў, мужных абаронцаў сваіх княстваў, царкоўных дзеячаў, пісьменнікаў, асветнікаў, а найперш пра жыццё і побыт простага люду, які ствараў і прымнажаў багацці роднага краю.

Гісторыя кожнай краіны — гэта ўвасабленне сувязі вякоў і народаў. Гісторыя Беларусі не з'яўляецца выключэннем. Яна цесна звязана з гісторыяй Кіеўскай Русі, у склад якой разам з сучаснымі беларускімі землямі ўваходзілі тэрыторыі сучасных Расіі і Украіны. Таму вам неабходна суадносіць падзеі айчыннай гісторыі з падзеямі, якія вывучаюцца ў курсе сусветнай «Гісторыі сярэдніх вякоў», каб зразумець адметнасць гісторыі нашай Радзімы.

Гісторыю называюць настаўніцай жыцця. І гэта адпавядае сапраўднасці. Вывучаючы мінулае, мы лепш разумеем сучаснасць, у нас з'яўляецца магчымасць прадбачыць будучыню.

Наперадзе шмат цікавага і важнага. У добры шлях, юныя сябры! Няхай падарожжа за гістарычнымі ведамі будзе для кожнага з вас карысным і захапляльным.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# ЗВЕСТКІ ПРА ВУЧЭБНЫ ДАПАМОЖНІК

Працуючы з дапаможнікам, звярніце ўвагу на тое, як пабудавана кніга, колькі ў ёй раздзелаў, параграфаў. Кожны параграф падзяляецца на часткі. Яны ўмоўна называюцца «пунктамі» і абазначаны лічбамі.

Кніга пачынаецца «Уводзінамі», дзе даюцца агульныя звесткі пра гісторыю Беларусі ў старажытнасці і сярэдневякоўі, пра асноўныя крыніцы, з якіх мы даведаліся аб гэтых часах.

У пачатку кожнага параграфа прапануюцца пытанні пад рубрыкай «Успомніце». Адказы на іх падрыхтуюць вас да больш удумлівага вывучэння матэрыялу.

У некаторых пунктах вы знойдзеце рубрыку «Гэта цікава», матэрыялы якой паглыбяць вашы веды па гісторыі.

У канцы параграфа даюцца пытанні і заданні. Адны з іх разлічаны на паўтарэнне і ўзнаўленне вывучаемага матэрыялу, другія — на прымяненне атрыманых ведаў. Каб выканаць некаторыя заданні, патрэбна не толькі зразумець прачытанае, але і больш падумаць, паразважаць, а калі спатрэбіцца, звярнуцца за дапамогай да настаўніка.

Вывучэнне гісторыі грунтуецца на шырокім выкарыстанні гістарычных крыніц, як пісьмовых, так і рэчавых. Гэта дае магчымасць не толькі ўявіць мінулае такім, якім яно было, але і паразважаць над яго падзеямі. У рубрыцы «Дакументы і матэрыялы» прыводзяцца кароткія ўрыўкі з гістарычных твораў, летапісаў і іншых пісьмовых крыніц. У больш поўным аб'ёме іх можна знайсці ў дапаможніку для вучняў і настаўнікаў «Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі ў сярэднія вякі (VI—XV стст.)» (Мінск, 1998), якія ёсць у школьных бібліятэках.

Картасхемы, змешчаныя ў вучэбным дапаможніку, даюць уяўленне аб тым, дзе адбываліся тыя ці іншыя падзеі. Тлумачэнне слоў, выдзеленых у тэксце ***тлустым шрыфтам***, можна знайсці ў «Слоўніку гістарычных паняццяў і тэрмінаў». У канцы кнігі ёсць храналагічная табліца асноўных дат.

Дапаможнік забяспечаны спісам літаратуры, што рэкамендуецца для пазакласнага чытання.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# УВОДЗІНЫ

## Успомніце

1. Што вывучае навука гісторыя?
2. Што азначаюць паняцці: *рэчавыя гістарычныя крыніцы, пісьмовыя гістарычныя крыніцы*?

**1. Значэнне ведаў па айчыннай гісторыі.** Добрае веданне гісторыі сваёй Бацькаўшчыны — гэта найважнейшы грамадзянскі абавязак кожнага з нас. Чалавек, які грунтоўна ведае шляхі развіцця сваёй краіны, напаўняецца пачуццём любові да яе, робіцца сапраўдным патрыётам. Веданне мінулага дае надзейную апору ў жыцці. Такі чалавек становіцца носьбітам гістарычнай памяці свайго народа. Яго ахоплівае прага дзейнасці. Ён імкнецца пакінуць свой след у гісторыі Радзімы, садзейнічаць таму, каб яна была моцнай і квітнеючай.

**2. Гісторыя Беларусі — частка сусветнай гісторыі.** У старажытныя часы людзі пранікалі на тэрыторыю Беларусі з паўднёвых, паўднёва-заходніх і іншых рэгіёнаў. Паступова яны пераходзілі да аселага ладу жыцця. Непасрэднымі продкамі беларусаў сталі славяне, якія рассяліліся тут.

З далёкіх часоў гісторыя насельніцтва Беларусі была звязана з гісторыяй іншых народаў і зямель. Паміж імі існавалі гандлёвыя сувязі. У каменным веку высакаякасны крэмень з Беларускага Панямоння трапляў да многіх суседніх плямён. У бронзавым веку з Прыкарпацця і Каўказа на беларускія землі паступалі медзь і бронза. З Прыбалтыкі прывозіўся бурштын (янтар).





*Скіфскія бронзавыя наканечнікі стрэл і бурштынавы крыж, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі*

У сярэднія вякі сувязі беларускіх зямель з іншымі краінамі і народамі яшчэ больш па-

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ



*На археалагічных раскопках старажытнага паселішча каля Лагойска*

шырыліся. Княствы на тэрыторыі Беларусі складалі заходнія землі Кіеўскай Русі.

Такім чынам, у сярэднія вякі гісторыя краін і народаў яшчэ ў большай ступені набыла сусветны характар. Што датычыць гісторыі Беларусі, то яна арганічна ўпісалася ў сусветную гісторыю і стала яе неад'емнай састаўной часткай.

**3. Перыядызацыя гісторыі Беларусі старажытных часоў і сярэдневякоўя.** Перыядызацыя гісторыі — гэта падзел яе на пэўныя перыяды — адрэзкі часу, у якія падзеі пачыналіся, развіваліся і заканчваліся. «Сістэма трох вякоў», прынятая ў гістарычнай навуцы, у старажытнай гісторыі Беларусі ахоплівае тры наступныя перыяды:

каменны век (100—35 тыс. гадоў таму — канец 3-га тысячагоддзя да н. э.);

**Старажытны час**

**КАМЕННЫ ВЕК**
**100—35 тыс. гадоў таму — канец 3-га тысячагоддзя да н. э.**

Правообладатель Издательский центр БГУ

бронзавы век (пачатак 2-га тысячагоддзя да н. э. — канец VIII ст. да н. э.);

жалезны век (VII ст. да н. э. — канец V ст. н. э.).

На змену старажытнаму часу прыйшлі сярэднія вякі. Яны працягваліся з канца V ст. і да канца XV ст. Сярэднявякоўе ў школьных курсах гісторыі таксама падзяляецца на тры перыяды.

Першы перыяд — Ранняе сярэднявякоўе (канец V—IX ст.) — працягваўся прыкладна 400 гадоў.

Другі перыяд — Высокае сярэднявякоўе (X—XIII стст.) — таксама ахопліваў каля 400 гадоў.

Трэці перыяд — Позняе сярэднявякоўе (XIV—XV стст.) — доўжыўся каля 200 гадоў.



*Рэчавыя крыніцы з археалагічных раскопак*

**4. Гістарычныя крыніцы.** Для вывучэння гісторыі Беларусі важнае значэнне маюць як рэчавыя, так і пісьмовыя гістарычныя крыніцы. Рэчавыя крыніцы старажытных часоў знаходзяць вучоныя пры археалагічных раскопках. Такія крыніцы маюць істотнае значэнне таксама для вывучэння гісторыі Беларусі V—XIII стст., бо пісьмовых крыніц таго часу захавалася няшмат.

Калі з'явілася пісьменнасць, то звесткі аб жыцці і дзейнасці людзей пачалі запісваць. Ва ўсходніх славян (продкаў беларусаў, рускіх і ўкраінцаў) звесткі аб пісьме адносяцца да канца X — пачатку XI ст. Пазней важныя падзеі пачалі запісваць па гадах. Паколькі славяне год называлі «летам», то такія запісы атрымалі назву ***летапісаў***. Найбольш старажытны летапіс, які захаваўся да нашых дзён, быў складзены ў Кіеве




Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

ў пачатку XII ст. Ён вядомы пад скарочанай назвай «Аповесць мінулых гадоў» (на рускай мове — «Повесть временных лет»). Гэты выдатны твор — незаменная пісьмовая крыніца па гісторыі ўсіх усходніх славян, іх далёкай мінуўшчыне.

### Пытанні і заданні

1. Чаму патрэбна вывучаць гісторыю сваёй Айчыны?
2. Якую сувязь у старажытны час мелі беларускія землі з іншымі землямі?
3. Абгрунтуйце палажэнне, што гісторыя Беларусі з'яўляецца састаўной часткай сусветнай гісторыі.
4. Запішыце ў сшытку па гісторыі храналагічныя рамкі каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў, а таксама першага і другога перыядаў сярэдневякоўя, якія вы будзеце вывучаць у шостым класе.
5. Растлумачце паняцці: *старажытны час, сярэдневякоўе, летапіс.*
6. Растлумачце выраз «сістэма трох вякоў».
7. Прывядзіце прыклады рэчавых гістарычных крыніц.
8. Як называецца найбольш старажытны летапіс усходніх славян?

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

РАЗДЗЕЛ I

# БЕЛАРУСКІЯ ЗЕМЛІ Ў СТАРАЖЫТНЫЯ ЧАСЫ

## § 1. НАЙСТАРАЖЫТНЕЙШЫЯ ЛЮДЗІ КАМЕННАГА ВЕКУ

**Успомніце**

1. Як вы разумееце сцвярджэнне, што наша дзяржава, Рэспубліка Беларусь, знаходзіцца ў геаграфічным цэнтры Еўропы?
2. З якімі суседнімі краінамі ў цяперашні час мяжуе Беларусь?
3. Хто такія неандэртальцы і краманьёнцы?

**1. Тэрыторыя, прырода, кліматычныя ўмовы Беларусі.** Паняцце «тэрыторыя» азначае зямельную прастору з пэўнымі граніцамі (межамі). Тэрыторыя Беларусі размешчана на захадзе Усходне-Еўрапейскай раўніны — найбуйнейшай раўніны зямнога шара. Межы нашай краіны працягваюцца з поўначы на поўдзень на 560 км, а з захаду на ўсход — на 650 км. Па памерах плошчы Беларусь адносіцца да ліку сярэдніх еўрапейскіх краін.

Беларусь мае кампактную (шчыльную) тэрыторыю, размешчаную на водападзеле Балтыйскага і Чорнага мораў, у цэнтры Еўропы. Большая частка Усходне-Еўрапейскай раўніны ляжыць у лясной зоне. У гэтай зоне знаходзіцца ўся тэрыторыя Беларусі.

Клімат Беларусі ўмераны, з дастатковай колькасцю ападкаў. Прыродныя ўмовы нашай краіны ў цэлым спрыяльныя для жыцця і гаспадарчай дзейнасці. Аднак у глыбокай старажытнасці (прыкладна мільён гадоў назад) прыродныя і кліматычныя ўмовы былі зусім іншыя.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Неандэрталец*



*Краманьёнец*

**2. Зледзяненне і спробы пранікнення людзей на тэрыторыю Беларусі.** На працягу існавання Зямлі ў далёкім мінулым перыядычна адбываліся пахаладанні, утвараліся ледавікі. Таўшчыня лёду на абшарах Усходне-Еўрапейскай раўніны, уключаючы Беларусь, дасягала 2 км. Ледавікі рухаліся сюды са Скандынавіі.

Разрастанні ледавіка змяняліся яго адступленнямі. Клімат паступова цяплеў. На прасторы, з якой сыходзілі ледавікі, утвараліся азёры, аднаўляліся рэкі. Але потым, праз шмат гадоў, з новым наступленнем ледавіка зноў пачыналася пахаладанне. Такіх пахаладанняў у Еўропе было пяць. Змяняўся жывёльны і раслінны свет. Здаралася, холад і вечная мерзлата ахоплівалі нават поўдзень Беларусі. Апошняе буйное зледзяненне адбылося 95—10 тыс. гадоў таму.

Спачатку старажытныя людзі сталі рассяляцца на больш цёплым поўдні Еўропы. А на тэрыторыю Беларусі яны праніклі пазней. Чаму ж так здарылася? Па-першае, Беларусь знаходзіцца вельмі далёка ад Міжземнамор'я. Па-другое, прастора Беларусі доўгі час была пакрыта ледавіком.

У перыяды *міжледавікоўя* (часовага пацяплення і знікнення лёду) рабіліся спробы пранікнення чалавека на тэрыторыю Беларусі. На паўднёвым усходзе краіны знойдзена некалькі крамянёвых прылад працы, якімі маглі карыстацца **100—35 тыс. гадоў таму**. Відаць, найстаражытнейшыя людзі — неандэртальцы — наведвалі гэтыя месцы.

Прыкладна **40—35 тыс. гадоў таму** на тэрыторыі Еўропы з'явіўся чалавек сучаснага тыпу, якога вучоныя называюць *краманьёнцам*, ці «чалавекам разумным». Краманьёнцы — нашы непасрэдныя продкі.

**3. Першыя стаянкі.** Месца пасялення першабытнага чалавека каменнага веку называюць ***стаянкай***, але выкарыстоўваюць і назву *«паселішча»*. Доўгі час гісторыкі не ведалі, як выглядала самае стара-

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Старажытнае жытло*

жытнае жытло, зробленае рукамі чалавека. Цяпер рэшткі такога жылля знойдзены на многіх стаянках у Еўропе і Азіі. У Беларусі падобных стаянак дзве. Самая старажытная на беларускіх землях стаянка чалавека каменнага веку знаходзіцца на Прыпяці, каля вёскі Юравічы Калінкавіцкага раёна на Гомельшчыне. Тут жылі людзі **24 тыс. гадоў да н. э.**

Другая стаянка адкрыта на беразе ракі Сож, каля вёскі Бердыж Чачэрскага раёна. Тут людзі жылі **21 тыс. гадоў да н. э.** У Бердыжы вы-




*Першыя людзі на тэрыторыі Беларусі*

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ



Крамянёвыя вырабы са стаянак Панямоння і Падняпроўя



Мамант — выкапнёвы слон

яўлены рэшткі двух паглыбленых у зямлю жыллёвых памяшканняў. Яны былі авальнай формы, пасярэдзіне жытлаў раскладвалася вогнішча. Ніжнія часткі жылля людзі ўмацоўвалі чарапамі і іншымі буйнымі косткамі жывёл. Жытло пакрывалася скурамі. Яно было падобнае на будан (шалаш).

**4. Прылады працы.** Першыя людзі на беларускіх землях рабілі прылады працы з *крэменю*. Гэты камень лёгка расшчапляецца на вострыя кавалкі.

З крэменю навучыліся вырабляць *востраканечнікі*. Імі лягчэй было праколваць і рэзаць скуру жывёлы. Часам востраканечнікі прымацоўвалі да палкі сухажыллямі і смалой. Атрымліваліся прымітыўныя *дзіды (коп'і)*. Людзі выкарыстоўвалі таксама *скрабкі* — прылады для апрацоўкі скур і *разцы*, прызначаныя для разьбы.

**5. Паляванне на мамантаў.** З набліжэннем ледавіка многія цеплалюбівыя жывёлы вымерлі. На іх месца прыйшлі маманты і валасатыя насарогі, паўночныя алені.

Нашы продкі былі ўжо тады здольныя паляваць на буйных жывёл. Марай паляўнічага стаў *мамант* — выкапнёвы слон. Забіўшы яго, атрымоўвалі вялікую колькасць мяса. З костак маманта і яго магутных іклаў-біўняў будавалі жытлы. Косткі жывёл ішлі на паліва ў суровых умовах прыледавіковай, амаль бязлеснай зоны. З іх выраблялі прылады працы і нават упрыгожанні, напрыклад, бранзалеты і пацеркі.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

### Пытанні і заданні

1. Дзе размяшчаецца тэрыторыя Беларусі?
2. Дайце тлумачэнне дат: *100—35 тыс. гадоў таму, 24 тыс. гадоў да н. э., 21 тыс. гадоў да н. э.*
3. Растлумачце паняцці: *міжледавікоўе, краманьёнец, стаянка.*
4. Вызначце кірунак руху ледавіка.
5. Якімі былі вынікі наступлення ледавіка?
6. Дзе размяшчаліся найбольш старажытныя стаянкі на беларускіх землях?
7. Што было выяўлена археолагамі на першых стаянках старажытных людзей?
8. Як называліся найстаражытнейшыя прылады працы?
9. Якая жывёла была найбольш жаданай здабычай для паляўнічых і чаму?

## § 2. ЖЫЦЦЁ ЛЮДЗЕЙ У ПАСЛЯЛЕДАВІКОВЫ ПЕРЫЯД

### Успомніце

1. Якія прылады працы былі ў найстаражытнейшых людзей?
2. З якіх матэрыялаў выраблялiся прылады працы ў каменным веку?

**1. Засяленне тэрыторыі Беларусі першабытнымі людзьмі.** Апошні ледавік адступіў з тэрыторыі Усходне-Еўрапейскай раўніны 8 тыс. гадоў да н. э. Пастунова клімат рабіўся больш цёплым. Былая ледзяная пустыня пакрылася рэкамі і азёрамі. На тэрыторыі Беларусі пачаўся *пасляледавіковы перыяд.*

Шматлікімі статкамі блукалі па дрымучых лясах зубры, туры, ласі. На зялёных лугах пасвіліся табуны дзікіх коней. У паветры лятлі чароды птушак. Прыродныя багацці краю прываблівалі старажытных людзей.

Чалавек зрабіў чарговую спробу рассяліцца па далінах Дняпра, Прыпяці, Сажа. Нарэшце роўныя прасторы ўздоўж рэк, іх даліны былі заселены плямёнамі паляўнічых, рыбаловаў і збіральнікаў. Яны будавалі драўлянае жыллё — буданы конусападобнай формы.

Кліматычныя ўмовы ў Беларусі сталі яшчэ больш спрыяльнымі 4—3 тыс. гадоў да н. э. Людзі пераходзілі да *аселага ладу жыцця.* Іх паселішчы знаходзіліся на берагах рэк, азёраў ці на прыбярэжных пясчаных невялікіх пагорках — дзюнах. Стаянкі (паселішчы) нярэдка размяшчаліся групамі блізка адна ад адной.

Правообладатель Издательский центр БГУ




*Першабытны чалавек навучыўся здабываць агонь з дапамогай трэння сухога дрэва. Спосабы здабывання агню: а) скабленне; б) пілаванне; в) свідраванне*

**2. Заняткі і промыслы ў пасляледавіковы перыяд.** Пасля адыходу ледавіка людзі пачалі займацца збіральніцтвам. Асноўны від збіральніцтва ў Беларусі — нарыхтоўка лясных пладоў: ягад, грыбоў, лясных яблыкаў і груш, арэхаў.

Адным з галоўных занняткаў першабытных людзей было таксама паляванне, якое засноўвалася на веданні нораваў, звычак і паводзін звяроў. Месцазнаходжанне звера выяўлялі па слядах.

Існавалі разнастайныя прыёмы палявання. Найбольш пашыранай была аблава з загонам, якая захавалася і да нашага часу. У мінулым загоншчыкі гналі жывёл у дрыгву, у глыбокія яры са стромкімі схіламі. Для запалохвання звяроў ужываўся агонь.

Паляванне вялося групамі людзей. Загнаўшы звера ў балота або роў, людзі дабівалі яго там камянямі і дзідамі.



*Старажытны гліняны посуд*

Вельмі зручнай прыладай для палявання стаў лук. Стрэлы былі драўляныя і мелі крамянёвы ці касцяны наканечнік. Старажытныя людзі смела палявалі з лукам на драпежных звяроў, на ляту білі гусей, качак і іншых птушак. У канцы каменнага веку часта ўжывалася каменная сякера, якую выкарыстоўвалі для апрацоўкі дрэва і ў якасці зброі.

Распаўсюджваліся асобныя віды *промыслаў*, якія з'яўляліся дадатковымі заняткамі.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Каменныя сякеры, якія прымацаваны да драўляных ручак*



*Лук і калчан са стрэламі, коп'і з крамянёвымі наканечнікамі*



*Лоўля рыбы і ракаў першабытнымі людзьмі*

Сярод іх, напрыклад, рыбалоўства, збор мёду дзікіх пчол, лоўля птушак. Роля рыбалоўства ўзрасла ў пасляледавіковы перыяд, калі клімат зрабіўся больш цёплым і вільготным. Нашы далёкія продкі ведалі розныя спосабы лоўлі рыбы. Для рыбалоўства выкарыстоўвалі сеткі і лодкі (чаўны). У канцы каменнага веку для лоўлі рыбы прымянялі нават вуды з касцянымі кручкамі.

З дапамогай самалоўных прыстасаванняў — сíлá (пятлі) і сетак (перавесяў) — лавілі птушак. Ніткі для сетак рабілі з лыка — маладой кары ліпы ці лазы.

Звыш 4 тыс. гадоў да н. э. у Беларусі пачаўся выраб глінянага посуду, які быў вельмі неабходны ў паўсядзённым жыцці чалавека. Яго выраблялі на кожным паселішчы ўручную, з кавалкаў ці доўгіх жгутоў гліны. Каб сценкі былі гладкімі і трывалымі, іх старанна загладжвалі. Паверхню пасудзін пакрывалі ўзорам (арнаментам). Затым гаршкі абпальвалі на вогнішчы.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**3. Прысвойвальная гаспадарка.** У каменным веку чалавек мог існаваць толькі дзякуючы прыродзе. Людзі, якія тады жылі на беларускіх землях, не ведалі ні земляробства, ні жывёлагадоўлі. Яны атрымлівалі ад прыроды ўсё неабходнае ў гатовым выглядзе, займаючыся паляваннем, рыбалоўствам, збіральніцтвам. Такі від гаспадаркі называецца ***прысвойвальным***, або *спажывецкім*. Ён дапамагаў людзям выжыць і паступова ўзняцца на новую гістарычную ступень свайго развіцця.

### Пытанні і заданні

1. Дайце тлумачэнне дат: *8 тыс. гадоў да н. э., звыш 4 тыс. гадоў да н. э., 4—3 тыс. гадоў да н. э.*
2. Растлумачце паняцці: *пасляледавіковы перыяд, промыслы, прысвойвальная гаспадарка.*
3. Як вы разумееце паняцце «аселы лад жыцця»?
4. Пералічыце заняткі людзей у пасляледавіковы перыяд.
5. Калі на беларускіх землях пачалі выраблядь посуд з гліны?
6. Як старажытныя людзі рабілі гліняныя пасудзіны (гаршкі)?
7. Якую гаспадарку называюць прысвойвальнай (спажывецкай)?

## § 3. СУПОЛЬНАСЦІ ЛЮДЗЕЙ КАМЕННАГА ВЕКУ

### Успомніце

Дзе звычайна размяшчаліся паселішчы старажытных людзей?

**1. Узнікненне родавай абшчыны.** Жыццё першабытнага чалавека было вельмі цяжкім і небяспечным. Ён не мог адзін здабываць сабе ежу, увесь час падтрымліваць агонь у вогнішчы і інш. Чалавек ведаў, што адзін ён будзе бездапаможны і загіне. Таму старажытныя людзі аб’ядноўваліся ў групы.

Калектыў (група) з 20—30 чалавек, якія вялі агульную гаспадарку і сумесна валодалі прыладамі працы, называецца *абшчынай*.

Паколькі людзі, што ўваходзілі ў абшчыну, былі звязаны паміж сабой сваёй роднасцю, агульнасцю паходжання, то групу, у якую яны аб’ядноўваліся, вучоныя называюць ***родавай абшчынай***. Такая супольнасць людзей з’яўлялася адначасова і родам, і абшчынай.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

*Род* — гэта група людзей альбо калектыў кроўных родзічаў. Яны вялі сваё паходжанне па мацярынскай ці бацькоўскай лініі.

**2. Мацярынскі род.** Вучоныя мяркуюць, што з самага пачатку род з'яўляўся мацярынскім. Першапачаткова роднасць у абшчыне лічылася па жаночай лініі. Дзеці ведалі сваю матулю, бабку, прабабку і мала ведалі сваякоў па лініі бацькі. Адсюль вызначэнне ***«мацярынскі род»***.

Адметнай рысай роду з'яўлялася раўнапраўнасць усіх кроўных родзічаў. Найбольш важныя пытанні іх жыцця вырашаў *агульны сход сваякоў,* дарослых членаў роду. Род выбіраў ***старэйшыну*** — самага вопытнага чалавека, які меў уплыў на родзічаў. Ён клапаціўся аб інтарэсах роду. Старэйшына карыстаўся агульным даверам, і родавая абшчына выконвала яго загады.

У ранняродавай абшчыне было сумеснае валоданне прыладамі працы. Людзі мелі агульную маёмасць. У калектыўнай уласнасці знаходзілася і зямля. Гэта была прамысловая тэрыторыя для палявання, збіральніцтва, рыбалоўства. Існавала агульная ўласнасць на паляўнічыя загоны, рыбалоўныя запруды, на жыллё і агонь.

Калектыўнай была ўласнасць на ежу і на ўсю іншую здабычу, незалежна ад таго, як — разам ці індывідуальна — яе атрымалі. Размер-



*Старажытнае паселішча. Рэканструкцыя*

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Асабістыя прылады працы: нож, лук са стрэламі*

каванне было ўраўняльным. Пры гэтым нават самы ўдачлівы здабытчык атрымліваў не больш за іншых.

Аднак існавала асабістая ўласнасць на зробленыя самім чалавекам прылады працы: сякеры, коп'і, лукі са стрэламі, а таксама адзенне, упрыгожанні і інш.

**3. Аб'яднанне родаў у плямёны.** З павелічэннем колькасці насельніцтва некаторыя члены роду аддзяляліся і адыходзілі жыць на новыя месцы. Так утвараліся новыя роды.

Роды аб'ядноўваліся ў плямёны. Адбывалася гэта на тэрыторыі Беларусі 10—5 тыс. гадоў да н. э. ***Племя*** — трывалае аб'яднанне некалькіх родаў, звязаных агульнасцю паходжання. Яно ўзнікала на аснове кроўных сувязей.

Роды аднаго племені размаўлялі на адной мове, мелі племяннное імя. Найбольш важныя пытанні вырашаў агульны сход племені. Адбываліся нарады родавых старэйшын. Адзін са старэйшын быў кіраўніком племені.

Такім чынам, суровая барацьба за існаванне прымушала людзей жыць сумесна — цесна з'яднанымі родамі, якія аб'ядноўваліся ў плямёны. Такі лад у гісторыі называецца першабытным. Павольна, пераадольваючы вельмі вялікія цяжкасці, ішоў чалавек уперад у сваім развіцці.

## Пытанні і заданні

1. Чаму старажытныя насельнікі Беларусі не маглі жыць паасобку?
2. Якое аб'яднанне людзей называецца абшчынай?
3. Растлумачце паняцці: *род, родавая абшчына, старэйшына, племя.*
4. Па якой прыкмеце вызначаецца мацярынская родавая абшчына (мацярынскі род)?
5. Хто распараджаўся маёмасцю родавай абшчыны?
6. Назавіце асноўныя рысы, уласцівыя племені.
7. У які час роды на тэрыторыі Беларусі сталі аб'ядноўвацца ў плямёны?
8. Растлумачце паняцце «першабытны лад».

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 4. ПЕРШАБЫТНЫЯ ЖЫВЁЛАВОДЫ І ЗЕМЛЯРОБЫ Ў БРОНЗАВЫМ І ЖАЛЕЗНЫМ ВЯКАХ

**Успомніце**

1. Чаму век называўся каменным?
2. Якая гаспадарка называецца прысвойвальнай?

**1. Пранікненне індаеўрапейцаў на тэрыторыю Беларусі.** Прыкладна 3—1,5 тыс. гадоў да н. э. шматлікія плямёны жывёлаводаў-вандроўнікаў рассяліліся на вялікай тэрыторыі, у тым ліку ў Еўропе. Гэта былі ***індаеўрапейцы***. Першапачаткова яны жылі ў Малой Азіі недалёка ад Ірана.

Індаеўрапейскія плямёны таксама пранiклі на тэрыторыю Украіны, Беларусі, Прыбалтыкі і Цэнтральнай Еўропы. Адбылося гэта прыкладна 2,5 тыс. гадоў да н. э. Пазней індаеўрапейцы змяшаліся з мясцовым насельніцтвам. Адна іх група аформілася ў балтаў, другая — у славян, трэцяя — у германцаў. *Балты* — гэта продкі сучасных літоўцаў і латышоў. *Славяне* — продкі сучасных беларусаў, рускіх, украінцаў, палякаў, чэхаў, балгараў, сербаў. *Германцы* — продкі сучасных немцаў, англічан, шведаў і іншых народаў. Так стварылася тая разнастайнасць народаў Еўропы, якую мы назіраем цяпер.

**2. Распаўсюджанне жывёлагадоўлі.** Старажытныя людзі часта і падоўгу галадалі. У першую чаргу з голаду паміралі дзеці і старыя. Таму людзі імкнуліся знайсці сабе больш устойлівыя крыніцы здабывання ежы. Яны пачалі прыручаць жывёл.

Першым быў прыручаны сабака. Потым ён стаў надзейным сябрам і памочнікам паляўнічага. Сабака папярэджваў аб небяспецы і высочваў звяроў.

Часам паляўнічыя прыносілі з сабой маладых звяркоў, якіх даглядалі на стаянках. Жывёлы пачалі размнажацца ў няволі. Народжаныя на стаянках цяляты і ягняты станавіліся зусім свойскімі. Асабліва хутка асвойваліся ў няволі свінні.

З палявання ўзнікла жывёлагадоўля. Першымі да яе пачалі пераходзіць жыхары Паўднёвай Беларусі. Гэта адбылося прыкладна 3 тыс.

Правообладатель Издательский центр БГУ

гадоў да н. э. Цяпер чалавек меў запасы харчавання. Быкоў і коней ён стаў выкарыстоўваць як рабочую (цяглавую) сілу.

**3. Першыя земляробы.** Амаль адначасова з жывёлагадоўляй з'явілася земляробства. Яно ўзнікла са збіральніцтва, і спачатку ім сталі займацца на Палессі. Нашы продкі рыхтавалі пад пасевы невялікія ўчасткі ў поймах рэк. Апрацоўка зямлі ажыццяўлялася з дапамогай матык. Такое земляробства называецца *матычным*.

Зусім іншым было ***падсечна-агнявое земляробства***. Падсека, або ляда, — гэта ўчастак, на якім высякаўся лес. Высахлыя дрэвы затым спальваліся. У попел сеялі зерне і баранавалі поле камлем сукаватага дрэва — *бараной-сукаваткай*. Першыя два-тры гады збіралі добры ўраджай. Праз некалькі гадоў для пасеву патрэбна было рыхтаваць новы ўчастак.



*Барана-сукаватка*

Ураджай збажыны жыналі сярпамі. Яны ўяўлялі сабой крамянёвыя пласцінкі-ўкладышы, якія замацоўваліся ў драўляных ці касцяных аправах.



*Крамянёвыя сярпы бронзавага веку*

Праца земляроба стала больш паспяховай, калі для ўзрыхлення (разворвання) глебы пачалі выкарыстоўваць драўлянае *рала*. Узнікла ***ворнае земляробства***. Рала рабілі з дубовага ствала з суком. Такое рала знойдзена ў тарфяніку паблізу вёскі Капланавічы Клецкага раёна. Рала цягнуў бык ці конь. Вырошчвалі пшаніцу, ячмень, проса, а пазней і жыта.

**4. Пераход да вытворчай гаспадаркі.** Паляўнічыя, збіральнікі, рыбаловы пры прысвойвальнай (спажывецкай) гаспадарцы карысталіся тым, што было ў прыродзе. Але земляробы і жывёлаводы ўжо самі рабілі тое, што неабходна для жыцця: выводзілі новыя пароды жывёл, вырошчвалі новыя гатункі раслін. Такая гаспадарка называецца ***вытворчай***. Жыццё людзей цяпер менш залежала ад прыроды, а ў большай ступені — ад іх уласнай працы.



*Драўлянае рала, знойдзенае пад вёскай Капланавічы Клецкага раёна*

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Краснасельскія крэменездабыўныя шахты. Рэканструкцыя*

Пераход ад палявання і збіральніцтва да жывёлагадоўлі і земляробства забяспечваў тагачаснае насельніцтва прадуктамі харчавання, некаторымі відамі сыравіны для хатніх промыслаў. З'яўленне вытворчай гаспадаркі стала найвялікшай падзеяй у гісторыі чалавецтва, значным крокам уперад у развіцці грамадства.

Крэмень для вырабу прылад працы першабытныя «шахцёры» здабывалі 2 тыс. гадоў да н. э. у прымітыўных шахтах, падобных на калодзежы.

**Гэта цікава.** Шмат шахтаў было адкрыта каля пасёлка Краснасельскі, недалёка ад Ваўкавыска на Гродзеншчыне. Глыбіня шахты складала 3—5 м. Знойдзеныя ў адкладах крэйды кавалкі крэменю змяшчалі ў скураны мяшок, які на вяроўцы выцягвалі наверх. З крэменю выраблялі сякеры і іншыя прылады, якія распаўсюджваліся ў Панямонні і за яго межамі. У адной шахце археолагамі выяўлена язычніцкае пахаванне шахцёра. Каля яго былі знойдзены касцяная іголка для сшывання скураных мяшкоў і гліняная пасудзіна.

## Пытанні і заданні

1. Дайце тлумачэнне дат: *3—1,5 тыс. гадоў да н. э., 3 тыс. гадоў да н. э., 2,5 тыс. гадоў да н. э., 2 тыс. гадоў да н. э.*
2. Растлумачце паняцці: *індаеўрапейцы, матычнае земляробства, падсечна-агнявое земляробства, ворнае земляробства, вытворчая гаспадарка.*
3. Хто такія індаеўрапейцы? Якія групы плямён утварыліся пасля змешвання індаеўрапейцаў з мясцовым насельніцтвам?

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

4. З якіх заняткаў узніклі жывёлагадоўля і земляробства?
5. Якіх жывёл прыручалі нашы продкі?
6. Якія земляробчыя культуры вырошчвалі старажытныя жыхары Беларусі?
7. Чаму з'яўленне вытворчай гаспадаркі стала найвялікшай падзеяй у гісторыі чалавецтва?
8. Дзе здабывалі крэмень першабытныя «шахцёры»?

## § 5. ПАЧАТАК ВЫКАРЫСТАННЯ МЕТАЛАЎ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ

### Успомніце

1. Ці ёсць на тэрыторыі Беларусі радовішчы медзі і волава?
2. Ці ёсць у вашай мясцовасці або побач населены пункт, назва якога ўтварылася ад слова «руда»?

**1. Выкарыстанне металічных прылад працы.** У **пачатку 2-га тысячагоддзя да н. э.** на тэрыторыі Беларусі пачаўся бронзавы век. Гэта адбылося значна пазней, чым у краінах, дзе былі радовішчы медзі і волава, сплаў якіх утварае бронзу. Медзь і волава траплялі да нашых продкаў з поўдня (з Прыкарпацця, Каўказа).

Адсутнасць уласнай сыравіны стрымлівала шырокае выкарыстанне металічных вырабаў на тэрыторыі Беларусі.



*Наканечнік кап'я і дзве сякеры з медзі і бронзы. Багатае пахаванне бронзавага веку з Падняпроўя*

Паступова на землях нашых продкаў узнікла бронзаліцейная справа. Бронза лёгка плавіцца пры тэмпературы, якая дасягаецца ў звычайным вогнішчы.

Выкарыстанне медных і бронзавых прылад павысіла выніковасць працы людзей. Гэтыя прылады паспяхова замянілі крамянёвыя вырабы. З'явіліся медныя і бронзавыя нажы, наканечнікі дзідаў, шылы, сякеры, сярпы.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Аднак у бронзавым веку працягвалі ўжывацца і каменныя прылады. Яны нават дасягнулі сваёй дасканаласці. Пры іх вырабе больш, чым раней, выкарыстоўваліся шліфоўка і свідраванне.

Яшчэ ў ледавіковую эпоху чалавек пракручваў адтуліны ў некаторых прыладах працы і ўпрыгожаннях. Затым было адкрыта свідраванне з дапамогай трубчастай косткі, у якую насыпаўся пясок. Свідраванне стала лягчэйшым пасля таго, як трубчастую костку пачалі прыводзіць у рух лучковай цецівой (прыстасаванне накшталт лука). Цеціва абкручвалася вакол косткі (стрыжня), што надавала ёй вярчальны рух. Гэта прыстасаванне ўжывалася найбольш шырока ў бронзавым веку пры свідраванні адтулін у камені. У гэты час з'явіліся свідраваныя баявыя сякеры, якія добра трымаліся на доўгай драўлянай ручцы.

**2. Здабыча жалеза.** Каля **VII ст. да н. э.** на тэрыторыі Беларусі пачаўся жалезны век. Адкрыццё жалеза азначала пачатак велізарнага тэхнічнага перавароту.

Жалезныя руды вельмі распаўсюджаны ў прыродзе. Узяць хаця б Беларусь. У кожнай вобласці існуюць вёскі, назва якіх паходзіць ад слова «руда», — Рудня, Рудзенка, Рудакова. Руду можна знайсці на беразе ракі або возера, на балоце, на лузе. Яе дагэтуль так і называюць балотнай рудой. У балоце ці возеры злучэнні жалеза асядаюць бурай каламуццю на дно, утвараючы руду. Па бурым колеры травы людзі знаходзілі балотную руду.



*Прыстасаванне для свідравання каменю*



*Свідраваная каменная сякера*

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ



*Жалезныя прылады працы: рыбалоўны кручок, нажніцы, нажы, сярпы, сякера з адтулінай у абушку*

Чаму ж так здарылася, што жалезная руда ёсць усюды, а людзі спачатку пачалі выкарыстоўваць больш рэдкія і менш трывалыя металы — медзь і бронзу? Усё тлумачыцца даволі проста. Жалеза плавіцца пры вельмі высокай тэмпературы, якая ў два разы вышэйшая за тэмпературу плаўлення медзі. Атрымліваць такую тэмпературу тагачасныя майстры не ўмелі.

Але яны знайшлі спосаб атрымання жалеза і пры параўнаўча невысокай тэмпературы. На беларускіх землях сабраную жалезную руду «варылі» (награвалі) у ***печахдомніцах***. Рэшткі старажытнай домніцы захаваліся каля вёскі Лабеншчына Мінскага раёна непадалёку ад Заслаўя. Печ, зробленая з гліны, была невялікай, у дыяметры менш за метр. У ёй кавалкі руды спякаліся, утвараючы порыстую масу — *крыцу*. Калі печ астывала, крыцу даставалі. Потым у кузні яе зноў награвалі і плюшчылі цяжкімі молатамі. Так атрымлівалі даволі якаснае крычнае жалеза.

**3. Значэнне адкрыцця жалеза.** Працаваць жалезнымі прыладамі было значна лягчэй, чым каменнымі і бронзавымі. Імі можна было больш якасна і хутка апрацоўваць дрэва, косць, скуру.




*Печ-домніца*

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

З дапамогай жалезных сякер нашы продкі сталі ачышчаць ад лесу значныя дзялянкі для падсечна-агнявога земляробства, узводзіць больш трывалыя, чым раней, жылыя і гаспадарчыя пабудовы.

Жалеза было асноўным матэрыялам для вырабу зброі — наканечнікаў стрэл і дзідаў, баявых сякер, нажоў ды шмат чаго іншага.

Адпала неабходнасць пастаянна падтрымліваць агонь у ачагу ці доўга здабываць яго з дапамогай трэння. Ударамі металічнага крэсіва аб крэмень можна было высякаць іскры і лёгка распальваць вогнішча.

### Пытанні і заданні

1. Дайце тлумачэнне дат: *пачатак 2-га тысячагоддзя да н. э., каля VII ст. да н. э.*
2. Што стрымлівала ўкараненне медных і бронзавых вырабаў на Беларусі ў старажытныя часы?
3. Як апрацоўвалі камень у бронзавым веку?
4. Чаму людзі пачалі спачатку выкарыстоўваць для вырабу прылад працы медзь і бронзу, а не жалеза, якое сустракаецца паўсюдна?
5. Апішыце спосаб атрымання жалеза нашымі продкамі.
6. Калі на тэрыторыі Беларусі пачаўся жалезны век?
7. Растлумачце, якую ролю адыгралі металы ў жыцці першабытных людзей.

## § 6. УЗНІКНЕННЕ НЯРОЎНАСЦІ Ў ГРАМАДСТВЕ

### Успомніце

1. Якія былі заняткі і промыслы людзей у пасляледавіковы перыяд?
2. Якія змены ў жыцці людзей адбываліся ў бронзавым веку?

**1. Узрастанне ролі мужчынскай працы ў бронзавым веку.** На працягу многіх тысячагоддзяў каменнага веку мужчыны і жанчыны займалі амаль роўнае становішча ў здабыванні ежы. Пераход да жывёлагадоўлі і земляробства выклікаў важныя змены ў жыцці людзей.

У бронзавым веку мужчынскай справай сталі жывёлагадоўля і падсечна-агнявое земляробства, прыручэнне і гадоўля жывёл, паляванне і рыбалоўства. Працай мужчын ствараліся пастаянныя харчовыя запасы. Мужчынам таксама неабходна было ахоўваць абшчыну ад набегаў іншых плямён.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Праца жанчыны заўсёды была неабходнай і вельмі карыснай для свайго роду. Яе абавязкам было абаграванне жылля і гатаванне ежы. Не менш часу жанчына траціла на выраб адзення і абутку. Яна таксама займалася збіральніцтвам дароў прыроды, зборам ураджаю і шмат чым іншым. Значную ўвагу аддавала жанчына догляду дзяцей.

**2. Бацькоўскі род.** Мужчынская праца вырашала лёс усіх суродзічаў. А клопаты жанчын былі абмежаваны толькі хатняй гаспадаркай. Цяпер мужчына, уступаючы ў шлюб, не пераходзіў у род жонкі, як было раней. Ён забіраў жонку да сябе. Мужчына быў зацікаўлены ў тым, каб перадаць маёмасць сваім дзецям, асабліва сынам. Роднасць пачала лічыцца па мужчынскай лініі. ***Вялікія патрыярхальныя сем'і***, у якіх мужчына адыгрываў вядучую ролю, называюць ***бацькоўскім родам***.

**3. З'яўленне маёмаснай няроўнасці ў грамадстве.** Людзі вынаходзілі металічныя прылады працы, апрацоўвалі зямлю, гадавалі жывёлу. Кожны жадаў лепш забяспечыць свае патрэбы. І ніхто не ведаў, да якіх новых важных змен у жыцці грамадства гэта прывядзе.

Земляробчая і жывёлагадоўчая праца нядрэнна забяспечвала людзей сродкамі існавання. У іх з'явілася больш вольнага часу. Як і раней, людзі працягвалі жыць родавымі абшчынамі. Аднак цяпер познародавыя абшчыны маглі ствараць намнога больш сродкаў існавання, таму што яны сталі больш шматлюднымі. Праца земляроба і жывёлавода патрабавала добра прадуманай яе арганізацыі, каб не былі прапушчаны тэрміны пасадкі, праполкі, збору ўраджаю і інш.

Працоўная дзейнасць познародавай абшчыны ўскладнялася. Абшчыннай гаспадарцы сталі патрэбны сховішчы для сабранага ўраджаю, хлявы для жывёлы, земляробчыя прылады і многае іншае. Таму ў абшчынах з'явіліся людзі, галоўнымі абавязкамі якіх сталі арганізацыя і размеркаванне ўсіх работ, кіраўніцтва жыццём абшчыны. Узнікла неабходнасць у стварэнні ваеннай арганізацыі.

У абшчынах вылучыліся правадыры і старэйшыны. Яны былі звязаны з астатнімі абшчыннікамі блізкай роднасцю і ў той жа час ужо набывалі грамадскую ўладу над імі. Пазней гэтыя кіраўнікі прысвоілі сабе права распараджацца маёмасцю абшчыннікаў паводле сваіх поглядаў і патрэб.

Правообладатель Издательский центр БГУ


Бронзавая падвеска-лунніца з чырвонай эмаллю. III—IV стст.

Старажытнае, заснаванае на поўнай роднасці, адзінства родавай абшчыны пачало расхіствацца. У абшчыне земляробаў і жывёлаводаў узніклі першыя прыкметы ***расслаенне грамадства***. З'явіліся багатыя і бедныя сем'і. Зразумела, што ў першую чаргу багацелі сем'і правадыроў і старэйшын.

Багатыя абшчыннікі імкнуліся самі распараджацца сваёй маёмасцю. Так стала фарміравацца прыватная ўласнасць, раней амаль невядомая родаплемяннаму грамадству. Палажэнне і месца чалавека ў грамадстве ўсё больш вызначаліся не тым, да якога роду і абшчыны ён належаў, а тым, знатны ён ці не знатны. Мінулай роўнасці і калектывізму ў абшчыне надышоў канец.

Паміж багатымі і беднымі сем'ямі пачалі складвацца адносіны панавання і прыгнечання. Усё часцей і часцей адбываліся сутычкі паміж асобнымі абшчынамі, родамі і плямёнамі. У час сутычак людзі імкнуліся захапіць як мага больш здабычы. Так узніклі войны. Захопленыя палонныя выкарыстоўваліся для працы ў сем'ях старэйшын і ваенных кіраўнікоў. Так узнікла *патрыярхальнае (хатняе) рабства*.

Аб з'яўленні *маёмаснай няроўнасці* сведчаць пахавальныя помнікі таго часу. Пры раскопках у бедных пахаваннях знаходзяць адзін гаршчок ці адну прыладу працы. У іншых пахаваннях рэчаў зусім няма. Некаторыя ж магілы налічваюць дзесяткі знаходак. Сярод іх вельмі каштоўныя на той час медныя, бронзавыя і бурштынавыя вырабы.

**4. Будаўніцтва гарадзішчаў у жалезным веку.** У раннім жалезным веку, каб абараніць сябе і сваю маёмасць, людзі пачалі будаваць умацаваныя паселішчы, так званыя ***гарадзішчы***. Тут жылі сем'і былой родавай абшчыны.

Гарадзішчы будаваліся на ўзвышшах і ўмацоўваліся землянымі валамі, равамі, драўлянымі сценамі. Гэта рабілася з прычыны магчымага нападу суседзяў, якія маглі захапіць статкі жывёлы і іншую маёмасць роду.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Гарадзішча жалезнага веку. Рэканструкцыя*

У Беларусі ў кожнай вобласці захаваліся гарадзішчы. Найбольшая колькасць старажытных гарадзішчаў ранняга жалезнага веку (прыкладна на мяжы нашай эры) выяўлена ў Віцебскай, Гомельскай, Мінскай абласцях. Усяго на тэрыторыі Беларусі вядома каля адной тысячы гарадзішчаў. Іх даследаванне ўзбагачае навуку новымі рэчавымі крыніцамі.

## Пытанні і заданні

1. Растлумачце паняцці: *бацькоўскі род, вялікая патрыярхальная сям'я, расслаенне грамадства, маёмасная няроўнасць, патрыярхальнае (хатняе) рабства, гарадзішча.*
2. Чаму ў каменным веку жанчыне належала кіруючая роля ў родавай абшчыне?
3. Назавіце прычыны ўзрастання ролі мужчынскай працы ў бронзавым і жалезным вяках.
4. Чаму ў бронзавым веку роднасць пачала лічыцца па мужчынскай лініі?
5. На якія дзве часткі падзялілася грамадства са з'яўленнем няроўнасці ў ім?
6. Якім чынам археолагі вызначаюць з'яўленне маёмаснай няроўнасці ў грамадстве?
7. Чым была выклікана неабходнасць будаўніцтва гарадзішчаў у жалезным веку?
8. Як узнікла патрыярхальнае (хатняе) рабства?

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 7. КУЛЬТУРА НАШЫХ ПРОДКАЎ

**Успомніце**

1. Што малявалі першабытныя людзі на сценах пячор?
2. У што верылі жыхары Старажытнага Егіпта?

**1. Вераванні першабытных людзей.** Назіраючы змену дня і ночы, пораў года, маланку і гром, жыццё раслін і жывёл, старажытны чалавек не мог зразумець і правільна растлумачыць тое, што бачыў. Хваробы і смерць замацоўвалі ў свядомасці нашых далёкіх продкаў трывогу і жах.

Паступова ў людзей пачалі зараджацца ўяўленні аб звышнатуральных сілах, быццам бы здольных выклікаць такія з’явы. Гэта і было пачаткам рэлігійных уяўленняў.

Чалавек стаў шанаваць тое, ад чаго залежала яго жыццё, — сонца, зямлю, ваду, агонь. Усю прыроду чалавек у сваім уяўленні адушаўляў — насяляў духамі зямлі, сонца, грому, маланкі, расліннасці. Наш далёкі



*Віды арнаменту на старажытным гліняным посудзе*

Правообладатель Издательский центр БГУ

продак верыў, што дрэвы маюць душу, валодаюць пачуццямі і могуць дапамагчы ў цяжкую хвіліну.

Сон, непрытомнасць, смерць першабытныя людзі тлумачылі выхадам духу (душы) з цела. Так узнікла вера ў замагільнае жыццё.

**2. Міфалогія.** ***Міф*** — гэта старажытнае народнае паданне аб легендарных героях, багах, аб паходжанні розных з'яў прыроды. У нашых далёкіх продкаў склалася свая міфалогія.

На беларускіх землях са старажытных часоў былі шырока распаўсюджаны міфы пра дрэвы (дуб, бярозу), пра папараць-кветку (хто яе знойдзе — будзе шчаслівы), пра паходжанне асобных рэк, азёр, балот.

Беларусы, як і іншыя народы, у міфах імкнуліся растлумачыць навакольны свет. Існавалі шматлікія паданні пра русалак, лесавікоў, дамавікоў. Была створана цікавая легенда пра тое, як Бялун са жменькі зямлі, што вельмі хутка расла, стварыў увесь Сусвет.

**Гэта цікава.** Аднойчы Бялун убачыў шар, які плыў міма яго. Адтуль чулася жаласнае мяўканне. Бялун вызваліў з шара вязня. Ім аказаўся чорт. Бялун расказаў яму пра сваё імкненне стварыць Сусвет і загадаў спусціцца на дно мора, каб узяць там жменю зямлі. Той падпарадкаваўся. Але пакуль чорт спускаўся, яму ў галаву прыйшла думка, што ён сам мог бы стварыць Сусвет. Таму чорт узяў у прыгаршчы зямлі з дна мора, а яшчэ крыху схаваў у роце, каб выканаць свой план. Вярнуўшыся, ён аддаў зямлю Белуну. Той скамандаваў: «Зямля, расці!» Жменька зямлі пачала расці і расці і ператварылася ў сушу. Але ў гэты час зямля, схаваная чортам у роце, таксама стала расці. Шчокі яго раздзьмуліся, і зямля пачала выпіраць з рота. Спалоханы чорт кінуўся наўцёкі, пакідаючы за сабой дарожку зямлі, якая сфарміравала горы і пагоркі.

А вось на Палессі расказваюць, што, калі чорт дасягнуў іх мясцовасці, запасы зямлі ў роце закончыліся, і таму іх зямля засталася нізінай і тут утварыліся балоты.

Беларуская міфалогія з'яўляецца каштоўнай крыніцай для вывучэння духоўнай культуры, вераванняў і звычаяў нашых продкаў.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Упрыгожанні з могільнікаў і гарадзішчаў*

**3. Пахавальныя абрады.** Звычай пахавання звязаны з узнікненнем вераванняў старажытных людзей аб тым, што душа памерлага працягвае сваё існаванне і пасля смерці чалавека.

Найбольш распаўсюджанымі былі два абрады пахавання. Паводле першага абраду цела памерлага закопвалася ў зямлю, паводле другога — спальвалася на агні. Агонь лічылі свяшчэннай сілай. Яму і аддавалі нябожчыка.

Старажытныя людзі верылі, быццам бы памерламу «на тым свеце» неабходна ўсё тое, чым ён карыстаўся пры жыцці. Таму нябожчыку клалі яго рэчы, якія нібыта спатрэбяцца яму ў «замагільным жыцці». Гэта былі прылады працы і хатняга ўжытку, упрыгожанні, зброя.

На тэрыторыі Беларусі існаваў звычай насыпаць над магіламі курганы. ***Курган*** — гэта насып з пяску ці з іншага грунту. Сярэдняя вышыня кургана складала 1—2 м. Найбольшая колькасць старажытных курганоў выяўлена ў Віцебскай і Гомельскай абласцях.



*Статуэткі людзей са стаянкі Асавец*

**4. Першабытнае мастацтва.** З рэлігійнымі вераваннямі і абрадамі звязана першабытнае мастацтва. Паляўнічыя-збіральнікі

Правообладатель Издательский центр БГУ

ў каменным веку ўжо ўмелі выразаць з дрэва, каменю, косці фігуркі людзей і жывёл.

Прыкладам старажытнага мастацтва з'яўляецца ***скульптура*** — стварэнне аб'ёмнага вобраза. Пра гэта сведчаць дзве статуэткі людзей, знойдзеныя на стаянцы каля вёскі Асавец Бешанковіцкага раёна на Віцебшчыне.

Адна статуэтка драўляная. У ёй даволі дакладна адлюстраваны вобраз мужчыны канца каменнага веку. Другая выява выразана з рогу. Яна дае ўяўленне аб мужчыне з выцягнутым тварам, высокім ілбом і вострай барадой.

Старажытныя людзі выраблялі ўпрыгожанні з зубоў ваўка або мядзведзя. Упрыгожанні насілі на шыі, нашывалі на вопратку. Адначасова яны адыгрывалі ролю амулетаў. Іх нашэнне, па тагачасных уяўленнях, засцерагала чалавека ад небяспекі, надавала яму моц у барацьбе за існаванне.

У канцы каменнага веку на тэрыторыі Беларусі дасягнула росквіту арнаментаванне глінянага посуду. З'явіліся такія часткі арнаменту, як круг, ромб, крыжападобныя фігуры. Гэтыя знакі былі сімваламі Сонца і іншых нябесных свяціл, плоднасці, вечнасці прыроды, яе кругазвароту.

**Пытанні і заданні**

1. Растлумачце паняцці: *міф, скульптура, курган.*
2. Як уяўляў старажытны чалавек навакольны свет?
3. Хто такі Бялун у старажытнай беларускай міфалогіі?
4. Назавіце два асноўныя абрады пахавання на беларускіх землях.
5. Якім чынам звязаны паміж сабой рэлігійныя вераванні і першабытнае мастацтва?
6. Які сэнс мелі арнаменты ў выглядзе круга і ромба?
7. На якой стаянцы ў Беларусі знойдзены статуэткі людзей?
8. Якое значэнне надавалі амулетам у старажытнасці?

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# НАШ КРАЙ

**Заданне 1.** Знайдзіце сваю мясцовасць на адной з карт старажытнай Беларусі (каменны век, бронзавы век, жалезны век) і ўстанавіце, што там выявілі або адкрылі археолагі. Такая карта змешчана ў кнізе «Памяць» вашага раёна. Тут падаюцца звесткі пра археалагічныя помнікі, якія захаваліся да нашых дзён.

**Заданне 2.** Вазьміце ў школьнай або іншай бібліятэцы энцыклапедыю «Археалогія і нумізматыка Беларусі» (Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 1993) і знайдзіце там археалагічныя помнікі вашай вобласці. З дапамогай настаўніка вызначце, якія помнікі адносяцца да вашай мясцовасці.

**Заданне 3.** Пабывайце ў музеях вашай мясцовасці і даведайцеся, калі ў вашым рэгіёне з'явіліся першабытныя людзі, якія сляды свайго жыцця яны пакінулі.

**Заданне 4.** Высветліце, якія старажытныя міфы і паданні звязаны з вашым населеным пунктам, раёнам, вобласцю. Якія яны даюць уяўленні аб мінулым вашага краю?

# УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ

**Заданне 1.** Пакажыце на картасхеме:

а) межы сучаснай Беларусі;
б) рэкі: Заходнюю Дзвіну, Нёман, Дняпро, Прыпяць;
в) мяжу апошняга ледавіка;
г) асноўныя напрамкі засялення тэрыторыі Беларусі ў каменным веку;
д) месцы першых стаянак чалавека каменнага веку (Юравічы, Бердыж);
е) месцазнаходжанне шахт па здабычы крэменю.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Заданне 2.** Дапоўніце табліцу (у сшытку па гісторыі).

| **Старажытны час** | | **Сярэднія вякі** | |
|---|---|---|---|
| **Назва** | **Дата** | **Назва** | **Дата** |
| Каменны век | 100—35 тыс. гадоў таму — канец 3-га тысячагоддзя да н. э. | Першы перыяд — Ранняе сярэдневякоўе | ? |
| Бронзавы век | ? | ? | X—XIII стст. |
| ? | ? | ? | ? |

**Заданне 3.** Суаднясіце даты са з'явамі, якія ім адпавядаюць:

А) 24 тыс. гадоў да н. э.; а) пераход да жывёлагадоўлі і земляробства;
Б) 21 тыс. гадоў да н. э.; б) пранікненне індаеўрапейцаў на тэрыторыю Беларусі;
В) 3 тыс. гадоў да н. э.; в) здабыча крэменю шахтавым спосабам;
Г) 2,5 тыс. гадоў да н. э.; г) стаянка каменнага веку каля вёскі Бердыж;
Д) 2 тыс. гадоў да н. э.; д) стаянка каменнага веку каля вёскі Юравічы.

**Заданне 4.** Дайце азначэнні наступных паняццяў (пры неабходнасці карыстайцеся «Слоўнікам гістарычных паняццяў і тэрмінаў»):

- старажытны час
- сярэднія вякі
- стаянка
- прысвойвальная гаспадарка
- вытворчая гаспадарка
- матычнае земляробства
- падсечна-агнявое земляробства
- ворнае земляробства
- аселы лад жыцця
- промыслы
- родавая абшчына
- старэйшына
- племя
- мацярынскі род
- бацькоўскі род
- вялікая патрыярхальная сям'я
- гарадзішча
- расслаенне грамадства
- скульптура
- міф

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Заданне 5.** Размясціце вывучаныя паняцці ў адпаведныя графы табліцы згодна з прапанаваным узорам.

| Гаспадарчая дзейнасць | Грамадскія адносіны | Здабыткі культуры | Усё іншае |
|---|---|---|---|
| Паляванне | Родавая абшчына | Скульптура | Старажытны час |
| | | | |

**Заданне 6.** Прадоўжыце будаўніцтва лагічных ланцужкоў паводле прапанаванага ўзору:

паляванне → жывёлагадоўля
збіральніцтва → ?
? → племя
прысвойвальная гаспадарка → ?
мацярынскі род → ?

**Заданне 7.** Размясціце наступныя даты ў храналагічнай паслядоўнасці: 3 тыс. гадоў да н. э., 2,5 тыс. гадоў да н. э., 24 тыс. гадоў да н. э., 2 тыс. гадоў да н. э., 21 тыс. гадоў да н. э., VII ст. да н. э., X ст. н. э.

**Заданне 8.** Размясціце прыродныя і гістарычныя з'явы паводле часу іх узнікнення:

- апошняе зледзяненне на тэрыторыі Беларусі;
- узнікненне вытворчай гаспадаркі;
- пранікненне людзей на тэрыторыю Беларусі;
- будаўніцтва гарадзішчаў;
- з'яўленне маёмаснай няроўнасці;
- пранікненне індаеўрапейцаў на тэрыторыю Беларусі;
- з'яўленне бронзавых прылад працы.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Заданне 9.** Па адным з пунктаў тэмы «Культура нашых продкаў» (на выбар) складзіце просты план.

**Заданне 10.** Параўнайце наступныя з'явы:

- прысвойвальную і вытворчую гаспадарку;
- стаянку і гарадзішча;
- падсечна-агнявое і ворнае земляробства.

**Заданне 11.** Вызначце галоўныя прычыны:

а) параўнальна позняга засялення тэрыторыі Беларусі старажытнымі людзьмі;
б) узнікнення спачатку прысвойвальнай, а затым вытворчай гаспадаркі, а не наадварот;
в) пераходу да аселага ладу жыцця;
г) узнікнення маёмаснай няроўнасці;
д) будаўніцтва гарадзішчаў;
е) замены каменных прылад працы жалезнымі.

**Заданне 12.** Складзіце апавяданне на адну з наступных тэм (на выбар): «Паляванне на мамантa»; «Выраб глінянага посуду»; «Будаўніцтва гарадзішча».

**Заданне 13.** Дакажыце, што:

- прылады працы старажытных людзей увесь час удасканальваліся;
- гісторыя Беларусі з'яўляецца састаўной часткай сусветнай гісторыі;
- вынаходствамі першабытных людзей карыстаюцца людзі нашага часу.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

## РАЗДЗЕЛ II

# ЖЫЦЦЁ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ У РАННІМ СЯРЭДНЕВЯКОЎІ (V—IX стст.)

## § 8. БАЛТЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**Успомніце**

1. Хто такія індаеўрапейцы?
2. Калі адбыўся пераход да вытворчай гаспадаркі?
3. Калі існавала Рымская імперыя?

**1. Тэрыторыя рассялення.** У старажытнасці тэрыторыя Беларусі была заселена плямёнамі ***балтаў***. Вы ўжо ведаеце, што балты, як і славяне, паходзілі ад індаеўрапейцаў.

Сваю гісторыю балты вядуць з канца каменнага веку. У тыя далёкія часы на велізарных прасторах Еўропы і Азіі рассяліліся індаеўрапейцы. Некаторыя індаеўрапейскія плямёны пасяліліся ва Усходняй Еўропе і на ўзбярэжжы Балтыйскага мора. Яны размаўлялі на падобных мовах, мелі аднолькавы лад жыцця. З-за блізкасці да Балтыйскага мора гісторыкі сталі зваць іх балтамі.

У бронзавым веку (2-е тысячагоддзе да н. э.) балты займалі найболей шырокую тэрыторыю. Іх паселішчы даходзілі на захадзе ледзь не да ракі Одэр, на ўсходзе — да вярхоўяў ракі Волгі і яе прытока Камы. На поўначы балты рассяліліся да Фінскага заліва і Ладажскага возера, на поўдні — да Сярэдняга Падняпроўя.

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ



*Медная скроневая падвеска*

Продкі балтаў прыйшлі на землі, якія яшчэ раней асвоілі плямёны паляўнічых і рыбаловаў. Яны мірна суседнічалі з балтамі і ў выніку зліліся з імі.

У II—V стст. балты перажывалі свой «залаты век». У гэты час дасягнулі росквіту іх рамяство і гандаль. Хаця тэрыторыя, якую займалі балты, паменшылася, але яны па-ранейшаму засялялі значную частку балтыйскага ўзбярэжжа і амаль усю тэрыторыю сучаснай Беларусі.

**2. Плямёны балтаў.** Як вы ўжо ведаеце, балты жылі на вельмі вялікай тэрыторыі. Яны




*Балты ў Раннім сярэдневякоўі*

Правообладатель Издательский центр БГУ

сутыкаліся з рознымі народамі, змешваліся з імі. Ад суседзяў балцкія плямёны запазычылі многія словы, абрады, звычаі, спосабы гаспадарчай дзейнасці. Да таго ж доўгі час асобныя плямёны балтаў жылі ізалявана адно ад другога. Гэта стала прычынай іх падзелу.

У 1-м тысячагоддзі да н. э. балты падзяліліся на заходніх, усходніх і дняпроўскіх. Заходнія балты займалі тэрыторыю ад Панямоння да Ніжняй Віслы. У Раннім сярэдневякоўі сярод іх найбольш моцнымі былі прусы, яцвягі і куршы.

Усходнія балты, або, як іх яшчэ называюць, лета-літоўскія плямёны, жылі ў Прыбалтыцы па берагах рэк Нёман, Заходняя Дзвіна, Вілія. Да іх адносілася і племя літва.

Аб дняпроўскіх балтах мала што вядома. Усе яны растварыліся сярод славян, якія прыйшлі пазней.

На тэрыторыі Беларусі пражывалі літва, яцвягі і іншыя балцкія плямёны. Старажытныя балты сталі продкамі сучасных літоўцаў і латышоў.

**3. Паселішчы балтаў на тэрыторыі Беларусі.** Балты на тэрыторыі Беларусі жылі ў адкрытых неўмацаваных селішчах і ўмацаваных гарадзішчах. Гарадзішчы размяшчаліся на ўзвышаных мысах ці асобных узгорках, на крутых берагах рэк і азёр. Іх памеры былі зусім невялікія.

Спачатку гарадзішчы не мелі штучных абарончых збудаванняў у выглядзе валоў і равоў. Толькі некаторыя паселішчы абносіліся драўлянай агароджай. Пазней сталі ўзводзіцца валы і равы. Яны абкружалі пляцоўку паселішчаў, часам у некалькі радоў. На вяршыне вала будавалася драўляная сцяна з тоўстых бярвенняў.

У балтаў на тэрыторыі Беларусі да прыходу славян яшчэ не з'явіліся гарады. Яны жылі ў наземных і паўзямлянкавых жытлах. Паўзямлянкі былі пераважна зрубнай канструкцыі (бярвёны ўкладваліся ўздоўж па зямлі).

А вось свае наземныя жытлы балты будавалі з драўляных слупоў. Сцены жылля, складзеныя з бярвенняў, часта абмазваліся глінай.

У цэнтры жытлаў размяшчаліся адкрытыя агнішчы. Акрамя агнішчаў існавалі печы-каменкі круглай або авальнай формы. Яны выкладваліся з вялікіх камянёў, змацаваных глінай. З цягам часу ў балтаў з'явіліся і глінабітныя печы без дымахода. Іх збівалі з гліянай масы, у якую дабаўлялі камяні.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Бронзавае скроневае кольца*



*Бронзавая з каляровай эмаллю фібула*



*Сярэбраная шыйная грыўня*

**4. Гаспадарка, гандаль.** Балты былі земляробамі і жывёлаводамі. Рымскія гісторыкі адзначалі, што балты сеялі збожжа і вырошчвалі іншыя культуры, працуючы больш руплівa, чым германцы. Доўгі час у гаспадарцы балтаў важную ролю адыгрывалі таксама паляванне і рыбалоўства.

Здаўна балты сеялі пшаніцу, проса і ячмень, вырошчвалі лён і каноплі. У пачатку нашай эры з'явіліся жыта і авёс. У гэты час для ўзворвання зямлі ўжо прымянялі драўляную саху з жалезным наканечнікам (сашнікам). Выкарыстоўвалі балты і жалезныя матыкі. Ураджай збіралі пры дапамозе сярпоў і кос. Гэтыя прылады працы ўжываліся і ў сярэдневякоўі.

Жывёлагадоўля ў балтаў пераважала над паляваннем. Аб гэтым сведчаць археалагічныя знаходкі. Костак свойскіх жывёл на іх селішчах археолагі выяўляюць удвая або ўтрая больш, чым костак дзікіх жывёл. Балты гадавалі свіней, авечак, коней і кароў.

На землях балтаў не было радовішчаў медзі. Мясцовыя жыхары куплялі або выменьвалі яе ў суседзяў. Што яны маглі прапанаваць узамен?

Балтам надзвычай пашанцавала. На балтыйскім узбярэжжы знаходзіцца найбуйнейшае радовішча бурштыну, які справядліва называлі «паўночным золатам». За яго еўрапейскія і ўсходнія гандляры гатовыя былі прапанаваць добрую цану.

Яшчэ ў бронзавым веку ўзнік «бурштынавы шлях». Ён звязваў Прыбалтыку з Міжземнамор'ем. Магчыма, нейкія адгалінаванні гэтага шляху праходзілі праз тэрыторыю Беларусі.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

Але не толькі бурштын выкарыстоўваўся ў гандлі балтаў. З Прыбалтыкі везлі на поўдзень коней, жывёлу, скуру, мёд, воск. Акрамя таго, балты выступалі пасрэднікамі ў гандлі футрам паміж фіна-угорскімі народамі і германцамі.

У перыяд існавання Рымскай імперыі ў першыя стагоддзі нашай эры на бурштын і іншыя тавары балты выменьвалі тысячы манет. Мноства скарбаў рымскіх манет было знойдзена ў Прыбалтыцы. Адзінкавыя рымскія манеты і скарбы выяўлены і на тэрыторыі Беларусі.

Да балтаў паступалі і іншыя тавары: гліняны посуд, шкляныя пацеркі, бронзавыя вырабы. Самі балты дасягнулі высокага ўзроўню майстэрства ў вырабе некаторых жаночых упрыгожанняў.

**5. Мастацтва і рамёствы.** Апрацоўка жалеза, бронзаліцейная справа, выраб глінянага посуду, апрацоўка дрэва, каменю, косці, прадзенне і ткацтва былі найбольш важнымі заняткамі балтаў. У асноўным гэта былі вельмі простыя хатнія заняткі. Такім чынам кожнае паселішча цалкам забяспечвала сябе ўсім неабходным для жыцця. Такая гаспадарка называецца натуральнай.

У перыяд Ранняга сярэдневякоўя балты з вялікім густам і майстэрствам стваралі бронзавыя і сярэбраныя ўпрыгожанні. Мясцовыя майстры творча перапрацоўвалі ўзоры ювелірных вырабаў, якія траплялі да іх. У выніку ў мастацтве склаўся асобы «балтыйскі стыль».

**Гэта цікава.** У адзенні, упрыгожаннях, нават зброі выявілася імкненне балтаў да прыгажосці. Упрыгожанні і іншыя вырабы багата арнаментаваліся. Асаблівае распаўсюджанне мелі геаметрычныя ўзоры. Надзвычай разнастайнымі былі ўпрыгожанні жанчын: галаўныя вянкі, шыйныя грыўні, пацеркі, бранзалеты, фібулы (зашпількі для плашча), шпількі, пярсцёнкі. І ў нашы дні здзіўляе майстэрства, з якім выкананы вырабы з эмаллю. У балцкім эмалевым арнаменце выкарыстоўваліся чырвоныя, зялёныя, сінія, блакітныя колеры. Балцкія рэчы з эмаллю знойдзены і на тэрыторыі Беларусі.

Тысячы гадоў жылі балты на тэрыторыі Беларусі. У другой палове 1-га тысячагоддзя н. э. на змену балтам прыйшлі славяне. Але культура

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

 і дасягненні балтаў не зніклі бясследна. Славяне запазычылі ў іх каштоўны вопыт жыцця ў лясным краі, узоры ўпрыгожанняў, захавалі балцкія назвы рэк і азёр.

## Пытанні і заданні

1. Хто такія балты?
2. Якую тэрыторыю займалі балты ў бронзавым і жалезным вяках?
3. Чаму і калі балты падзяліліся на асобныя групы?
4. Назавіце групы і плямёны, на якія падзяліліся балты.
5. У якіх паселішчах жылі балты?
6. Якога ўзроўню дасягнула рамяство і мастацтва балтаў?
7. Запоўніце табліцу.

| Гандаль балтаў | |
|---|---|
| **Тавары, якія ўвозіліся** | **Тавары, якія вывозіліся** |
| | |

## ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ

**З твора рымскага гісторыка Тацыта «Германія» аб старажытных балтах (I ст. н. э.).** Эсціі (старажытная назва балтаў) ушаноўваюць прамаці багоў і як адметны знак свайго культу носяць на сабе выяву вепрукоў; яны ім замяняюць зброю і засцерагаюць шануючых багіню нават у гушчы ворагаў... Хлеб і іншыя плады зямныя вырошчвалі яны старанней, чым прынята ў германцаў з уласцівай ім нядбайнасцю. Больш таго, яны абшнырваюць мора і на беразе, і на водмелях адзіныя з усіх збіраюць бурштын, які самі яны называюць глёзам... У іх саміх ён ніяк не выкарыстоўваецца; збіраюць яны яго ў натуральным выглядзе, дастаўляюць нашым купцам такім жа неапрацаваным і, на сваё здзіўленне, атрымліваюць за яго цану.

*Якія высновы можна зрабіць аб узроўні развіцця балтаў у пачатку нашай эры?*

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 9. ПАХОДЖАННЕ І РАССЯЛЕННЕ СЛАВЯН

**Успомніце**

1. Якія плямёны засялялі тэрыторыю Беларусі ў пачатку сярэдневякоўя?
2. Што такое Вялікае перасяленне народаў?
3. Дзе ўзніклі першыя славянскія дзяржавы?

**1. Прарадзіма славян.** *Прарадзіма* — гэта тая тэрыторыя, якую першапачаткова насяляў той або іншы народ. Была прарадзіма таксама і ў ***славян***. Тут яны ўсвядомілі, што адрозніваюцца ад сваіх суседзяў. Таму сталі зваць сябе сваім уласным імем — славяне.

Назва народа «славяне» паходзіць ад «слова». Славянамі называлі сябе людзі, якія «валодалі словам», гэта значыць, разумелі адзін аднаго.

У гісторыкаў няма адзінага меркавання аб месцазнаходжанні прарадзімы славян. Адной з асноўных з'яўляецца думка, згодна з якой славяне ў апошнія стагоддзі да нашай эры і ў пачатку нашай эры займалі тэрыторыю паміж Заходнім Бугам і сярэднім цячэннем Дняпра. Паўночнай мяжой іх рассялення была рака Прыпяць. Такім чынам, прарадзімай славян мог быць і поўдзень Беларусі.

Паводле іншага меркавання, прарадзіма славян знаходзілася на Сярэднім Дунаі, на поўдзень ад прыгожых гор Цэнтральнай Еўропы — Карпат.

**Гэта цікава.** Гэтае меркаванне знаходзіць пацвярджэнне ў найстаражытнейшым летапісе — «Аповесці мінулых гадоў». На старонках летапісу чытаем: «...Калі прайшло шмат часу, селі славяне па Дунаі, дзе цяпер зямля Венгерская і Балгарская. Ад тых славян разышліся славяне па зямлі і назваліся імёнамі сваімі па тых месцах, на якіх селі. Так тыя, што прыйшлі і селі на рацэ па імені Марава, і назваліся маравамі, а іншыя назваліся чэхамі...».

Аднак большасць гісторыкаў шукае прарадзіму славян на поўнач ад Карпат. Зараз гэтая тэрыторыя належыць Польшчы і Украіне. Адгэтуль славяне трапілі і ў міжрэчча Одэра і Віслы. Тут, у Цэнтральнай Еўропе, выяўлялі славянскую прарадзіму польскія гісторыкі.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Славяне былі індаеўрапейцамі. Продкі славян калісьці складалі адно цэлае з продкамі германцаў і балтаў. Магчыма, некалькі стагоддзяў існавала балцка-славянскае адзінства.

Доўгі час славяне жылі на сваёй прарадзіме ўдалечыні ад больш развітых міжземнаморскіх народаў. Цяжка сказаць, калі яны вылучыліся ў асобны народ. Магчыма, гэта адбылося ў сярэдзіне 1-га тысячагоддзя да н. э. У гэты час з продкамі славян сутыкнуліся загадкавыя кельты. Але толькі ў VI ст. славяне сталі вядомы пад сваім уласным імем.

Славяне шырока рассяліліся з тэрыторыі сваёй прарадзімы, дзе з'явіліся тыя іх асаблівасці, якія былі пранесены праз стагоддзі. Са старажытнасці для нашых продкаў характэрны велікадушнасць, гасціннасць, калектывізм.

**2. Першыя звесткі аб славянах.** Славяне зусім нечакана заявілі аб сабе ў пачатку нашай эры як аб моцным і ваяўнічым народзе. Ад іх набегаў асабліва пакутавала Візантыйская імперыя.

Менавіта візантыйцы першымі звярнулі ўвагу на новы народ. Візантыйскія гісторыкі адзначалі, што славяне вылучаліся высокім ростам і сілай, былі язычнікамі, шанавалі сілы прыроды і розных багоў. Ваявалі яны ў асноўным пешымі. Лад іх жыцця быў просты і непатрабавальны. Усе гэтыя сведчанні адносяцца да VI ст. У гэты час славяне ўжо падзяліліся на асобныя групы. Адна — *склавіны* — пражывала на захад ад Днястра, каля Дуная. Іншая — *анты* — размясцілася на землях ад Днястра да Дняпра. Зараз гэта тэрыторыя Украіны. Але візантый-




*Мяркуемая прарадзіма славян*

Правообладатель Издательский центр БГУ

цы асабліва падкрэслівалі, што ўсе групы славян размаўлялі на адной мове і нічым не адрозніваліся. Першапачаткова яны мелі адно агульнае імя — *венеды*.

**Гэта цікава.** Анты былі продкамі не толькі ўсходніх славян. Асобныя плямёны антаў увайшлі ў склад паўднёвых славян. З анцкага саюзу плямён выйшлі плямёны сербаў і харватаў. У той жа час сярод нашчадкаў антаў быў і ўсходнеславянскі саюз плямён дрыгавічоў (аб ім вы даведаецеся з наступнага параграфа). Дрыгавічы пасяліліся на поўдні сучаснай тэрыторыі Беларусі. Такім чынам, паўднёвыя і ўсходнія славяне маюць вельмі блізкае паходжанне.

Магчыма, у больш ранні час славяне былі вядомы пад іншымі імёнамі. Існуе меркаванне, што славянамі былі неўры. Яны жылі дзесьці на поўдні сучаснай Беларусі. Расказвалі, што гэтыя неўры раз у год на некалькі дзён ператвараліся ў ваўкоў. Легенды аб ваўкалаках і пазней былі распаўсюджаны на беларускай зямлі.

Такім чынам, першыя пісьмовыя звесткі пра славян адносяцца да VI ст. Менавіта з тых часоў славяне адыгрываюць істотную ролю ў сусветнай гісторыі.

**3. Шляхі рассялення славян.** У першыя стагоддзі нашай эры на прарадзіме славян склаліся вельмі добрыя ўмовы для земляробства. Развіваліся рамяство і гандаль. Усё гэта прывяло да павелічэння колькасці насельніцтва. Але з канца IV ст. пачалося пахаладанне, V ст. было самым халодным за апошнія 2000 гадоў. Славяне вымушаны былі пакінуць свае паселішчы. Іх землі аказаліся непрыдатнымі для земляробства.

У гэты ж час у Еўропе адбывалася Вялікае перасяленне народаў. Орды гунаў і германцаў прайшлі праз усю Еўропу. Пацярпелі ад іх і славяне. Мноства паселішчаў было спустошана. Але славяне змаглі заняць спусцелыя землі.

Так славяне пачалі шырока рассяляцца ў Еўропе. Натуральнымі дарогамі для іх з'яўляліся рэкі. Як правіла, свае селішчы яны засноўвалі на высокіх берагах рэк.

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

Славяне з тэрыторыі сваёй прарадзімы рухаліся на захад. У гэтым напрамку яны адціснулі германцаў да ракі Эльбы, а потым і за яе. З канца V ст. славянскія плямёны пачалі асваенне Балканскага паўвострава. Перасяляліся славяне і на ўсход. У VI ст. яны ўжо з'явіліся ў Сярэднім Падняпроўі. Неўзабаве славянскія плямёны засялілі і сучасныя беларускія землі.

**4. З'яўленне славян на тэрыторыі Беларусі.** Засяленне славянамі беларускіх зямель не было простым і хуткім. Славяне змаглі асвоіць тэрыторыю Беларусі толькі ў канцы Ранняга сярэдневякоўя.

Адзін са шляхоў засялення тэрыторыі Беларусі ішоў з поўдня. З тэрыторыі Сярэдняга Падняпроўя славяне рухаліся ўздоўж Дняпра, Прыпяці і іх прытокаў. Тут даволі рана з'явіліся славянскія паселішчы.

**Гэта цікава.** На поўдні Беларусі лепш за ўсё даследаваны славянскія паселішчы ў горадзе Петрыкаве на рацэ Прыпяць і каля вёскі Хотамель Столінскага раёна на рацэ Гарынь. На ўскраіне горада Петрыкава беларускія археолагі выявілі славянскае селішча VI—VII стст. *(Чым гарадзішча адрозніваецца ад селішча?)* Яго жыхары выплаўлялі жалеза з балотнай руды і ляпілі посуд з гліны. Каля вёскі Хотамель знойдзены гарадзішча, селішча і могільнік, у якім хавалі памерлых. Добра ўмацаванае валамі і ровам гарадзішча ахоўвала людзей у выпадку небяспекі.

У паўночную і цэнтральную частку Беларусі славяне прыйшлі з поўначы Усходняй Еўропы. Так лічаць сучасныя навукоўцы. На поўнач славяне сышлі з тэрыторыі вакол ракі Віслы. Цяпер гэта тэрыторыя нашай заходняй суседкі — Польшчы.

Селішчы славян-земляробаў па рацэ Вісле найбольш пацярпелі ад неспрыяльных кліматычных умоў IV—V стст. Ворныя землі былі затоплены. У пошуках прыдатных для земляробства зямель славяне адышлі на ўсход. Частка іх асела каля возера Ільмень. Пазней тут будзе пабудаваны Ноўгарад Вялікі. Іншыя славянскія плямёны знайшлі сабе месца пасялення на беларускіх землях.

На новых месцах славяне выбіралі для селішчаў сухія месцы на ўзвышшах. Асвоіцца на новых землях славянам дапамагалі мясцовыя

Правообладатель Издательский центр БГУ




*Засяленне славянамі тэрыторыі Беларусі*

жыхары. Пры гэтым славянскія плямёны змешваліся з балтамі, што стала асноўнай прычынай своеасаблівасці славян на тэрыторыі Беларусі.

### Пытанні і заданні

1. Растлумачце, што такое *прарадзіма*.
2. Ад чаго паходзіць назва народа «славяне»?
3. Якія меркаванні існуюць наконт месцазнаходжання прарадзімы славян?
4. Калі аб славянах упершыню стала вядома суседзям?
5. На якія групы падзяляліся раннія славяне? Дзе гэтыя групы размяшчаліся?
6. Чаму славяне вымушаны былі пакінуць сваю прарадзіму?
7. На якія землі рушылі славяне ў V—VI стст.?
8. Якімі шляхамі засялялі славяне тэрыторыю Беларусі?

## ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ

**З «Гісторыі» Герадота (V ст. да н. э.).** На поўнач ад алізонаў жывуць скіфы-земляробы. Яны сеюць збожжа не для ўласнага пра-

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

жытку, а на продаж. Нарэшце, яшчэ вышэй іх жывуць неўры, а на поўнач ад неўраў, наколькі я ведаю, ідзе ўжо бязлюдная пустыня... У неўраў звычаі скіфскія. ...ім прыйшлося пакінуць усю сваю краіну з-за змей. Бо не толькі іх уласная зямля спарадзіла мноства змей, але яшчэ больш патрапіла іх з пустыні ўсярэдзіне краіны. Таму неўры былі вымушаны пакінуць сваю зямлю і пасяліцца сярод будзінаў. Гэтыя людзі, відаць, ведзьмакі. Скіфы і эліны (грэкі), якія жывуць сярод іх, прынамсі, сцвярджаюць, што кожны неўр штогод на некалькі дзён ператвараецца ў ваўка, а затым зноў прымае чалавечае аблічча. Мяне гэтыя байкі, вядома, не могуць пераканаць; тым не менш так кажуць і нават клятвенна сцвярджаюць гэта.

*Ці маглі адбывацца гэтыя падзеі ў сапраўднасці?*

## § 10. УСХОДНЕСЛАВЯНСКІЯ ПЛЯМЁНЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

**Успомніце**

1. Якое насельніцтва жыло на тэрыторыі Беларусі да з'яўлення тут славян?
2. На якія саюзы плямён падзяляліся ўсходнія славяне ў VIII—IX стст.?
3. Калі ўзнікла Старажытнаруская дзяржава?

**1. Славяна-балцкае ўзаемадзеянне.** Славяне паступова засялялі тэрыторыю Беларусі. Яны расчышчалі землі для вырошчвання хлеба, адно за другім будавалі свае паселішчы. Так адбывалася *каланізацыя* славянамі беларускіх зямель. Але гэтая тэрыторыя яшчэ раней была асвоена плямёнамі балтаў.

Адносіны славян з балтамі на тэрыторыі Беларусі першапачаткова былі мірныя. Балцкія плямёны былі невялікімі, ды і славян прыходзіла зусім няшмат. Таму месца хапала ўсім. Славяне змешваліся з мясцовым насельніцтвам.

У канцы VII — пачатку VIII ст. на тэрыторыю Беларусі пранікла новая хваля славянскіх перасяленцаў. Ваенныя сутыкненні славян з балтамі ў гэты час сталі больш частымі. У агні пажараў гінулі гарадзішчы балтаў.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Так упрыгожвалі сябе крывічанкі (злева), дрыгавічанкі (у цэнтры) і радзімічанкі*

Засяленне беларускіх зямель славянамі працягвалася не адно стагоддзе. Ранейшыя жыхары вымушаны былі сысці з абжытых месцаў. Тыя, хто застаўся, паступова зліваліся са славянамі. Гэтаму спрыяла тое, што славяне, як і балты, былі язычнікамі. Блізкімі былі іх лад жыцця і мова.

Аднак славяне знаходзіліся на больш высокім узроўні грамадскага развіцця. У іх былі племянныя правадыры, моцнае войска. Славяне пераўзыходзілі балтаў у земляробстве і рамястве. Таму балты запазычвалі лепшае, што бачылі ў сваіх суседзяў. Адбылася ***славянізацыя балтаў***.

Суседства з балтамі шмат чаго дало і славянам. Здаралася, славяне займалі балцкія гарадзішчы. Акрамя таго, яны сталі ствараць упрыгожанні на ўзор балцкіх, якія ім вельмі падабаліся. Узаемадзеянне з балтамі надало своеасаблівасць мясцовым славянскім аб'яднанням плямён. Яны склаліся ў **VIII—IX стст.** і захоўвалі асаблівыя рысы нават пасля стварэння агульнай Старажытнарускай дзяржавы. Гэтыя асаблівасці зводзіліся да некаторых (спачатку вельмі нязначных) адрозненняў у мове, міфалогіі, побыце славянскага насельніцтва беларускіх зямель.

**2. Крывічы-палачане.** *Крывічы* былі самым буйным усходнеславянскім саюзам плямён. Яны жылі ў вярхоўях Дняпра і Заходняй Дзвіны. На ўсходзе іх селішчы дасягалі Волгі, а на поўначы — Чудскога возера. Тут суседзямі крывічоў былі ільменскія славене, будучыя наўгародцы.



*Залатое скроневае кольца крывічанак*

Ужо тое, што крывічы займалі велізарную тэрыторыю, абумовіла іх падзел на асобныя групы: пскоўскую, полацкую і смаленскую.

Усю паўночную частку сучаснай Беларусі засялялі полацкія крывічы, або *палачане*. Галоўным іх горадам быў *Полацк*. Сваю назву ён

Правообладатель Издательский центр БГУ




*Усходнеславянскія аб'яднанні плямён на тэрыторыі Беларусі*

атрымаў ад ракі Палаты, каля вусця якой і быў заснаваны. Ад назвы горада або ракі сталі звацца і крывічы-палачане.

Назва ж крывічоў, магчыма, паходзіць ад імя старэйшыны роду Крыва або ад слова «крэўныя», гэта значыць, сваякі па крыві. Ёсць і іншыя здагадкі.

Насельніцтва Полацкага княства нават у XII ст. у летапісах называлася крывічамі. Крывічы былі даўнімі суседзямі продкаў латышоў. Таму дагэтуль латышы завуць рускіх імем, падобным да слова «крывічы», — «крэўз».

**Гэта цікава.** Адной з найбольш важных асаблівасцей крывічоў было пахаванне імі памерлых у доўгіх курганах. У народзе іх звалі «валатоўкамі». Існавала паданне, што ў іх быццам бы былі пахаваны волаты — асілкі высокага росту. На самай справе пад курганамі-насыпамі магло быць пахавана адзін за другім да 20 чалавек. Відаць, у адным доўгім кургане хавалі блізкіх сваякоў. У тыя язычніцкія часы ўсходнія славяне спальвалі сваіх памерлых.

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

Своеасаблівымі былі ўпрыгожанні жанчын-крывічанак. Да галаўнога ўбору каля скроняў яны прымацоўвалі адмысловыя, падобныя на бранзалеты кольцы. Бранзалетападобныя скроневыя кольцы знаходзяць толькі на тэрыторыі рассялення полацкіх і смаленскіх крывічоў.

**3. Дрыгавічы.** Увесь поўдзень Беларусі з часам заняў іншы ўсходнеславянскі саюз плямён — *дрыгавічы*. Спачатку яны пасяліліся ў сярэднім цячэнні Прыпяці, у балоцістай мясцовасці. Адсюль і іх назва (ад слова «дрыгва» — балота). Існуе і іншая здагадка аб паходжанні назвы дрыгавічоў — ад імя Драг альбо Дрыгавіт.

Пазней дрыгавічы рушылі на захад і поўнач. Яны занялі басейн ракі Свіслач і сярэдняе цячэнне ракі Бярэзіны. Але першапачаткова гэта была тэрыторыя крывічоў. Менавіта тут была заснавана сталіца Беларусі — Мінск.

Частка дрыгавічоў рассялілася на Брэстчыне. Сюды з поўдня рухаліся і валыняне. Усходнеславянскі саюз плямён валынян быў вельмі блізкі да дрыгавічоў.

Найстарэйшым горадам дрыгавічоў быў *Тураў*. Тураўская зямля мела цесныя сувязі з Сярэднім Падняпроўем і падпарадкоўвалася Кіеву. Паляне, якія там жылі, разам з дрыгавічамі і валынянамі калісьці складалі адно племяннoе ўтварэнне. Аднак пазней яно падзялілася.

У дрыгавічоў высокага ўзроўню дасягнулі земляробства і рамяство. Жанчыны дрыгавічоў любілі ўпрыгожваць сябе дротавымі скроневымі кольцамі-завушніцамі розных памераў. На іх мацаваліся па тры невялікія металічныя пацеркі, якія ўпрыгожваліся зерню — напаянымі на паверхню пацерак дробнымі сярэбранымі шарыкамі.



*Металічныя пацеркі дрыгавічанак, упрыгожаныя зерню*

**4. Радзімічы.** Усходнія землі Беларусі ў Раннім сярэдневякоўі засялялі *радзімічы*. У асноўным

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Перамога Воўчага Хваста, ваяводы кіеўскага князя, над радзімічамі. Малюнак з летапісу*

яны жылі вакол ракі Сож, якая цячэ з поўначы на поўдзень і ўпадае ў Дняпро.

На ўсходзе суседзямі радзімічаў былі вяцічы, а на поўдні — севяране. Усе гэтыя ўсходнеславянскія саюзы плямён мелі агульнае паходжанне.

У «Аповесці мінулых гадоў» захавалася цікавае апавяданне аб паходжанні радзімічаў і вяцічаў. Нібыта калісьці з Польшчы ва Усходнюю Еўропу прыйшлі браты Радзім і Вятка. Яны засталіся на новых землях і сталі родапачынальнікамі двух плямён.

Радзімічы былі падпарадкаваны князем Алегам у 885 г. Незадоўга да гэтага ён авалодаў Кіевам. Так быў пакладзены пачатак фарміраванню Старажытнарускай дзяржавы.

Алег прымусіў радзімічаў плаціць яму даніну, якую дагэтуль яны плацілі хазарам. Але і праз сто гадоў пасля гэтага радзімічы захоўвалі пэўную самастойнасць.

**Гэта цікава.** Паводле летапісу, у 984 г. кіеўскі князь Уладзімір Святаславіч адправіў паходам на радзімічаў свайго ваяводу па мянушцы Воўчы Хвост. Той перамог радзімічаў на рацэ Пяшчань. З тых часоў з'явілася прымаўка: «Пяшчанцы воўчага хваста бегаюць».

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

Жанчыны радзімічаў насілі вельмі прыгожыя сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы. Іх замацоўвалі на галаўным уборы або ўплятаалі ў валасы ад адной да васьмі штук.

Усе ўсходнеславянскія плямёны ўвайшлі ў склад Старажытнарускай дзяржавы — Кіеўскай Русі. Да гэтага часу яны прайшлі значны шлях у сваім развіцці. У некаторых з іх ужо з'явіліся свае княжанні.



*Шыйная грыўня і сяміпрамянёвыя скроневыя кольцы радзімічанак*

**Пытанні і заданні**

1. Растлумачце паняцці: *славянізацыя балтаў, крывічы, дрыгавічы, радзімічы.*
2. Як праходзіла каланізацыя славянамі тэрыторыі Беларусі?
3. Чаму на тэрыторыі Беларусі адбылася славянізацыя балтаў, а не наадварот?
4. Хто такія крывічы? На якой тэрыторыі яны жылі і на якія групы падзяляліся?
5. Чым адрозніваліся палачане ад іншых усходнеславянскіх саюзаў плямён?
6. Якую тэрыторыю засялілі дрыгавічы?
7. У чым асаблівасці развіцця саюзу плямён дрыгавічоў?
8. Што вядома з летапісаў аб радзімічах?
9. Запоўніце табліцу.

| Прыкметы для параўнання | Крывічы-палачане | Дрыгавічы | Радзімічы |
|---|---|---|---|
| Паходжанне назвы | | | |
| Тэрыторыя рассялення | | | |
| Суседзі | | | |
| Асаблівасці | | | |

ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ

**З «Аповесці мінулых гадоў».** Паляне ж, што жылі асобна... былі з славянскага роду, і толькі пасля назваліся палянамі, і драўляне паходзілі ад тых жа славян і таксама не адразу назваліся драўляне;

Правообладатель Издательский центр БГУ

радзімічы ж і вяцічы — ад роду ляхаў. Бо былі два браты ў ляхаў — адзін Радзім, а другі — Вятка; і прыйшлі і селі: Радзім на Сажы, і ад яго назваліся радзімічы, а Вятка сеў з родам сваім па Ацэ, ад яго атрымалі сваю назву вяцічы. І жылі паміж сабою ў міры паляне, драўляне, севяране, радзімічы, вяцічы і харваты.

*Што ў тэксце ўказвае на агульнае паходжанне ўсходнеславянскіх саюзаў плямён?*

## § 11. НА ШЛЯХУ ДА ДЗЯРЖАВЫ

**Успомніце**

1. Што такое дзяржава?
2. Якія прычыны прыводзілі да ўзнікнення дзяржавы?
3. Калі на тэрыторыі Беларусі рассяліліся славяне?

**1. Князі, дружына.** У славян на тэрыторыі Беларусі ўжо з'явіліся *знатныя людзі (знаць)*. Да знаці спачатку належалі людзі, якія вылучаліся сваімі якасцямі, карыснымі для ўсяго грамадства. Яны былі найбольш паважанымі людзьмі сярод супляменнікаў і мелі на іх вялікі ўплыў. Знатнымі маглі стаць мудрыя старцы і багатыя людзі.

У далейшым становішча знатных людзей у грамадстве перадавалася іх дзецям і ўнукам.

**Гэта цікава.** Разбагацець можна было, старанна працуючы на зямлі. Яшчэ большае багацце прыносіў занятак гандлем. Значна прасцей, але больш рызыкоўна было ўдзельнічаць у рабаўніцкім набегу. Багаты чалавек мог ладзіць піры для супляменнікаў, утрымоўваць рабоў і нават мець уласныя воінскія атрады. Да таго ж лічылася, што калі чалавек багаты, значыць, да яго ставяцца з прыхільнасцю багі.

Славянам, якія перасяляліся на новыя землі, даводзілася часта ваяваць. Войны былі больш паспяховымі, калі на чале войска аказваўся таленавіты кіраўнік. Такога племяннога правадыра славяне звалі ***князем***.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

Яго выбіралі з ліку знатных людзей. Сваё высокае становішча ў грамадстве князь стаў перадаваць у спадчыну.

Калі вайна была ўдалай, славяне захоплівалі ваенную здабычу. Права размяркоўваць яе належала князю. Сабе ён мог пакінуць больш. Але і іншых удзельнікаў паходу князь шчодра адорваў нарабаваным.

Князь арганізоўваў абарону сваіх супляменнікаў ад нападаў ворагаў. З цягам часу да яго сталі звяртацца з просьбай здзейсніць справядлівы суд. За выкананне гэтых важных для ўсяго грамадства абавязкаў земляробы падносілі князю дары. За разгляд судовых спраў таксама трэба было плаціць. Такія добраахвотныя прынашэнні з часам ператварыліся ў даніну. ***Даніна*** — гэта натуральны падатак (футра, мёд, прадукты харчавання і г. д.), які насельніцтва абавязана было штогод выплачваць на карысць вярхоўнай улады — князя.

Жыццё прымушала князёў увесь час клапаціцца пра вайсковую справу. У кожнага князя была свая ***дружына*** — атрад узброеных і спецыяльна абучаных ваеннай справе людзей. Найважнейшым абавязкам дружыннікаў з'яўлялася вайсковая служба (ваенныя паходы, бітвы, ахова тэрыторыі, асобы князя і г. д.). Адбор у дружыннікі ажыццяўляў сам князь. Дружыннікі выпраўляліся ў паход на конях.

Дружына дазваляла князю яшчэ больш умацоўваць сваю ўладу сярод насельніцтва. Гісторыкі лічаць, што з'яўленне дружыны стала важным крокам на шляху да дзяржаўнасці.

**2. Ваеннае апалчэнне.** У час славянскага перасялення часта адбываліся ваенныя сутыкненні. Здаралася, што варагавалі паміж сабой



*Паднашэнне даніны князю. Малюнак з летапісу*



*Дружына ў паходзе. Малюнак з летапісу*

Правообладатель Издательский центр БГУ

і асобныя славянскія плямёны. Таму ўсе мужчыны ў выпадку неабходнасці павінны былі браць у рукі зброю, каб абараніць свае сем'і, сваіх супляменнікаў.

Мужчыны аднаго племені складалі ў выпадку неабходнасці ***ваеннае апалчэнне***. І земляроб, і рамеснік на час вайны ператвараліся ў ваяроў. Ваеннае апалчэнне славяне маглі стварыць і для захопу новай тэрыторыі, і для рабаўніцкага набегу. Але ваеннае апалчэнне не было такім жа моцным на полі бою, як княжацкая дружына.

Адно племя магло выставіць няшмат ваяроў. Ад моцных ворагаў не магла абараніць і княжацкая дружына. Таму ўзнікала неабходнасць у аб'яднанні плямён у саюзы. Але і яны аказваліся слабымі. Так, з летапісу вядома, што на крывічоў нападалі варагі-вікінгі. Патрабавалася больш моцная арганізацыя, каб супрацьстаяць ворагам. У выніку знешняя ваенная небяспека стала адной з прычын стварэння дзяржавы.

**3. Народны сход — веча.** Спачатку князь у славян быў толькі вайсковым кіраўніком. Яму падпарадкоўваліся ў час вайны. Усе важныя справы ў славянскім племені вырашаліся на народным сходзе — ***вечы***.

У вечы маглі ўдзельнічаць усе свабодныя мужчыны, здольныя насіць зброю. Але асаблівай пашанай на гэтых племянных сходах карысталіся



*Гарадзішча. Малюнак Язэпа Драздовіча*

Правообладатель Издательский центр БГУ

старэйшыны. Першапачаткова старэйшынамі былі пажылыя людзі, старыя. У іх быў вялікі жыццёвы вопыт. Але з цягам часу старэйшынамі ўсё часцей станавіліся знатныя людзі.

Славянскія плямёны жылі на вялікай тэрыторыі. Веча збіраць было цяжка. Людзі не маглі адрывацца ад сваёй працы дзеля кожнай малаважнай справы. Таму ўсе бягучыя справы перайшлі да савета старэйшын.

Веча магло разглядаць любыя пытанні. Аднак у рэальнасці супляменнікі збіраліся для вырашэння найбольш важных спраў. Да іх адносіліся пытанні вайны і міру. На вечы з ліку знатных людзей выбіраўся князь. Да веча чалавек мог звярнуцца ў пошуках абароны і справядлівага суда. Але права вяршыць суд паступова перайшло да савета старэйшын, а затым і да князя. Веча разглядала толькі самыя складаныя і заблытаныя справы.

Традыцыі вечавых сходаў доўга захоўваліся ў Полацкай зямлі. Але пасля ўзнікнення дзяржавы ўсе важныя пытанні стаў вырашаць князь. Веча збіралася толькі ў надзвычайных абставінах. Пастаяннае кіраванне племенем паступова перайшло да князя. Да таго ж у князя была рэальная сіла — дружына, з дапамогай якой ён мог прымусіць народ падпарадкоўвацца яму.

**4. З'яўленне гарадоў.** Гарады на беларускіх землях у VIII—IX стст. толькі зараджаліся. Ужо ў балтаў існавалі ўмацаваныя гарадзішчы. Небяспека нападу ворагаў прымушала і славян ствараць свае гарадзішчы. Але яны яшчэ не былі гарадамі, хаця з цягам часу маглі ў іх ператварыцца.



*Будаўніцтва горада. Малюнак з летапісу*

У гарадзішчах насельніцтва магло хавацца ў выпадку небяспекі. Тут захоўваліся агульныя запасы прадуктаў. Спецыяльнае месца ў гарадзішчах адводзілася пад грамадскія мерапрыемствы, напрыклад, збор веча.

Пад абарону сцен і валоў маглі збірацца рамеснікі і гандляры.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Рагвалод*

Тут жа сяліўся і князь са сваёй дружынай. Так паступова гарадзішча магло перарасці ў горад.

Селішчы крывічоў-палачан у IX ст. існавалі на месцы будучых гарадоў Полацка, Віцебска і Лукомля (Чашніцкі раён). Племянным цэнтрам радзімічаў было гарадзішча на месцы будучага Гомеля. Горадам на тэрыторыі рассялення дрыгавічоў у X ст. стаў Тураў. Магчыма, ён быў цэнтрам племяннога княжання.

**5. Племянныя княжанні.** Славянскія саюзы плямён, у якіх існавала княжацкая ўлада, у летапісе называюцца *княжаннямі*. Сучасныя гісторыкі такія аб'яднанні вызначаюць як ***племянныя княжанні***. У іх яшчэ захоўваўся народны сход — веча. Аднак найбольш важныя рашэнні прымаліся ўжо князем і племянной знаццю. Князь меў права перадаваць сваю ўладу ў спадчыну.

Паводле летапісу, племяннoе княжанне было ў крывічоў-палачан і дрыгавічоў. Нягледзячы на тое, што палачане падпарадкоўваліся Кіеву, яны захоўвалі значную самастойнасць. У палачан у другой палове X ст. быў свой князь. Яго звалі Рагвалод. Летапіс сцвярджае, што Рагвалод прыйшоў «з-за мора». Магчыма, ён, як і Рурык, быў скандынавам-варагам.

Вялікае значэнне для племянных княжанняў мелі войны. Дзякуючы войнам князі ўмацоўвалі сваю ўладу ў племені. Падпарадкоўвалі яны і іншыя плямёны. Так узнікалі буйныя аб'яднанні плямён. Нашы продкі былі ўжо зусім блізкія да стварэння дзяржавы.

### Пытанні і заданні

1. Растлумачце паняцці: *князь, даніна, дружына, ваеннае апалчэнне, веча, племянныя княжанні*.
2. Як сярод славян вылучыліся знатныя людзі?
3. Чым займаўся князь у славянскім грамадстве?
4. Хто мог стаць старэйшынам у славянскім племені?
5. Якія пытанні вырашаліся на вечы?
6. Для чаго славянам служылі ўмацаваныя гарадзішчы?
7. У чым асаблівасці славянскіх племянных княжанняў?

Правообладатель Издательский центр БГУ

Издательский центр БГУ

**З твора Пракопія Кесарыйскага «Гісторыя войн Юсцініяна» (VI ст.).** А плямёны гэтыя, славяне і анты, не кіруюцца адным чалавекам, але здаўна жывуць у народаўладдзі, і таму ў іх шчасце і няшчасце ў жыцці лічацца справай агульнай. А таксама і ва ўсім астатнім, можна сказаць, у абодвух гэтых вышэйназваных варварскіх плямён усё жыццё і ўзаконенні аднолькавыя.

*Аб існаванні якога органа ўлады ў славян у VI ст. сведчыць гэты дакумент?*

## § 12. ГАСПАДАРКА, РАМЯСТВО І ГАНДАЛЬ УСХОДНІХ СЛАВЯН

**Успомніце**

1. Што такое натуральная гаспадарка?
2. Хто ўваходзіў у родавую абшчыну?

**1. Развіццё земляробства і жывёлагадоўлі.** У гаспадарцы ўсходніх славян панавала земляробства. Менавіта яно давала нашым продкам асноўныя прадукты. Нездарма славянская назва жыта паходзіць ад слова «жыць».

Але важную ролю адыгрывалі таксама жывёлагадоўля і розныя промыслы: паляванне, рыбалоўства, сезоннае збіральніцтва. Такая разнастайная гаспадарка дазваляла славянам лёгка прыстасоўвацца да мясцовых умоў — стэпавых і лясных раёнаў або ўзгорыстай і нават гарыстай мясцовасці.

Асноўнай формай земляробства ў славян у VI—IX стст. усё яшчэ была падсека (ляда). Нагадаем, што пры падсечна-агнявым земляробстве трэба было час ад часу расчышчаць ад дрэў новы ўчастак. Гэта вымушала асвойваць усё большыя тэрыторыі.

Але паступова падсечна-агнявое земляробства пачынала змяняцца ворным. З'явіліся новыя прылады працы. У Беларусі з яе ляснымі глебамі, з каранямі і хмызняком вельмі зручнай аказалася драўляная *саха*. Яна

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ



*Саха з адным і двума сашнікамі*

мела адзін ці два вострыя жалезныя наканечнікі (сашнікі), якія праводзілі ў глебе баразёнкі і падразалі карэнні пустазелля. Больш дасканалай прыладай было рала з жалезнымі нарогамі. З яго дапамогай можна было не проста ўзрыхляць, але і перагортваць пласт глебы.

Выкарыстанне ворных прылад рабіла земляробчую працу больш паспяховай. Для апрацоўкі зямлі прымянялі цяглавую сілу: быкоў і коней.

Славяне на тэрыторыі Беларусі гадавалі кароў, коз, авечак, свіней, коней. Коней запрагалі ў калёсы, з дапамогай іх аралі, а таксама шырока выкарыстоўвалі для верхавой язды, асабліва ваяры.

**2. Развіццё грамадства.** Падсечна-агнявое земляробства патрабавала высілкаў вялікай колькасці людзей. Карчаванне пнёў і ў нашы дні — даволі складаная справа. Таму славяне жылі вялікімі патрыярхальнымі сем'ямі. Усе людзі, якія ўваходзілі ў патрыярхальную сям'ю, былі сваякамі. Звычайна яна складалася з 20—30 чалавек (бацькі і іх дзеці і ўнукі).

Удасканаленне земляробства і прылад працы выклікала значныя сацыяльныя зрухі. Вялікія патрыярхальныя сем'і пачалі распадацца. Пачаўся працэс вылучэння *малых сем'яў* (бацькі і дзеці). Тым не менш асноўнай гаспадарчай адзінкай пакуль што заставалася вялікая сям'я. Верагодна, малая сям'я, якая ўжо мела асобнае жытло, некаторы час уваходзіла ў вялікую патрыярхальную сям'ю, што вяла калектыўную гаспадарку. У той жа час родавая абшчына змянілася ***суседскай***. У такую абшчыну акрамя родзічаў уваходзіла значная колькасць суседзяў.




Правообладатель Издательский центр БГУ

Раней, каб пракарміць сябе, усе людзі павінны былі тым ці іншым спосабам здабываць ежу. Дзякуючы развіццю земляробства ў славянскіх абшчынах пачалі заставацца лішкі прадуктаў. Таму некаторыя людзі маглі займацца толькі кіраваннем, вайсковай справай або прысвяціць сябе служэнню багам. У той жа час з'явіліся багатыя людзі, знаць.

**3. Рамёствы і промыслы.** Важную ролю ў жыцці славян, што рассяліліся на тэрыторыі Беларусі, адыгрывалі разнастайныя рамёствы. Рамеснікі рабілі прылады працы і зброю, посуд і ўпрыгожанні. Славянскія жанчыны ўмелі прасці і ткаць. Аб гэтым сведчаць паўсюдныя знаходкі гліняных праслiц.

Самым простым рамяством — *цяслярскім, касцярэзным*, апрацоўкай скуры і іншым — займаліся ў кожнай сям'і. Значна большых намаганняў і ўменняў патрабавалі выплаўка жалеза і вырабы з яго. Кавалі рабілі сашнікі, сякеры, косы, сярпы, нажы. Упрыгожанні выраблялiся з каляровых металаў — золата, серабра, медзі.





*Ювелірныя вырабы: шкляныя пацеркі, залаты пярсцёнак*

**Гэта цікава.** Вялікага майстэрства дасягнулі майстры-ювеліры. Распаўсюджаным упрыгожаннем славянскіх жанчын былі скроневыя кольцы. Акрамя таго, славянкі фарсілі бранзалетамі, пярсцёнкамі, пацеркамі. Частка з іх апынулася ў Беларусі ў выніку гандлю. Так, з далёкіх Дунайскіх зямель на тэрыторыю Беларусі трапілі лунніцы — металічныя ўпрыгожанні ў выглядзе паўмесяца (завушніцы, нагрудныя падвескі). Падобныя рэчы сталі рабіць і на беларускіх землях. Вельмі цікавымі былі ўпрыгожанні дрыгавічанак. Для іх мясцовыя майстры выраблялі прыгожыя металічныя пацеркі з буйной зерню.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Гліняны посуд*

Далейшае развіццё на беларускіх землях атрымаў выраб глінянага посуду. Усходнія славяне выраблялі разнастайныя па форме гаршкі, міскі, кубкі, патэльні, збаны і інш. Пасудзіны абпальваліся ў горне, былі арнаментаваны наколамі, налепамі, насечкамі. Але да з'яўлення ў X ст. ганчарнага круга посуд з гліны ляпілі рукамі.

Славяне заўсёды сяліліся каля вадаёмаў — рэк і азёр. Таму важнай падтрымкай у іх гаспадарцы было рыбалоўства.

У тыя далёкія часы лясы пакрывалі ўсю тэрыторыю Беларусі. У лясах людзі збіралі ягады і грыбы. Славяне, як да іх і балты, палявалі на зуброў, ласёў, аленяў, дзікоў, птушак, пушных звяркоў. З футра рабілі цёплую вопратку, неабходную ў суровыя зімы. Акрамя таго, яго ахвотна куплялі ў іншых краінах — у Візантыі і Арабскім халіфаце.



*Промыслы людзей. Старадаўні малюнак*

Шырока было распаўсюджана ***бортніцтва*** — збор мёду дзікіх пчол. *Борцю* нашы продкі называлі дупло ў дрэве, дзе сяліліся пчолы. Мёд і воск у тыя часы вельмі цаніліся і добра прадаваліся.

**4. Гандаль.** Усходнія славяне, якія жылі ў VI—IX стст. на тэрыторыі Беларусі, яшчэ мала чым маглі зацікавіць замежных гандляроў. Тут не было радовішчаў каштоўных металаў або бурштыну,

Правообладатель Издательский центр БГУ

пакуль што слаба было развіта рамяство. Тым не менш прыродныя багацці нашага краю ўжо знаходзілі попыт у далёкіх краінах.

Беларускія землі ў той час знаходзіліся ўбаку ад найбольш важных гандлёвых шляхоў, і таму мясцовыя жыхары яшчэ не займаліся сапраўдным гандлем. Хутчэй адбываўся абмен прадуктаў працы земляроба на рамесную прадукцыю. Гэтак жа абменьваліся з замежнымі гандлярамі, якія траплялі на тэрыторыю Беларусі. Больш за ўсё яны цанілі шкуркі пушных звяркоў, што маглі замяняць грошы.

Гандаль ажыццяўляўся без пасрэдніцтва грошай. Аднак на тэрыторыі Беларусі знойдзены асобныя арабскія манеты і цэлыя іх скарбы.

**Гэта цікава.** У 1936 г. на тэрыторыі саўгаса «Собалева» ў Дубровенскім раёне Віцебскай вобласці быў выяўлены скарб, у які ўваходзіла больш за 300 манет. Гэта былі сярэбраныя арабскія манеты — дырхемы. Высакаякасныя арабскія дырхемы ў Раннім сярэдневякоўі з'яўляліся своеасаблівай міжнароднай валютай. Манеты, якія змяшчаліся ў скарбе, былі створаны паміж пачаткам VIII і сярэдзінай IX ст. Дзесьці ў другой палове IX ст. скарб быў закапаны ў зямлю. Зараз ён захоўваецца ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі.

Навукоўцы лічаць, што нашы продкі цанілі манеты самі па сабе, а не як сродак плацяжу. Даволі часта іх выкарыстоўвалі ў якасці ўпрыгожанняў. Манеты маглі быць і паказчыкам багацця, высокага становішча чалавека, гэта значыць, яго прэстыжу.

Нашы продкі мелі зносіны не толькі з суседзямі, але і з больш аддаленымі краінамі. Аб гэтым сведчаць знаходкі прасліц з Валыні (захад Украіны), бурштыну з Прыбалтыкі, пасудзін з Прычарнамор'я і, як вы ўжо ведаеце, манет з Арабскага халіфата. Некаторыя з гэтых прадметаў маглі трапіць да славян у выніку іх рабаўніцкіх набегаў. У сваю чаргу вырабы, створаныя рамеснікамі крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў, знойдзены ў іх суседзяў.

Такім чынам, у Раннім сярэдневякоўі ў славян на тэрыторыі Беларусі хутка развівалася гаспадарка. У сувязі з гэтым адбываліся важныя змены ў грамадстве. Усходнія славяне жылі не ізалявана, яны мелі актыўныя зносіны з суседзямі.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

## Пытанні і заданні

1. Якія галіны гаспадаркі мелі ва ўсходніх славян найважнейшае значэнне?
2. Якія формы земляробства былі распаўсюджаны ў славян на тэрыторыі Беларусі?
3. У чым выяўлялася развіццё гаспадаркі ўсходніх славян?
4. Якія наступствы мела развіццё гаспадаркі ў славян?
5. У чым асаблівасці развіцця рамёстваў на тэрыторыі Беларусі ў Раннім сярэдневякоўі?
6. Якія промыслы былі распаўсюджаны ў славян на тэрыторыі Беларусі?
7. Якую ролю адыгрывалі манеты, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі?
8. У чым асаблівасці развіцця гандлю ўсходніх славян?
9. Растлумачце схему на с. 60.

# § 13. РЭЛІГІЯ І МІФАЛОГІЯ ЎСХОДНІХ СЛАВЯН

## Успомніце

1. Якія вераванні былі распаўсюджаны ў першабытным грамадстве?
2. У чым асаблівасці пахавальных абрадаў першабытных людзей?

**1. Культ продкаў.** Нашы продкі з глыбокай старажытнасці верылі, што ў чалавека ёсць душа. Такое ўяўленне вучоныя называюць анімізмам. Існавала перакананне, што душы людзей і пасля іх смерці маглі ўплываць на жыццё жывых.

У родавым грамадстве вельмі важнай была падтрымка сваякоў. Толькі разам людзі маглі весці гаспадарку і супрацьстаяць ворагам. У той жа час пашанай карысталіся старыя людзі, старэйшыны. Яны пражылі доўгае жыццё і таму валодалі каштоўным вопытам. Славяне верылі, што нават пасля смерці старэйшыны роду дапамагаюць сваім нашчадкам. Так зарадзіўся *культ продкаў*.

Душы памерлых ахоўвалі род і ўсяляк спрыялі яго росквіту. Да нашага часу захаваўся вокліч «Чур мяне!». Калісьці ім заклікалі на дапамогу продкаў. Чур — гэта і ёсць продак. Ад гэтага слова паходзіць назва далёкіх продкаў — «прашчуры». Душы продкаў трэба было схіліць да сябе. Таму ім прыносілі ахвяры, у іх гонар наладжвалі піры. Да нашага

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

часу захаваўся звычай памінання памерлых продкаў.

Славяне таксама верылі, што душа старэйшага ў сям'і можа ператварыцца ў хатняга духа, або дамавіка. Дамавік мог быць і знешне падобны на былога гаспадара хаты. Хатні дух забяспечваў дабрабыт усёй сям'і. Яму таксама трэба было прыносіць ахвяры.



*Амулет у выглядзе коніка. Нашы продкі верылі, што такія падвескі засцерагаюць ад варожых духаў, адводзяць хваробы і прыносяць поспех у гаспадарцы і на паляванні*

**2. Духі.** Славяне ў пачатку сваёй гісторыі былі язычнікамі. Яны верылі, што ўвесь навакольны свет — і лясы, і палі, і рэкі — населены духамі. Таму пакланяліся агню, сонцу, месяцу, дрэвам, камяням, ручаям, азёрам і рэкам. Асабліва ўшанаваным на беларускіх землях быў дуб.

Сярод мноства духаў былі і такія, якіх асабліва паважалі ці баяліся. Пра хатняга духа вы ўжо ведаеце. Яшчэ славяне верылі ў вадзяных духаў. Галоўны сярод іх — вадзянік — лічыўся варожым чалавеку. Яму прыпісвалі стыхійныя бедствы, няшчасці, хваробы людзей.

У лесе галоўным духам быў лясун. Яго звалі гаспадаром лесу. Ён мог збіць людзей з дарогі, прымусіць блукаць па лесе.

Дух поля, паводле паданняў славян, хаваўся ў апошні нязжаты пучок каласоў. Палявік, або палявы, з'яўляўся ў полі апоўдні. Людзей, якія працуюць у гэты час, ён мог пакараць сонечным ударам.

Шматлікія духі былі варожыя людзям. Аднак іх можна было ўлагодзіць дарамі, ахвярамі.

**Гэта цікава.** Паводле паданняў славян, наш свет засялялі таксама істоты, якія не адносіліся ні да людзей, ні да духаў. Гэта, напрыклад, вампіры і русалкі. У такіх істот ператвараліся людзі, якія памерлі не сваёй смерцю, «раней часу». Іх душы заставаліся на мяжы зямнога і замагільнага свету.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Язычніцкі святар-вяшчун перад князем. Малюнак з летапісу*

Нашы продкі ў тыя часы не маглі зразумець прыродныя з'явы, хваробы, смерць. Гэта выклікала ў іх пачуцці трывогі і жаху. З дапамогай веры ў існаванне духаў людзі спрабавалі растлумачыць іх.

**3. Язычніцкія багі.** Язычнікі-славяне ўшаноўвалі мноства багоў. *Мнагабожжа* — вера ў шматлікіх багоў — найбольш важная рыса ***язычніцтва***. Багі былі адказныя за розныя бакі жыцця чалавека і прыродныя з'явы.

Галоўным богам ва ўсходніх славян лічыўся *Пярун*. Гэтага бога шанавалі і балты, якія звалі яго Пяркунас. Пярун — бог навальніцы, грому і маланкі. Ён таксама быў апекуном ваеннай справы і з цягам часу стаў заступнікам княжацкай дружыны. Нашы продкі ўяўлялі, што Пярун трымае ў руках вялізныя жорны і, б'ючы камень аб камень, выклікае гром і маланку. Высечаныя іскры ляцяць на зямлю, як стрэлы, каб знішчыць «нячыстую сілу», але выпадкова могуць трапіць у чалавека ці будыніну і стаць прычынай пажару. Калі Пярун ехаў па небе ў сваёй калясніцы, таксама раздаваўся гром. І цяпер у Беларусі гром часта называюць перуном.

Здаўна ўсходнія славяне ўшаноўвалі *Вялеса (Валоса)*. Ён лічыўся заступнікам жывёлагадоўлі. Яго часта ўяўлялі ў выглядзе змяі. Магчыма, Вялес быў богам падземнага свету.

Некалькі багоў былі звязаны з культам сонца. Бо ад сонца, як і ад дажджу, залежаў ураджай. Галоўным богам сонца і агню быў *Сварог*. Яго сына звалі *Дажбог*. Богам сонца лічыўся і *Хорс*. Ён згадваецца ў выдатным творы старажытнарускай літаратуры — «Слове пра паход Ігаравы». У гэтым творы распавядаецца, што полацкі князь Усяслаў Чарадзей перасякаў шлях вялікаму Хорсу, ператварыўшыся ў ваўка.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Гэта цікава.** Нашы продкі ўшаноўвалі таксама бога Ярылу. Нават у XIX ст. у гонар Ярылы беларускія сяляне кожны год у красавіку ладзілі свята. Ён быў богам веснавой урадлівасці і плоднасці жывёлы, земляробства.
Заступніцай жанчын і адпаведна жаночых заняткаў, асабліва прадзення, з'яўлялася багіня Макош. Яе ўшаноўвалі як багіню ўрадлівасці. З сямі дзён тыдня Макошы была прысвечана пятніца. Напярэдадні гэтага дня жанчынам забаранялася прасці. З усталяваннем хрысціянства роля Макошы перайшла да Святой Параскевы, якую называлі Параскева Пятніца.

**4. Свяцілішчы.** Кожнае племя мела спецыяльнае месца, дзе маліліся багам і прыносілі ім ахвяры. Гэтае месца называюць ***свяцілішчам***, або *капішчам*.

Захавалася паданне, што каля Полацка на беразе Валовага возера знаходзілася свяцілішча Перуна. Язычнікі прыносілі ахвяры каменю і агню. На галінах дуба вешалі ручнікі і стужкі.

Звычайна ў цэнтры свяцілішча стаяў ідал, а вакол гарэлі вогнішчы. Агонь маглі падтрымліваць пастаянна. ***Ідалы*** — гэта вобразныя выявы багоў. Часцей за ўсё іх рабілі з гліны, металу, каменю і дрэва. Лепш за ўсё захоўваліся каменныя ідалы. Найбольш вядомыя ідалы, якія зберагліся да нашых дзён, — Шклоўскі і Слонімскі. У XIX ст. у старадаўнім будынку каля Віцебска быў знойдзены залаты ідал Перуна.



*Пакланенне язычнікаў ідалам*

**5. Міфы і паданні.** З дапамогай міфаў і паданняў нашы продкі тлумачылі паходжанне ўсяго жывога на зямлі: людзей, жывёл і раслін. Міфы давалі адказы на шматлікія

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

пытанні: як людзі навучыліся вырошчваць хлеб, прыручылі жывёл, даведаліся пра рамёствы.

Паходжанне прыродных з'яў, зараджэнне новага жыцця таксама тлумачылася міфамі. Міфы распавядалі пра жыццё багоў, якія, па меркаванні славян-язычнікаў, кіравалі ўсім светам.

Магчыма, у міфах і паданнях захаваліся водгукі гістарычных падзей. На аснове старажытных славянскіх міфаў і паданняў узніклі беларускія казкі.

**6. Абрады.** Усё жыццё чалавека ў старажытнасці суправаджалі ***абрады*** — спецыяльныя рытуальныя дзеянні, якія здзяйсняліся пры нараджэнні, паўналецці, вяселлі і, нарэшце, смерці. Асаблівую ўвагу нашы продкі надавалі пахавальнаму абраду. Людзі верылі ў існаванне замагільнага свету. Таму важна было падрыхтаваць чалавека да пераходу ў яго.

Балты спальвалі нябожчыкаў, а рэшткі спалення змяшчалі ў гліняны гаршчок, які хавалі пераважна ў грунтавой магіле. А вось славяне на тэрыторыі Беларусі з VI ст. хавалі нябожчыкаў у курганах. Земляныя насыпы дасягалі некалькіх метраў у вышыню. Часцей за ўсё яны былі круглымі. Але, як вы ўжо ведаеце, у крывічоў былі доўгія курганы.

Да X ст. славяне-язычнікі таксама спальвалі нябожчыкаў, пазней — хавалі ў зямлю. Гэта было звязана з распаўсюджаннем хрысціянства на землях усходніх славян. Побач з нябожчыкам змяшчалі яго рэчы — прылады працы, зброю, упрыгожанні. Такія рэчы сведчылі аб багацці і знатнасці памерлага.

Пахавальны абрад усходніх славян складаўся з памінальнай ежы і ***трызны*** — своеасаблівых вайсковых гульняў або спартыўных спаборніцтваў у гонар нябожчыка. Так супляменнікі развітваліся з памерлым. Пахавальны абрад суправаджаўся галашэннямі жанчын.

Каляндарныя абрады былі цесна звязаны з земляробчымі работамі. Цікавымі абрадамі і песнямі суправаджалася святкаванне Каляд, Масленіцы, Купалля, Зажынак і Дажынак. Калядныя песні і абрады павінны былі паскорыць надыход цяпла, забяспечыць багаты ўраджай на палетках. А вось у час Масленіцы праводзілі зіму і «гукалі вясну». На Купалле нашы продкі пакланяліся сонцу і агню, раслінам. Зажынкі і Дажынкі адносіліся да свят пачатку працы ў полі і завяршэння ўборкі ўраджаю. Людзі верылі, што гэтымі абрадамі можна паўплываць на сілы прыроды.

Правообладатель Издательский центр БГУ

### Пытанні і заданні

1. Растлумачце паняцці: *мнагабожжа, язычніцтва, свяцілішча, ідал, трызна*.
2. Як узнік і ў чым выяўляўся культ продкаў?
3. У існаванне якіх духаў верылі нашы продкі?
4. Якіх багоў ушаноўвалі старажытныя славяне?
5. Што ўяўлялі сабой свяцілішчы?
6. Што знаходзіла адлюстраванне ў старажытных усходнеславянскіх міфах?
7. Якія абрады суправаджалі жыццё чалавека ў Раннім сярэдневякоўі?
8. Складзіце табліцу «Язычніцкія багі старажытных славян».

| Імя бога | Апекуном чаго быў |
|---|---|
| | |

## § 14. МАТЭРЫЯЛЬНАЯ КУЛЬТУРА ЎСХОДНІХ СЛАВЯН

### Успомніце

1. Якія рамёствы былі распаўсюджаны ў славян у VI—IX стст.?
2. Якім упрыгожанням аддавалі перавагу ўсходнеславянскія жанчыны?

**1. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.** Людзі здаўна імкнуліся ўпрыгожваць рэчы, якімі пастаянна карысталіся. На прадметы паўсядзённага ўжытку яны наносілі простыя геаметрычныя ўзоры: кругі, квадраты. На розных рэчах славян Ранняга сярэдневякоўя можна сустрэць простыя малюнкі, якія разам складалі прыгожы ўзор — *арнамент*.

Арнамент прысутнічаў на гліняным посудзе, на ўпрыгожаннях, на розных іншых прадметах: грэбнях, праслiцах, паясах, абутку. Святочнае адзенне таксама аздаблялася арнаментам. Прыгожыя ўзоры славяне наносілі і на абрадавыя тканіны — ручнікі.

Арнамент меў глыбокі сэнс. У ім былі зашыфраваны знакі сонца, урадлівасці, выявы багоў і багінь і нават цэлыя міфы.

Спачатку кожны чалавек сам упрыгожваў свае рэчы найпрацейшым арнаментам. Затым такія рэчы сталі рабіць рамеснікі. Так узнікла *дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Рогавая выява музыкі*

Старажытных вырабаў з металу і косці захавалася няшмат. Аб розных жаночых металічных упрыгожаннях славянскіх плямён вы ўжо ведаеце.

З косці славяне рабілі грабяні, дзяржанні нажоў. Іх упрыгожвалі простымі арнаментамі з круглых або авальных адтулін. Але часта ў арнамент уключаліся малюнкі жывёл. Яны былі выкананы з вялікім майстэрствам і мастацкім густам, якому маглі б пазайздросціць і сучасныя спецыялісты. Прыкладам служыць выразаная з косці галава каня, зробленая ў X ст. Яна была знойдзена ў кургане каля Полацка.

**2. Жыллё.** Нашы продкі стваралі сваё жыллё з тых прыдатных матэрыялаў, што былі пад рукой. Асноўным матэрыялам служыла дрэва. З дрэва рабілі сцены, каркас для даху, з цягам часу дошкамі сталі накрываць падлогу. Здаралася, сцены рабілі з тыну, абмазанага глінай. Дах накрывалі саломай, радзей чаротам, зверху маглі яшчэ пакласці дзёран.

Канструкцыі славянскага жылля на тэрыторыі Беларусі былі розныя. Хтосьці аддаваў перавагу хатам, сцены якіх складаліся з бярвёнаў-слупоў. Іншыя будавалі зрубныя хаты. Часта сустракаліся паўзямлянкі, дзе падлога была амаль на метр паглыблена ў зямлю. У такім жыллі лепш захоўвалася цяпло. Жыллё мела прамавугольную форму. Сцены былі арыентаваны па баках свету. Найбольш важным збудаваннем у жыллі была печ-каменка.



*Славянскае наземнае зрубнае жытло і паўзямлянка. Рэканструкцыя*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Яна сагравала людзей у халады, у ёй жа гатавалі ежу. Печы будаваліся з камянёў і гліны. Яны размяшчаліся ў адным з кутоў або каля сцяны.

Печы тапіліся «па-чорнаму». У іх не было дымахода, таму дым збіраўся ў жыллі. Людзям цяжка было дыхаць, але патрабавалася менш паліва і лепш захоўвалася цяпло. Падлогу звычайна рабілі земляной, але часам яе абмазвалі глінай або пакрывалі драўлянымі дошкамі.

Побач з жыллём размяшчаліся гаспадарчыя пабудовы і ямы. У ямах славяне захоўвалі запасы прадуктаў, як правіла, збожжа.

**3. Адзенне.** Адзенне славян было простым і практычным. Аснову і мужчынскага, і жаночага касцюма складала сарочка — кашуля з ільнянога даматканага палатна. Жаночая сарочка была даўжэйшая за мужчынскую. Мужчынскія кашулі не запраўляліся ў штаны, а насіліся навыпуск. Рукавы сарочкі маглі быць даўжэйшыя за рукі, у халады яны выконвалі ролю рукавіц. Жанчыны запраўлялі кашулю ў панёву, якая ўяўляла сабой некалькі нясшытых кавалкаў тканіны, што мацаваліся вакол пояса.

Кашулю мужчыны падпяразвалі поясам. Паясы выраблялiся з воўны або скуры. Яны былі плеценыя, вязаныя ці тканыя. Мужчыны адзявалі штаны (нагавіцы, порты), якія шылі з аднатоннага палатна (зімовыя — з сукна).

Верхнім адзеннем для жанчын і мужчын былі світы, наплечныя пакрывалы, кажухі, футры. Світы і наплечныя пакрывалы былі ваўняныя, зашпільваліся на гузікі або фібуламі. Мужчынскія кажухі часта рабілі нераспашнымі. Пісьмовыя крыніцы згадваюць пра футры з мядзведзя, ваўка, лісіцы, бабра і інш.





*Касцюм дзяўчыны і замужняй жанчыны*

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Гэта цікава.** Жаночыя галаўныя ўборы ўжо ў той час строга залежалі ад узросту і сямейнага становішча жанчыны. Замужняй кабеце забаранялася паказвацца на людзях з непакрытай галавой. Дзяўчаты насілі вянкі, жанчыны адзявалі чапец, а паверх яго — намітку (белае палатно, часта ўпрыгожанае арнаментам). Жаночыя галаўныя ўборы выраблялiся з бярасты, лазы, тканіны, упрыгожваліся металічнымі і шклянымі аздобамі.
Мужчыны насілі шапкі і клабукі з ваўнянай тканіны або футра. Для падтрымання формы ў іх укладвалі бярэсту.



*Скураны абутак, упрыгожаны арнаментам*

На ногі славяне абувалі пасталы́, або поршні (скураны абутак накшталт лапцей), чаравікі, боты, а таксама лапці, сплеценыя з лыка. Лыка — гэта тонка парэзаная кара дрэў (галоўным чынам ліпы).

З раслін, кары і лісця дрэў, балотнай жалезнай руды славяне навучыліся здабываць фарбы. Імі яны фарбавалі тканіны ў самыя разнастайныя колеры. Адзенне дапаўнялі рознымя ўпрыгожанні. Звычайна іх насілі ў святы і ўрачыстасці. Святочнае адзенне аздаблялі арнаментам.



*Наканечнікі стрэл*

**4. Зброя.** Зброя была звыклым прадметам ва ўжытку ўсходніх славян у тыя даўнія часы. Па-першае, яна выкарыстоўвалася на паляванні. Па-другое, усе мужчыны павінны былі абараняць свой род ад ворагаў.

Яшчэ са старажытнасці найбольш распаўсюджаным быў лук са стрэламі. Выгляд стрэл, якімі карысталіся славяне на тэрыторыі Беларусі, запазычаны імі ў германцаў.

Іншай зброяй, якую часта выкарыстоўвалі нашы продкі, была дзіда (кап'ё). Дзіду маглі кідаць у ворага і прымяняць у рукапашным баі.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

Пад уплывам суседзяў у славян распаўсюдзілася такая зброя, як баявая сякера.

Засцерагальнае ўзбраенне славян было яшчэ вельмі простым. Яно складалася толькі з драўлянага шчыта. Вядома адзіная знаходка фрагмента металічнага даспеха на гарадзішчы Хотамель (Столінскі раён). Гэты даспех у VIII—X стст. насіў, мабыць, княжацкі дружыннік. З IX ст. з'яўляюцца шлемы. Належалі яны толькі князям, іх дружыннікам і знаці.

Вельмі рэдкай і дарагой зброяй былі мячы. У IX ст. славяне на тэрыторыі Беларусі мячы яшчэ не рабілі. Гэтая зброя была прывазной. Дзяржанні мячоў багата ўпрыгожваліся. Мячы вельмі шанаваліся, ім нават давалі ўласныя імёны.

Культура славян гэтага перыяду адлюстроўвае ўзровень іх развіцця. Славяне ў асноўным займаліся земляробствам. Яны з'яўляліся язычнікамі і былі вельмі непатрабавальнымі ў побыце.



*Дзяржанне мяча*

**Пытанні і заданні**

1. Дайце тлумачэнне паняццяў: *арнамент, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва.*
2. Якія рэчы ўпрыгожвалі арнаментам усходнія славяне?
3. Які сэнс меў арнамент?
4. Прывядзіце прыклады дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўсходніх славян на тэрыторыі Беларусі.
5. З якіх матэрыялаў будавалі сваё жыллё ўсходнія славяне?
6. Назавіце асноўныя канструкцыі ўсходнеславянскага жылля.
7. Апішыце адзенне, у якое апраналіся ўсходнеславянскія жанчыны.
8. З чаго складаўся мужчынскі касцюм?
9. Якую зброю выкарыстоўвалі славяне ў Раннім сярэдневякоўі на тэрыторыі Беларусі?
10. Зрабіце выснову аб узроўні развіцця ўсходніх славян у дадзяржаўны перыяд.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ

**Заданне 1.** Пакажыце на картасхеме:

а) тэрыторыю рассялення балтаў у бронзавым і раннім жалезным вяках;

б) шляхі пранікнення славян на тэрыторыю Беларусі;

в) тэрыторыю рассялення ўсходнеславянскіх саюзаў плямён крывічоў-палачан, радзімічаў і дрыгавічоў;

г) тэрыторыю суседзяў крывічоў-палачан, радзімічаў і дрыгавічоў.

**Заданне 2.** Вызначце найбольш важныя падзеі і з'явы ў гісторыі беларускай зямлі, якія мелі месца ў:

- VI ст.;
- VII ст.;
- VIII ст.;
- IX ст.

**Заданне 3.** Дайце азначэнні наступных паняццяў (пры неабходнасці карыстайцеся «Слоўнікам гістарычных паняццяў і тэрмінаў»):

- балты
- усходнія славяне
- славянізацыя балтаў
- крывічы-палачане
- дрыгавічы
- радзімічы
- суседская абшчына
- князь
- дружына
- даніна
- веча
- племянныя княжанні
- малая сям'я
- бортніцтва
- свяцілішча
- ідал
- мнагабожжа
- язычніцтва
- трызна

**Заданне 4.** Размясціце вывучаныя паняцці ў адпаведныя графы табліцы згодна з прапанаваным узорам.

| Народы, плямёны | Гаспадарчая дзейнасць | Грамадскае развіццё | Рэлігія і культура |
|---|---|---|---|
| Балты | Ворнае земляробства | Князь | Язычніцтва |
| | | | |

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Заданне 5.** Знайдзіце пары:

А) князь;
Б) ворнае земляробства;
В) саюз плямён;
Г) язычніцтва;
Д) дэкаратыўна-прыкладное мастацтва;
Е) пахавальны абрад;
Ж) адзенне;

а) дрыгавічы;
б) ідал;
в) курган;
г) дружына;
д) панёва;
е) арнамент;
ж) саха.

**Заданне 6.** Запоўніце табліцу і зрабіце высновы.

| Пытанні для параўнання | Балты | Усходнія славяне |
|---|---|---|
| Плямёны, саюзы плямён | | |
| Паселішча | | |
| Гаспадарка | | |
| Рамёствы | | |
| Гандаль | | |

**Заданне 7.** Па адным з пунктаў тэмы «Матэрыяльная культура ўсходніх славян» (на выбар) складзіце просты план.

**Заданне 8.** Параўнайце і знайдзіце адрозненні:

- селішча і гарадзішча;
- дружыны і ваеннага апалчэння;
- родавай і суседскай абшчыны.

**Заданне 9.** Вызначце галоўныя прычыны:

- падзелу балтаў і славян на асобныя плямёны;
- перасялення славян на новыя тэрыторыі;
- вылучэння ў славянскім грамадстве знатных людзей;
- з'яўлення княжацкай улады;
- з'яўлення малых сем'яў.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Заданне 10.** Складзіце апавяданне на адну з наступных тэм (на выбар): «Жыццё ў славянскім паселішчы»; «Праца земляроба»; «Узнікненне горада».

**Заданне 11.** Дакажыце, што:

- славяне пераўзыходзілі балтаў у грамадскім развіцці;
- у VI—IX стст. удасканальваліся сельскагаспадарчыя прылады працы і адбывалася развіццё земляробства ва ўсходніх славян;
- усходнія славяне ў IX ст. наблізіліся да стварэння дзяржавы.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

## РАЗДЗЕЛ III

# СЯРЭДНЕВЯКОВЫЯ КНЯСТВЫ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў IX — СЯРЭДЗІНЕ XIII ст.

## § 15. ДЗЯРЖАЎНАСЦЬ УСХОДНІХ СЛАВЯН

**Успомніце**

1. Якія прычыны прыводзілі да стварэння дзяржавы?
2. Якую ролю адыгрывала дружына ў дадзяржаўны перыяд?

**1. Паходжанне дзяржаўнасці ва ўсходніх славян.** У VIII—IX стст. у жыцці ўсходніх славян адбываліся важныя змены. Яны былі звязаны з вылучэннем правадыроў і родаплемяннной знаці, узнікненнем маёмаснай няроўнасці — з'яўленнем бедных і багатых. Унутранае развіццё грамадства, а таксама знешняя небяспека патрабавалі стварэння моцнай улады.

Вярхоўная ўлада арганізоўвала насельніцтва для барацьбы з ворагамі, здзяйсняла суд, кантралявала гандаль. Усе гэтыя справы былі вельмі важнымі ў жыцці людзей. Таму ўсходнія славяне былі зацікаўлены ў існаванні моцнай і сталай улады князя. За выкананне гэтых абавязкаў князь і набліжаныя да яго асобы атрымлівалі ад супляменнікаў добраахвотныя паднашэнні — дары. Пасля яны замацаваліся традыцыяй і ператварыліся ў даніну.

У вырашэнні важных пытанняў усходнія славяне заўсёды прыслухоўваліся да найбольш вопытных людзей — старэйшын, якія з цягам

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Князь з дружынай. Малюнак з летапісу*

часу сваё больш высокае становішча сталі перадаваць у спадчыну. Так утваралася *родаплемянная знаць*. Знаць сама не ўдзельнічала ў вытворчасці прадуктаў ці рамястве, але ў яе руках збіралася значнае багацце. Адбывалася гэта таму, што знатныя людзі атрымоўвалі большую частку ваеннай здабычы, у тым ліку рабоў. Тыя працавалі на сваіх гаспадароў, выраблялі ўсё неабходнае для іх. У неўраджайныя гады знатныя людзі маглі даваць пазыку сваім супляменнікам, таму тыя аказваліся залежнымі ад іх.

Узрастанне ролі ваеннай справы, неабходнасць прыняцця хуткіх рашэнняў, што не маглі зрабіць ні савет старэйшын, ні тым больш веча, узмацнялі ўладу князя. Вакол яго сфарміравалася дружына. З ёю князь хадзіў у паходы. Яна ж дапамагала падпарадкоўваць насельніцтва. Гістарычныя крыніцы паведамляюць аб існаванні ў палачан і дрыгавічоў племянных княжанняў. На думку вучоных, менавіта яны сталі зародкамі дзяржаўнасці ва ўсходніх славян. У іх ужо была даволі моцная княжацкая ўлада, хаця найбольш важныя пытанні вырашалі веча і знаць. Аб'яднанне племянных княжанняў прывяло да стварэння дзяржавы.

**2. Месца беларускіх зямель у складзе Старажытнарускай дзяржавы.** У канцы IX ст. узнікла Старажытнаруская дзяржава, галоўным горадам якой быў Кіеў. Вучоныя называюць яе па-рознаму: Старажытнаруская дзяржава, Старажытная Русь, Кіеўская Русь. У летапісах часцей за ўсё сустракаюцца назвы «Русь», «Руская зямля».

Усе сучасныя беларускія землі ўваходзілі ў склад Старажытнарускай дзяржавы. «Аповесць мінулых гадоў» сведчыць, што яшчэ да стварэння дзяржавы варажскі князь Рурык пасадзіў сваіх людзей у Полацку. Варагі, якіх таксама называлі «вікінгі» або «нарманы», былі выхадцамі са Скандынавіі і самымі грознымі ваярамі тагачаснай Еўропы.

Але пры гэтым Рурык і яго паплечнікі не заваявалі ўсходніх славян, а з'явіліся тут у якасці правіцеляў па запрашэнні мясцовых плямён, знясіленых унутранымі спрэчкамі. Пераемнік Рурыка князь Алег —

Правообладатель Издательский центр БГУ

ствара́льнік Старажытнарускай дзяржавы — падпарадкаваў таксама радзімічаў.

Гэтыя ўсходнеславянскія саюзы плямён прызнавалі ўладу Кіева і ў часы праўлення ў ім Ігара Старога (912—945). Недзе ў сярэдзіне X ст. Кіеву былі падпарадкаваны і дрыгавічы.

Толькі ў **960-я гг.** уладу ў Полацку захапіў варажскі князь Рагвалод. Ён праводзіў незалежную ад Кіева палітыку. Але каля **980 г.** Рагвалод быў забіты наўгародскім князем Уладзімірам, які неўзабаве стаў і кіеўскім князем. Пад яго ўладай зноў былі сабраны ўсе ўсходнеславянскія саюзы плямён.



*Рагнеда*

Уладзімір прымусова ўзяў сабе ў жонкі дачку Рагвалода Рагнеду. Яна нарадзіла кіеўскаму князю некалькі сыноў. Аднаму з іх — Ізяславу — Уладзімір аддаў уладу ў Полацку. З таго часу — **988 г.** — бярэ пачатак Полацкае княства, у якім правіла ўласная княжацкая дынастыя.

Іншым быў гістарычны лёс зямель дрыгавічоў. Тут узнікла Тураўскае княства, якое доўгі час знаходзілася пад уладай кіеўскага князя. Некалькі разоў яго атрымліваў старэйшы сын кіеўскага князя, які пасля смерці бацькі займаў галоўны прастол Старажытнай Русі — Кіеў.

Землі радзімічаў непасрэдна падпарадкоўваліся Кіеву, а затым аказаліся ў складзе Чарнігаўскага і часткова Смаленскага княстваў. Брэстчына (Берасцейшчына) належала Валынскаму княству.

Такім чынам, сучасныя беларускія землі ў перыяд Старажытнай Русі ўваходзілі ў склад некалькіх княстваў. Яны знаходзіліся ў рознай ступені залежнасці ад Кіева.

**3. Старажытная (Кіеўская) Русь — супольная дзяржава ўсходніх славян.** Вялікая па сваёй тэрыторыі Старажытнаруская дзяржава з цягам часу распалася на некалькі самастойных княстваў. Сярод іх былі Полацкае і Тураўскае княствы. Старажытнарускія княствы праводзілі самастойную палітыку, іх правіцелі варагавалі паміж сабой. Тым не менш Старажытная Русь захоўвала адноснае адзінства. Нават у перыяд палітычнай раздробленасці землі ўсходніх славян за мяжой лічылі адзінай дзяржавай — Руссю.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Усе старажытнарускія княствы звязвала адзіная царкоўная арганізацыя. Яна склалася пасля прыняцця ў якасці дзяржаўнай рэлігіі Кіеўскай Русі хрысціянства ў 988 г. Яе кіраўнік — ***мітрапаліт*** — знаходзіўся ў Кіеве. Ва ўсіх княствах правілі прадстаўнікі княжацкага роду Рурыкавічаў. Іх агульным продкам быў Рурык. Яны былі даволі блізкімі сваякамі і заўсёды памяталі аб гэтым. Неаднойчы здараліся выпадкі, калі княствы ладзілі сумесныя замежныя паходы супраць ворагаў на захадзе і на поўдні Русі. Больш таго, адмова полацкіх князёў існаваць паходам супраць качэўнікаў-полаўцаў стала падставай для іх выгнання ў Візантыю.

Аб адзінстве Русі сведчыць і шмат іншых фактаў: аднолькавая гаспадарчая дзейнасць, цесныя гандлёвыя сувязі, падобны лад жыцця, агульнае паходжанне і гістарычны лёс.

**4. Старажытнаруская (усходнеславянская) народнасць.** У культуры, побыце, гістарычным лёсе ўсходнеславянскага насельніцтва было шмат агульнага. Гэта дазволіла вучоным сцвярджаць, што існавала ўсходнеславянская супольнасць, якую часам называюць «старажытнаруская народнасць». Яна стала падмуркам для трох народаў — беларускага, рускага і ўкраінскага. Для супольнасці людзей, якія складаюць ***народнасць***, характэрны агульная мова, тэрыторыя рассялення, культура і іншыя адметныя асаблівасці.

Насельніцтва Старажытнай Русі называла сябе рускімі, русічамі. У яго былі агульныя традыцыі, святы, вераванні.

Найважнейшай прыкметай існавання народнасці з'яўляецца мова. Старажытнарускія пісьмовыя крыніцы — летапісы, жыціі, аповесці — сведчаць аб тым, што літаратурная мова ва ўсходніх славян была агульнай. У IX—XIII стст. продкі сучасных беларусаў, рускіх і ўкраінцаў размаўлялі на адной мове. Зразумела, пражыванне людзей на вялікіх абшарах наклала свой адбітак на асаблівасці гутарковай мовы ў крывічоў, палян, дрыгавічоў, вяцічаў і інш. Аднак у той перыяд гэтыя асаблівасці не мелі вялікага значэння.

### Пытанні і заданні

1. Дайце тлумачэнне дат: *960-я гг., 980, 988.*
2. Растлумачце паняцці: *родаплемянная знаць, мітрапаліт, народнасць.*
3. Якую ролю адыгрывала ва ўсходнеславянскім грамадстве вярхоўная ўлада?

Правообладатель Издательский центр БГУ

4. Як называлі ўсходнія славяне сваю дзяржаву? Якія назвы далі гэтай краіне вучоныя?
5. У якіх адносінах да Кіева знаходзіліся саюзы плямён — крывічы-палачане, радзімічы, дрыгавічы?
6. Назавіце факты, якія сведчаць аб адзінстве Старажытнарускай дзяржавы.
7. Пералічыце характэрныя рысы старажытнарускай народнасці.

# § 16. ПОЛАЦКАЕ КНЯСТВА Ў IX—XI стст.

**Успомніце**

1. Якія першыя княствы ўзніклі на тэрыторыі Беларусі?
2. Як звалі першага вядомага полацкага князя?
3. Каму перадавалася ўлада, калі князь паміраў?

**1. Старажытны Полацк.** У гістарычнай навуцы Полацк вядомы як сталіца буйнога княства. Першае пісьмовае ўпамінанне пра яго адносіцца да **862 г.**

Горад быў заснаваны пры ўпадзенні ракі Палаты ў Заходнюю Дзвіну. Месца яго размяшчэння было зручнае для вядзення гандлю.




*План старажытнага Полацка*

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Волакі*

Сведчаннем гандлёвых сувязей Полацка з'яўляюцца шматлікія скарбы арабскіх і еўрапейскіх манет IX—XI стст., якія былі знойдзены на Полацкай зямлі. Выгаднае геаграфічнае становішча спрыяла імкліваму росту Полацка. У хуткім часе ён стаў цэнтрам самага магутнага ў краі Полацкага княства. У летапісах такое дзяржаўнае ўтварэнне вядома пад назвай *«зямля»*.

**2. Саперніцтва з Ноўгарадам і Кіевам.** У 1003 г. княжыць у Полацкай зямлі пачаў сын Ізяслава Брачыслаў. Па ўзросце ён быў яшчэ дзіцём. Стаўшы дарослым, Брачыслаў уступіў у барацьбу з Ноўгарадам. Для гэтага мелася важная прычына. Полацку патрэбны былі ***волакі*** — сухапутныя шляхі гандлёвых зносін, якія злучалі дзве ракі — Дняпро і Заходнюю Дзвіну. Імі валодаў Ноўгарад.

У 1021 г. князь Брачыслаў са сваім войскам напаў на Ноўгарад, захапіў вялікую здабычу і шмат палонных.

У барацьбу на баку Ноўгарада ўступіў вялікі князь кіеўскі Яраслаў Мудры, які даводзіўся дзядзькам полацкаму князю. Барацьба паміж дзядзькам і пляменнікам скончылася заключэннем міру. Яраслаў аддаў Брачыславу гарады Віцебск і Усвяты, дзе праходзілі волакі.

У выніку тэрыторыя Полацкага княства значна павялічылася.

**3. Князь Усяслаў Брачыславіч (1044—1101).** Пасля смерці Брачыслава Ізяславіча ў 1044 г. полацкім князем стаў яго сын Усяслаў. Пры ім яшчэ больш узраслі роля і магутнасць Полацкага княства.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

Летапісцы апавядаюць, што князь быццам бы нарадзіўся ад чараўніцтва і таму стаў удалым воінам. Людзі верылі, што ён мог абярнуцца ваўком і з'явіцца то каля сцен Ноўгарада, то каля Кіева.



*Усяслаў Чарадзей*

Энергія, розум, кемлівасць, з якой Усяслаў абараняў Полацкую зямлю, яго ўменне знайсці выйсце з самага цяжкага становішча здзіўлялі людзей, рабілі моцнае ўражанне на ворагаў. Поўнае подзвігаў і прыгод жыццё Усяслава натхняла песняроў і складальнікаў былін. Сучаснікі празвалі князя Чарадзеем.

**4. Бітва на рацэ Нямізе.** Князь Усяслаў імкнуўся пашырыць межы Полацкага княства і напаў на Пскоў, але не здолеў узяць горад. Тады князь з войскам рушыў на Ноўгарад і захапіў яго. Гэта вельмі не спадабалася кіеўскаму князю. Трое сыноў Яраслава Мудрага вырашылі пайсці на Полацкае княства вайной. Зімой 1067 г. з вялікім войскам яны з'явіліся пад Менскам — горадам Полацкай зямлі, захапілі і разбурылі яго. На дапамогу абаронцам горада спяшаўся з дружынай Усяслаў, але спазніўся.

Войскі сутыкнуліся на рацэ Нямізе (цяпер вуліца ў Мінску). У жорсткай бітве **3 сакавіка 1067 г.** Усяслаў быў разбіты. Бітву на Нямізе з болем у сэрцы апісваў аўтар паэмы «Слова пра паход Ігаравы».

З рэшткамі сваёй дружыны Усяслаў адышоў да Дняпра. Кіеўскія князі запрасілі яго на перагаворы і абяцалі, што не зробяць ніякага зла. Усяслаў паверыў іх клятве — крыжацалаванню. Пераправіўшыся праз Дняпро каля Оршы, ён разам з сынамі ўвайшоў у велікакняжацкі шацёр, але адразу быў захоплены ў палон, вывезены ў Кіеў і зняволены там у турму.



*Бітва на Нямізе. Малюнак з летапісу*

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ




*Беларускія землі ў XI ст.*

Праз год Усяслава вызвалілі паўстаўшыя гараджане і абвясцілі вялікім князем кіеўскім. Быў ён на прастоле ў Кіеве сем месяцаў, затым вярнуўся ў Полацк. У ходзе ўпартай барацьбы Усяслаў Чарадзей вызваліў Полацкае княства. Але супрацьстаянне з кіеўскімі князямі працягвалася. Толькі ў апошнія гады свайго жыцця Усяслаў больш не нападаў на суседнія землі. Кіеўскія князі таксама не трывожылі яго.



*Так выглядаў Сафійскі сабор у XI ст. Макет рэканструкцыі*

**5. Найвышэйшы ўздым Полацкага княства.** У перыяд княжання Усяслава Брачыславіча Полацкае княства дасягнула найвышэйшага ўздыму.

У сталіцы княства — Полацку — князь пабудаваў новы магутны замак і велічны Сафійскі са-

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

бор. У час княжання Усяслава паспяхова развіваліся рамяство і гандаль. Сваім нашчадкам князь пакідаў Полацкую зямлю не спустошанай і разрабаванай, а магутнай і квітнеючай. Гісторыя Полацкай зямлі — гэта неад'емная гераічная старонка гісторыі Беларусі.

### Пытанні і заданні

1. Дайце тлумачэнне дат: *862, 1003, 1021, 1044—1101, 1067*.
2. Растлумачце паняцце: *волакі*.
3. Растлумачце летапіснае паняцце «зямля».
4. Што з'яўляецца сведчаннем шматлікіх гандлёвых сувязей Полацка?
5. Назавіце асноўную прычыну саперніцтва Полацка з Ноўгарадам.
6. Якога полацкага князя ў народзе называлі Чарадзеем і чаму?
7. Якімі асаблівасцямі вызначалася бітва на Нямізе?
8. Складзіце вуснае паведамленне пра бітву на Нямізе.
9. Пакажыце на картасхеме на с. 84 межы Полацкага княства ў канцы XI ст.
10. Зрабіце вывад аб гістарычным значэнні дзейнасці князя Усяслава.

ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ

Летапіс сведчыць: «І сустрэліся праціўнікі на Нямізе месяца сакавіка ў 3-і дзень, быў снег вялікі, і пайшлі адзін на аднаго. І была лютая сеча, і многія палеглі ў ёй, і перамаглі Ізяслаў, Святаслаў і Усевалад (кіеўскія князі), Усяслаў жа ўцёк».

## § 17. ПОЛАЦКАЯ ЗЯМЛЯ Ў XII — СЯРЭДЗІНЕ XIII ст.

### Успомніце

1. Якая гаспадарка называецца натуральнай?
2. Якія вынікі мела феадальная раздробленасць у краінах Заходняй Еўропы?
3. Пры якім князю Полацкае княства дасягнула найвышэйшага ўздыму?

**1. Раздробленасць Полацкай зямлі, яе прычыны і вынікі.** Усяслаў Чарадзей быў апошнім князем, які валодаў усёй Полацкай зямлёй. Пачыналася трывожнае XII ст. — перыяд ***раздробленасці*** і няспынных ***міжусобных войнаў*** паміж асобнымі князямі.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

Пасля смерці Усяслава Полацкая зямля пачала распадацца на асобныя княствы. У летапісах яны называюцца ***валасцямі***.

Якімі былі прычыны раздробленасці? Пачнём з гаспадаркі. У сярэдневякоўі яна мела натуральны характар. У такіх умовах сувязі з рознымі землямі нават аднаго княства былі вельмі слабымі. А гэта значыць, што буйное княства магло распасціся на больш дробныя. Другой прычынай раздробленасці было ўзнікненне прыватнага землеўладання і ўзмацненне баярства. ***Баяры*** — былыя княжацкія дружыннікі — атрымлівалі




*Беларускія землі ў перыяд раздробленасці*

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

ад князя зямлю ва ўласнасць і аказваліся незалежнымі ад яго. Яны ўжо не былі зацікаўлены ў існаванні адзінай моцнай княжацкай улады.



*Менскі князь Глеб Усяславіч*

У выніку асобныя воласці-княствы Полацкай зямлі на чале з дзецьмі Усяслава Брачыславіча пачалі адасабляцца. Тое ж самае адбывалася і ў іншых землях Старажытнай Русі.

Такім чынам, сутнасцю раздробленасці быў распад буйных княстваў (у крыніцах яны зваліся землямі) на больш дробныя воласці (Менскае, Друцкае, Віцебскае, Слуцкае, Пінскае і іншыя княствы). Раздробленасць беларускіх зямель працягвалася да сярэдзіны XIII ст., амаль 150 гадоў. Аб'яднанне іх у складзе новай дзяржавы (Вялікага княства Літоўскага) ішло паступова і працягвалася яшчэ каля 100 гадоў — аж да сярэдзіны XIV ст.

**2. Часовы ўздым Менскага княства.** У пачатку перыяду раздробленасці першым са складу Полацкай зямлі вылучылася Менскае (Мінскае) княства. У ім стаў княжыць сын Усяслава Глеб **(1101—1119)**. Глеб вёў палітыку ўзвышэння Менска (Мінска). Некаторы час менскаму князю гэта цалкам удавалася. Менску былі падпарадкаваны гарады Друцк, Орша і Копысь. Глеб Усяславіч нават не пабаяўся выступіць супраць магутнага кіеўскага князя Уладзіміра Манамаха.

У 1116 г. Глеб на чале войска разрабаваў частку Тураўскага княства і, каб аслабіць яго, спаліў горад Слуцк (у сувязі з гэтымі падзеямі Слуцк упершыню згадваецца ў летапісе). Тураўскае княства ў той час узначальваў сын кіеўскага князя.

Уладзімір Манамах выступіў супраць Глеба Усяславіча і аблажыў з войскам Менск. Глеб быў вымушаны накіраваць паслоў у стан Манамаха. Пасля мірных перамоў Манамах зняў аблогу і дараваў Глебу. Менскі князь абяцаў ва ўсім «паслушаці» кіеўскага князя. Праз некаторы час кіеўскі князь адабраў у Глеба Усяславіча яго воласць, а самога князя ўзяў у палон у Кіеў. Тут менскі князь і памёр у 1119 г. Яго пахавалі з належнай князю пашанай у Кіева-Пячэрскім манастыры. Пасля гэтых падзей Менск на некаторы час страціў сваё значэнне важнага палітычнага цэнтра.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Князь Барыс Усяславіч едзе на княжанне ў Полацк. Малюнак з летапісу*

**3. Адносіны паміж Полацкім і Кіеўскім княствамі.** Полацкія князі не жадалі падпарадкоўвацца вялікаму князю кіеўскаму. У **1127 г.** кіеўскі князь Мсціслаў — сын Уладзіміра Манамаха — арганізаваў новы паход на Полацкую зямлю. Сем рускіх князёў са сваімі дружынамі прымалі ў ім удзел. Былі заняты Ізяслаўль (Заслаўе) і Лагойск. Небяспека навісла над Полацкам. Палачане абвінавачвалі ў вайне свайго князя Давыда Усяславіча. Каб прадухіліць захоп і рабаванне горада, яны яго прагналі.

На княжанне быў пасаджаны князь Барыс — адзін з сыноў Усяслава Брачыславіча. Ваенныя дзеянні спыніліся. У 1129 г. Мсціславу ўдалося захапіць у палон непакорлівых полацкіх князёў разам з сем'ямі і выслаць іх у Візантыю. Праз некалькі гадоў некаторыя князі вярнуліся ў Полацк. У гэты час памёр кіеўскі князь Мсціслаў Уладзіміравіч, і Кіеўская Русь канчаткова распалася на асобныя самастойныя княствы.

**4. Арганізацыя войска.** Вы ўжо ведаеце, што ў тыя часы многія спрэчныя пытанні вырашаліся з дапамогай зброі. Таму ваенная справа з'яўлялася адным з галоўных клопатаў князя. Па-ранейшаму аснову княжацкага войска складала дружына, найважнейшым абавязкам якой была вайсковая служба. У гэты час дружына падзялялася на *старэйшую* (баяры, «княжыя мужы», грыдні) і *малодшую* (отракі, дзецкія). Старэйшая дружына адыгрывала важную ролю ў кіраванні дзяржавай.




*Полацкія ўзброеныя сілы*

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

Важнай часткай войска заставалася апалчэнне. Цяпер гэта ваенная сіла складалася з гараджан і сельскага насельніцтва і называлася «полк». Адсюль і паходзіць назва «апалчэнне». Апалчэнцы былі пешымі воінамі. Апалчэнне ўзначальваў *тысяцкі*. Усё войска ўмоўна дзялілася на дзесяткі і сотні, на чале якіх стаялі дзесяцкія і сотнікі.

Такім чынам, дружына і апалчэнне на чале з князем былі галоўнай сілай, якая абараняла княства ад знешняй небяспекі.

**5. Дзейнасць веча.** Як і ў старажытных славянскіх плямён, у Полацку важнае месца займала дзейнасць усенароднага сходу — веча. Яно магло здымаць і прызначаць князя, заключаць дагаворы з іншымі гарадамі і дзяржавамі. Неаднойчы здаралася, што, калі веча не падтрымлівала князя, ён павінен быў пакінуць горад.

Веча адыгрывала важную ролю і ў жыцці іншых гарадоў беларускіх зямель. Князі былі залежныя ад гараджан. Яны павінны былі клапаціцца аб людзях і добрасумленна выконваць свае княжацкія абавязкі.

Аднак нельга пераацэньваць значэнне веча. У мірныя, спакойныя часы яно зусім не праяўляла сябе. Не чуваць было аб вечы і ў гады праўлення моцных князёў. Толькі ў час войнаў, змены княжацкай улады, абвастрэння канфліктаў у грамадстве, пры неабходнасці прыняцця важных рашэнняў насельніцтва праз веча выказвала свае патрабаванні. У Полацку веча паступова ўзмацнялася на працягу XII ст. разам з аслабленнем княжацкай улады.

### Пытанні і заданні

1. Дайце тлумачэнне дат: *1101—1119, 1116, 1127, 1129.*
2. Растлумачце паняцці: *баяры, раздробленасць, воласць, міжусобныя войны.*
3. Пералічыце прычыны раздробленасці.
4. Назавіце галоўны вынік раздробленасці.
5. Як вы разумееце выраз: «Глеб вёў палітыку ўзвышэння Менска»? Якім быў вынік такой палітыкі?
6. Чым адрознівалася княжацкая дружына ад апалчэння?
7. Аб якім праве веча сведчаць наступныя летапісныя звесткі: «Не едзь, княжа, веча (сабралася) супраць цябе ў горадзе (Полацку), і дружыну тваю збіваюць, а цябе (самога) хочуць схапіць»?
8. У якіх выпадках насельніцтва збіралася на веча?

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 18. ТУРАЎСКАЕ КНЯСТВА

**Успомніце**

1. Як называліся ўсходнеславянскія плямёны, што рассяліліся ў паўднёвай частцы Беларусі?
2. Якія гарады размяшчаліся на поўдні Беларусі?

**1. Старажытны Тураў.** Ёсць на поўдні Беларусі невялікі горад Тураў. Менавіта гэты сціплы гарадок, што непрыкметна прытуліўся да пратокі шырокай Прыпяці, быў калісьці цэнтрам асобнага княства.

Узнікненню горада і яго развіццю садзейнічала выгаднае геаграфічнае становішча. Ён размяшчаўся ў басейне Прыпяці на Прыпяцка-Бугскім гандлёвым шляху з Кіева ў Польшчу. Узнік Тураў на тэрыторыі дрыгавічоў. Урадлівыя землі садзейнічалі паспяховаму земляробству.

**2. Узнікненне Тураўскага княства.** Першае пісьмовае ўпамінанне пра Тураў адносіцца да **980 г.** Летапісец пад гэтай датай зрабіў наступнае важнае паведамленне: «Рагвалод жа прыйшоў быў з-за мора і меў уласць сваю ў Полацку. А Тур (сеў) у Тураве, ад яго ж і тураўцы празваліся».

З гэтага вынікае, што ў 960-я гг. разам з Полацкім ужо існавала і Тураўскае княства. На поўначы Тураўскае княства межавала з Полацкай зямлёй.

**3. Адносіны Турава з Кіевам.** Кіеўскі вялікі князь Уладзімір Святаславіч у канцы X ст. накіраваў у найбольш буйныя гарады ўсходніх славян сваіх сыноў у якасці намеснікаў. Горад Тураў дастаўся Святаполку.



*Старажытны Тураў. Рэканструкцыя*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Куды падзеўся Тур, ці існаваў ён у сапраўднасці — застаецца невядомым.

Пасля смерці Уладзіміра ў 1015 г. Святаполк стаў вялікім князем кіеўскім. Адначасова ён захаваў за сабой Тураўскае княства. Затым Тураўскае княства дасталася Ізяславу — сыну кіеўскага князя Яраслава Мудрага.



*Манета (срэбранік) тураўскага князя Святаполка*

Пасля смерці Яраслава ў 1054 г. Ізяслаў сам стаў вялікім кіеўскім князем, але княжанне ў Тураве ён захаваў за сабою. Такім чынам, тураўскія князі ў XI ст. займалі велікакняжацкі прастол у Кіеве, што сведчыць аб цесных адносінах Турава з Кіевам.

**4. Тураўскі князь Юрый Яраславіч.** У сярэдзіне XII ст. пры падтрымцы жыхароў Турава князем стаў унук Святаполка Ізяславіча Юрый Яраславіч, які правіў у **1157—1162 гг.** Ён не хацеў быць у поўнай залежнасці ад Кіева і перастаў падпарадкоўвацца яму. У адказ князь Ізяслаў Давыдавіч, які толькі заняў кіеўскі прастол, арганізаваў у 1157 г. паход на Тураў. Смаленскія, галіцкія і іншыя князі стварылі магутнае войска. Яны разлічвалі, што з ходу змогуць авалодаць горадам. Аднак Тураў выстаяў. Войскі вялікага князя кіеўскага прыступілі да працяглай аблогі. Яна доўжылася 10 тыдняў.

Абарона Турава ў 1157 г. з'явілася важнай падзеяй у гісторыі Тураўскай зямлі. Дзякуючы выключнай стойкасці жыхароў горада і воінскаму майстэрству князя Юрыя Яраславіча, удалося адстаяць самастойнасць Тураўскага княства.

Наступны кіеўскі князь таксама спрабаваў падпарадкаваць сваёй уладзе Тураў, але зноў жа беспаспяхова. Юрый Яраславіч і яго сыны актыўна ўдзельнічалі ў міжусобных войнах, спрабавалі пашырыць межы свайго княства.

**5. Старажытны Пінск.** Істотную ролю ў гісторыі Беларускага Палесся адыгрываў Пінск. У пачатку XI ст. узнікла паселішча на беразе ракі Піны ў тым месцы, дзе яна ўпадае ў Прыпяць. Ад ракі Піна пахо-

Правообладатель Издательский центр БГУ

дзіць назва горада Пінск. Упершыню Пінск (Пінеск) узгадваецца ў летапісе ў 1097 г. Пройдзе менш за адно стагоддзе, і Пінск узвысіцца над Туравам, абыдзе яго ў сваім развіцці.

### Пытанні і заданні

1. Дайце тлумачэнне дат: *980, 1015, 1054, 1097, 1157, 1157—1162.*
2. Пад якой датай у летапісе разам названы Полацк і Тураў?
3. Якімі былі адносіны паміж Кіевам і Туравам?
4. Дзякуючы чаму Тураўскае княства адстаяла сваю самастойнасць?
5. Што садзейнічала хуткаму развіццю Тураўскага княства?
6. Пералічыце і растлумачце даты, звязаныя з гісторыяй існавання Тураўскага княства.
7. Параўнайце Полацкае княства з Тураўскім па наступных крытэрыях: а) месцазнаходжанне; б) першыя звесткі пра гарады; в) паходжанне іх назваў; г) полацкія і тураўскія князі.
8. Што дазволіла ўзвысіцца гораду Пінску?

### ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ

Летапіс сведчыць: «Але (абложаныя) у Тураве біліся моцна, выходзячы з горада, і багата было параненых. І шмат разоў прасіў Юрый Яраславіч, кажучы: „Браце! Дай мне мір з табою“. Але Ізяслаў (кіеўскі князь) таго не жадаў, а ўсяляк прагнуў забраць ад яго Тураў і Пінск. І стаялі яны каля горада дзесяць тыдняў, і настаў мор сярод коней, і таму, не зрабіўшы яму нічога, яны вярнуліся да сябе (дадому), не заключыўшы з ім (Юрыем) міру. І многія пешшу прыйшлі з той вайны».

## § 19. ПАСОЖЖА, БЕРАСЦЕЙСКАЯ ЗЯМЛЯ І ПАНЯМОННЕ

### Успомніце

1. Як называліся аб'яднанні ўсходніх славян, якія рассяліліся ў межах беларускіх зямель?
2. Назавіце плямёны, якія жылі ў беларускіх землях да прыходу славян.
3. Якімі былі адносіны паміж мясцовым насельніцтвам і славянамі ў час славянскай каланізацыі беларускіх зямель?

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

**1. Беларускія гарады ў складзе Смаленскай і Чарнігаўскай земель.** У перыяд рассялення ўсходнеславянскіх плямён у Пасожжы (тэрыторыя басейна ракі Сож) размясціліся радзімічы. Яны занялі паўднёва-ўсходнюю частку беларускіх земель. Цяпер гэта ўсход Гомельскай і Магілёўскай абласцей, а таксама заходнія раёны Бранскай і Смаленскай абласцей Расіі. На тэрыторыю Беларусі прыпадала больш як палова асвоеных радзімічамі земель.

Найбольш значным горадам у землях радзімічаў быў Гомель. Упершыню ў летапісе ён упамінаецца ў 1142 г. На тэрыторыі рассялення радзімічаў у межах Беларусі ўзніклі невялікія гарады: Мсціслаў, Прапошаск (ці Прупой, цяпер Слаўгарад), Крычаў, Чачэрск. У пісьмовых крыніцах яны ўпершыню ўпамінаюцца ў XII ст., але, відаць, існавалі ўжо ў XI ст. Апошнія звесткі пра радзімічаў адносяцца да 1169 г. У XI ст. зямля радзімічаў была ў складзе Чарнігаўскага княства.

На пачатку XII ст. паўночная частка Пасожжа з гарадамі Мсціславам, Крычавам, Прапошаскам адышла ў склад Смаленскага княства. У гэты ж час да яго былі далучаны Копысь і Орша. Паўднёвая частка Пасожжа з гарадамі Гомель, Чачэрск, пазней Рэчыца ўвайшла ў склад Чарнігаўскага княства.

Такім чынам, да сярэдзіны XII ст. зямля радзімічаў была падзелена паміж Чарнігаўскім і Смаленскім княствамі. Таму гісторыя радзімічаў звязана з падзеямі, якія адбываліся ў гэтых княствах.

Старажытны Смаленск быў крэпасцю, буйным цэнтрам рамяства і гандлю, асяродкам культуры. Смаленскае княства з'яўлялася адным з найбольш буйных і магутных ва ўсходнеславянскіх землях.



*Берасцяная грамата з Мсціслава*

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Упрыгожанне з медзі і шкла*

У XII ст. значна ўзвысіўся Гомель. Горад стаў цэнтрам Ніжняга Пасожжа, сталіцай асобнага княства.

У 1180 г. горад радзімічаў — Мсціслаў — таксама становіцца сталіцай княства. Пры археалагічных раскопках у Мсціславе знойдзены каштоўны дакумент пісьменства — берасцяная грамата.

**2. Лёс Берасцейшчыны.** Даўняя Берасцейшчына (Брэстчына) раскінулася па абодва бакі Заходняга Буга. Тут узніклі гарады: Берасце (Брэст), Камянец, Кобрын, Дарагічын (Драгічын) з іх валасцямі. Уся гэта тэрыторыя ўяўляла сабой адзіную вобласць, аб'яднаную вакол галоўнага горада — Берасця. Але самастойнае княства з цэнтрам у Берасці не склалася.

Берасце ўзнікла як крэпасць на мяжы з польскімі ўладаннямі. Першае летапіснае паведамленне пра гэты горад адносіцца да 1019 г. Неаднойчы кіеўскія князі ваявалі з-за яго з Польшчай.



*Старажытнае Берасце. Рэканструкцыя*

Правообладатель Издательский центр БГУ





*Пярсцёнак і шкляныя вырабы з Навагрудка*

Шмат падзей адбывалася на Берасцейшчыне ў сярэднія вякі. У XI ст. горад мог падпарадкоўвацца непасрэдна Кіеву, належаць тураўскім князям, а з сярэдзіны XII ст. быў падначалены валынскім князям. З 1199 г. Берасце знаходзілася ў складзе Галіцка-Валынскага княства.

У горадзе дзейнічала веча, якое вырашала важныя пытанні жыцця горада і воласці.

**3. Узнікненне гарадоў і княстваў у Панямонні.** Самымі старажытнымі гарадамі Панямоння з'яўляюцца Новагародак (Наваградак, цяпер Навагрудак) і Ваўкавыск. Яны ўзніклі ў канцы X ст. Амаль адначасова з імі была заснавана Гародня (Гродна). У яе крэпасці побач з воінамі-дружыннікамі жылі рамеснікі. У XI ст. узнік горад Слонім. Усе пералічаныя гарады ў XII — першай палове XIII ст. сталі цэнтрамі асобных княстваў — Гарадзенскага, Новагародскага, Ваўкавыскага, Слонімскага.

Князі з Гародні падтрымлівалі сувязі з Кіевам. Яны неаднаразова выступалі разам з кіеўскімі князямі ў сумесных паходах супраць качэўнікаў-полаўцаў.

Гародня, Новагародак, Ваўкавыск з'яўляліся багатымі ўсходнеславянскімі гарадамі. У Гародні ў XII ст. былі пабудаваны тры мураваныя царквы і княжацкі палац. Новагародак у пачатку XII ст. таксама стаў забудоўвацца багатымі дамамі. Некаторыя з іх былі двухпавярховымі, з зашклёнымі вокнамі, а асобныя ўпрыгожваліся фрэскамі. У горад трапляў вельмі каштоўны шкляны посуд — кубкі, флаконы і іншыя падобныя рэчы, распісаныя золатам і эмаллю. Яны выраблялiся ў Візантыі і падуладных ёй краях. У тыя часы асабліва вялікай была патрэба ва ўзбраенні гараджан. Яе забяспечвалі мясцовыя кавалі. У Новагародку воіны мелі панцыры — засцерагальнае ўзбраенне, зробленае з жалезных пласцінак.

Дасягнуты ўзровень гаспадарчага і палітычнага развіцця беларускіх зямель быў вышэйшы, чым у літоўцаў. Ён стаў падмуркам далейшых важных з'яў у Беларусі і суседніх землях.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**4. Балцкія суседзі Русі на паўночным захадзе.** На паўночным захадзе ўсходнеславянскіх зямель, якія мелі агульную назву «Русь», рассяляліся балцкія (літоўскія і яцвяжскія) плямёны.

Летапісныя звесткі пра суседзяў Русі на паўночным захадзе вельмі скупыя. Так, напрыклад, першае ўпамінанне ў пісьмовых гістарычных крыніцах пра Літву адносіцца да 1009 г. Ад чаго паходзіць гэта назва і што яна азначае, канчаткова не высветлена.

Усходнія балты, ці лета-літоўцы, не ўвайшлі ў склад Старажытнарускай дзяржавы. Але яны павінны былі плаціць даніну кіеўскім князям, а ў перыяд раздробленасці — Ноўгараду Вялікаму і Полацку. Неаднойчы кіеўскія князі і правіцелі асобных старажытнарускіх княстваў хадзілі паходамі на лета-літоўскія плямёны, каб падпарадкаваць іх. Але яны здолелі адстаяць сваю самастойнасць. У XIII ст. прыбалтыйскае насельніцтва сутыкнулася з больш сур'ёзнай небяспекай. Іх землямі зацікавіліся нямецкія рыцары і каталіцкае духавенства. Гэта патрабавала стварэння больш моцнай арганізацыі для адпору заваёўнікам.

У балтаў да XIII ст. не было гарадоў і пісьменнасці, але ўжо існаваў падзел на знаць і просты народ. Адна група роднасных балцкіх плямён аб'ядналася на чале з князем і стала называцца аўкштайтамі. Другое падобнае аб'яднанне атрымала назву «жамойты». У гэты час балты падышлі вельмі блізка да стварэння дзяржавы.

### Пытанні і заданні

1. Дайце тлумачэнне дат: *1009, 1019, 1142, 1169, 1180, 1199.*
2. Знайдзіце на картасхеме на с. 86 Пасожжа, Берасцейскую зямлю і Панямонне.
3. У межах якіх тэрыторый рассяляліся дрыгавічы і радзімічы?
4. Якія гарады Пасожжа, Берасцейскай зямлі і Панямоння сталі цэнтрамі асобных княстваў?
5. Якую гістарычную ролю ў сярэднія вякі адыгрываў Смаленск?
6. Якое месца ў Старажытнай Русі займала Берасцейская зямля? Якім княствам яна належала?
7. У чым асаблівасці палітычнага і гаспадарчага развіцця тэрыторыі Панямоння?
8. Якімі былі адносіны старажытнарускіх княстваў з суседзямі на паўночным захадзе?

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 20. ЗНЕШНЯЯ НЕБЯСПЕКА Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIII ст.

**Успомніце**

1. Чаму воінаў-манахаў называлі крыжакамі?
2. Што такое духоўна-рыцарскі ордэн?
3. Як называлі кіраўніка рыцарскага ордэна?

**1. З'яўленне крыжакоў ва Усходняй Прыбалтыцы.** У канцы XII ст. нямецкія купцы, рыцары і святары высадзіліся ў вусці Заходняй Дзвіны. Тут у 1201 г. яны заснавалі крэпасць Рыгу (цяпер сталіца Латвійскай Рэспублікі). У іх планах быў захоп тэрыторыі язычніцкіх плямён ліваў, латгалаў і эстаў. На іх землях нямецкія рыцары планавалі пабудаваць феадальную гаспадарку, дзе яны з'яўляліся б гаспадарамі, а падпарадкаванае насельніцтва — іх слугамі.

Нямецкім рыцарам у ажыццяўленні іх планаў дапамагала каталіцкая царква, бо паходы на прыбалтыйскія землі адбываліся пад сцягам барацьбы з язычніцтвам. Іх сумеснымі намаганнямі ў 1202 г. быў створаны ваенна-манаскі Ордэн мечаносцаў.

Полацкаму княству першаму з усходнеславянскіх княстваў давялося сутыкнуцца з грознай і небяспечнай навалай з Захаду — нямецкімі рыцарамі, або ***крыжакамі***. Гэтыя заваёўнікі прыносілі шмат пакут язычнікам. Яны лічылі, што іх дзейнасць патрэбна Богу, што войны з язычнікамі яны вядуць дзеля Хрыстовай веры. Каб замацавацца ў новых месцах, крыжакі хутка будавалі невялікія мураваныя замкі-крэпасці. Замкі былі апорнымі пунктамі для іх далейшага прасоўвання на ўсход і падпарадкавання чужых зямель.



*Крыжакі*

**2. Супрацьстаянне крыжакам.** Заваёўніцкія планы крыжакоў ушчыльную сутыкнуліся з інтарэсамі Полацка. Задоўга да з'яўлення тут нямецкіх рыцараў плямёны ліваў плацілі даніну полацкім князям, а ў час ваенных дзеянняў пастаўлялі дапаможнае войска. Тут жа, у ніжнім

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Князь Уладзімір Полацкі. Скульптура З. Азгура*

цячэнні Заходняй Дзвіны, знаходзіліся гарады-крэпасці Кукенойс і Герцыке (самы аддалены — Кукенойс — размяшчаўся за 340 км ад Полацка).

Гэтымі гарадамі кіравалі князі, залежныя ад полацкага князя. Відаць, гарады ўзніклі на месцах збору даніны з мясцовага неславянскага насельніцтва. З'яўленне тут нямецкіх рыцараў адкрыта пагражала Полацку стратай падуладных яму зямель. Ваеннае сутыкненне стала непазбежным.

Летам **1203 г.** полацкі князь Уладзімір аблажыў дзве нямецкія крэпасці — Ікскюль і Гольм. Крыжакі вымушаны былі адкупіцца грашыма, але па-ранейшаму працягвалі захопы. У 1206 г. князь Уладзімір з вялікім войскам зноў спусціўся на караблях па Дзвіне, каб паспрабаваць авалодаць Гольмам. Аблога працягвалася 10 дзён, аднак крэпасць устаяла.

Паміж рыжскім біскупам і полацкім князем быў заключаны «вечны» мір. Полацкі князь вымушаны быў адмовіцца ад тэрыторыі Ніжняга Падзвіння і ад даніны з яе насельніцтва. І толькі для рускіх купцоў захаваўся, як кажа летапіс, «адкрыты свабодны шлях па Дзвіне». Аднак барацьба палачан супраць крыжакоў на гэтым не скончылася.

У **1216 г.** палачане сумесна з эстамі і літоўцамі рыхтаваліся да новага выступлення супраць нямецкіх рыцараў. Раптоўная смерць полацкага князя Уладзіміра перашкодзіла ажыццявіць паход. Такім чынам, пачынаючы з 1203 г. Полацкае княства ўступіла ў барацьбу з крыжакамі, у якой яно панесла значныя людскія і тэрытарыяльныя страты.

**3. Збліжэнне Полацка і Ноўгарада.** З прычыны крыжацкай пагрозы Полацк шукаў сувязі з Наўгародскай зямлёй, над якой таксама навісла небяспека з боку шведаў. Ваенныя саюзы ў той час часта замацоўваліся шлюбамі. Яскравым сведчаннем таму быў шлюб наўгародскага князя Аляксандра Яраславіча з дачкой полацкага князя Брачыслава.

У хуткім часе шведскае войска ўварвалася ў Наўгародскую зямлю. Рашучая бітва са шведскімі рыцарамі адбылася на рацэ Няве ў 1240 г.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

У гэтай бітве сваёй выключнай адвагай вызначыўся палачанін Якаў, які быў на службе пры княжацкім двары. У жорсткай рукапашнай схватцы Якаў Палачанін, узброены мячом, «...мужна біўся, і пахваліў яго князь». Подзвіг Якава быў нават запісаны ў летапісе, аднак, відаць, і іншыя полацкія віцязі таксама прымалі ўдзел у бітве.



*Неўская бітва 1240 г. Воін з узнятым мячом — Якаў Палачанін. Сярэдневяковы малюнак*

**4. Мангола-татарская навала.** У час барацьбы Полацкага княства і Наўгародскай зямлі з крыжакамі ва ўсходнеславянскія землі ўварваліся не менш небяспечныя заваёўнікі — манголы.

На Русі іх называлі татарамі, а гісторыкі карыстаюцца паняццем ***«мангола-татары»***. Іх радзімай з'яўляліся стэпы Манголіі.

Заснавальнік Мангольскай імперыі — Чынгісхан — завяшчаў сваім нашчадкам заваяваць увесь свет. Мангола-татары здолелі захапіць Кітай, Сярэднюю Азію, Закаўказзе і большую частку рускіх зямель.

Унук Чынгісхана Батый пасля кровапралітных бітваў захапіў і разбурыў гарады Разань, Маскву, Уладзімір на Клязьме, затым Чарнігаў і нарэшце ў 1240 г. — Кіеў. Мангола-татары накіраваліся да Смаленска, аднак потым абышлі яго. Як пацвердзілі археалагічныя раскопкі, заваёўнікі спалілі Гомель.

Летапіс паведамляе, што каля Берасця «быў смурод ад вельмі вялікай колькасці забітых». Несумненна, гэта вынік уварвання на Берасцейшчыну войска захопнікаў у **1241 г.** Асноўная тэрыторыя Беларусі, па шчаслівай выпадковасці, не трапіла пад Батыева нашэсце. Але пагроза заваявання беларускіх зямель мангола-татарамі не знікла.

Вярнуўшыся з паходу ў Еўропу, хан Батый утварыў на Ніжняй Волзе адну з найбуйнейшых дзяржаў сярэдневякоўя — Залатую Арду (адсюль паходзіць назва *«ардынцы»*). Ардынцы працягвалі паходы ва ўсходнесла-

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Ардынскія захопнікі гоняць палонных. Старадаўні малюнак*

вянскія землі. Большасць рускіх зямель знаходзілася ў васальнай залежнасці ад Залатой Арды. Беларускі край аказаўся ў грозпай небяспецы.

Пра барацьбу з татарамі (ардынцамі) захавалася шмат народных паданняў. Паводле аднаго з іх, войска на чале з Койданам рухалася на Менск (Мінск). На шляху заваёўнікаў знаходзіўся горад Крутагор'е. Тут адбылася бітва. Мангольскі военачальнік загінуў. І быццам бы з гэтай нагоды горад перайменавалі ў Койданава (цяпер горад Дзяржынск Мінскай вобласці).

Пісьмовыя крыніцы змяшчаюць паведамленні аб шматлікіх паходах ардынцаў у другой палове XIII ст. у беларускія, украінскія і літоўскія землі. Галоўнымі мэтамі ардынцаў былі захоп людзей у палон, продаж іх у рабства і рабаванне мясцовага насельніцтва.

Заваяваць і падпарадкаваць сабе беларускія землі ардынцам не ўдалося. У саюзе з князямі заходніх зямель Русі знаходзіліся літоўскія князі, якія мелі добра ўзброеныя ваенныя сілы. Беларускія землі і Літва захавалі сваю незалежнасць і не зведалі цяжкага ардынскага ярма.

### Пытанні і заданні

1. Дайце тлумачэнне дат: *1201, 1202, 1203, 1216, 1240, 1241.*
2. Растлумачце паняцці: *крыжакі, мангола-татары, ардынцы.*
3. Чаму знешняя небяспека ўзрасла ў перыяд раздробленасці?
4. З якой мэтай нямецкія рыцары заснавалі крэпасць Рыгу?
5. Назавіце сапраўдную мэту прасоўвання крыжакоў на Усход. Пад якім выглядам гэтая мэта хавалася?
6. Чаму сутыкненне Полацка з крыжакамі стала непазбежным? Якія вынікі гэта мела для Полацкай зямлі?

Правообладатель Издательский центр БГУ

7. Якія беларускія гарады пацярпелі ад мангола-татараў?
8. Чаму мангола-татары не падпарадкавалі беларускія землі?

ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ

**Абаронцы Радзімы**

На пярэднім краі абароны Полацкай зямлі ад крыжакоў апынуўся горад-крэпасць Кукенойс. У ім княжыў Вячка (Вячаслаў), які паходзіў з дынастыі полацкіх князёў.

Не раз сутыкаўся князь з заваёўнікамі. Нямецкія рыцары называлі яго «сапраўдным д'яблам». Каб дасягнуць сваіх мэт, крыжакі часам вялі перамовы з прадстаўнікамі мясцовага насельніцтва. Так, жыхары Кукенойса знішчылі атрад захопнікаў, які здолеў трапіць у горад «мірным» шляхам.

Вячка папрасіў дапамогі ў полацкага князя Уладзіміра. Не дачакаўшыся яе, Вячка спаліў свой замак і з дружынай перайшоў у суседнія землі. Абараняцца ў Кукенойсе ў яго не было магчымасці.

На чале атрада з 200 чалавек Вячка пайшоў у горад Юр'еў (Тарту) дапамагаць эстам у барацьбе з крыжакамі. У 1224 г. пры штурме горада рыцарамі Вячка адмовіўся здацца ворагам і геройчна загінуў у апошнім баі.

## § 21. ГАСПАДАРЧЫЯ АДНОСІНЫ

**Успомніце**

1. Якія заняткі першабытных людзей папярэднічалі ўзнікненню земляробства і жывёлагадоўлі?
2. Што такое родавая абшчына?
3. Якія крыніцы рабства існавалі ў Старажытнай Грэцыі і Рыме?

**1. Сельская (суседская) абшчына.** З'яўленне больш дасканалых прылад працы (саха, рала, барана), выкарыстанне цяглавой сілы (быкі, коні) садзейнічала павелічэнню прадукцыйнасці працы. ***Прадукцыйнасць працы*** — гэта колькасць выробленай прадукцыі за адзінку часу.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Цяпер асобная сям'я магла пракарміць сябе сама. Вялікія патрыярхальныя сем'і саступілі месца малым. На змену родаваму ладу прыйшла *сельская (суседская) абшчына*, якая складалася з асобных сямейных сялянскіх гаспадарак.

У сельскай абшчыне існавала калектыўнае (абшчыннае) землекарыстанне — валоданне раллёй, пашай, а таксама лесам і вадаёмамі. Прылады працы знаходзіліся ва ўласнасці кожнай сям'і.

Сям'я атрымлівала ў карыстанне асобны ўчастак зямлі — зямельны надзел. Але спачатку яна не мела права распараджацца ім. Зямля належала абшчыне.

Абшчына ў славян называлася ***«верв»***. Назва гэта паходзіць ад слова «вяроўка», якой адмяралі ўчасткі зямлі, што належалі членам абшчыны. Кожная абшчына выбірала старасту. Ён быў абавязаны клапаціцца пра агульныя інтарэсы абшчыннікаў.

**2. Гаспадарчыя заняткі.** Удасканаленне прылад працы і пераход да суседскай абшчыны былі звязаны з далейшым развіццём земляробства і жывёлагадоўлі. Падсечна-агнявое земляробства канчаткова было выцеснена ворным у форме двухполля ці трохполля. Пры такім земляробстве зямлю дзялілі на дзве або тры часткі. Палова або трэць поля «адпачывала», а на іншых сеялі ярыну, азімыя культуры. Частка поля адводзілася пад агародныя культуры.


*Ворыва сахой. Старадаўні малюнак*

Галоўнымі прыладамі апрацоўкі глебы заставаліся драўляная саха з жалезнымі наканечнікамі і рала з металічнымі нарогамі. Акрамя ворных прылад выкарыстоўваліся таксама ручныя прылады апрацоўкі зямлі: драўляныя рыдлёўкі з металічнымі акоўкамі і жалезныя матыкі. У X—XIII стст. на беларускіх землях былі распаўсюджаны амаль усе вядомыя ў наш час культуры — жыта, пшаніца, ячмень,

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Вертыкальны ткацкі станок*

проса, авёс, грэчка, боб, сачавіца. Для вырабу адзення вырошчвалі лён і каноплі. Ураджай збіралі жалезнымі сярпамі, зерне малацілі драўлянымі цапамі і малолі на муку пры дапамозе каменных жорнаў.

Важнае месца займала агародніцтва. Нашы продкі вырошчвалі капусту, рэпу, цыбулю, буракі, агуркі. З садовых дрэў былі вядомы сліва і вішня.

Вялікая роля ў харчаванні жыхароў беларускіх зямель належала жывёлагадоўлі. Як і раней, разводзілі буйную рагатую жывёлу і свіней. У X—XIII стст. насельніцтва тэрыторыі Беларусі займалася птушкагадоўляй. Славяне разводзілі курэй, качак, гусей.

Важным дадаткам да земляробства і жывёлагадоўлі заставаліся паляванне і збіральніцтва. У некаторых беларускіх гарадах паляванне служыла асноўнай крыніцай здабывання мяса. Палявалі як на буйных жывёл (зубр, лось, мядзведзь, дзік), так і на дробную дзічыну і нават на птушак. Паляванне мела значэнне не толькі для харчавання, але і для здабывання каштоўнага і цёплага футра.

Шырока практыкавалася рыбалоўства. У вадаёмах на нашых землях вадзіліся розныя віды рыбы, у тым ліку такія каштоўныя, як асяцёр, ласось, вугор і інш. Рыбу лавілі як летам, так і зімой пры дапамозе кручкоў, блешняў, нератаў, восцяў. Рацыён нашых продкаў узбагачаўся таксама за кошт збірання грыбоў, ягад, дзікіх пладоў, арэхаў.

Значнае месца сярод промыслаў займала бортніцтва, якое давала два каштоўныя прадукты — мёд і воск. Мёд цаніўся надзвычай высока, бо цукру ў тыя часы яшчэ не ведалі. Яго ўжывалі не толькі ў натуральным выглядзе, але і для прыгатавання напояў. Воск ішоў на выраб свечак, неабходных у царкоўнай справе. Свечкі выкарыстоўвалі і для асвятлення багатых дамоў. На мёд і воск існаваў таксама попыт у Візантыі і іншых краінах.

Пэўнага ўзроўню дасягнула рамяство. Яму папярэднічалі хатнія промыслы, калі сяляне самі выраблялі неабходныя ў гаспадарцы рэчы — больш простыя прылады працы, адзенне і абутак. Жанчыны

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Падкованападобная фібула для адзення*

пралі і ткалі. Аднак паступова вылучыліся рамеснікі — спецыялісты па вырабе таго ці іншага віду прадукцыі. Надзвычай важным было кавальскае рамяство, бо яно патрабавала асаблівага абсталявання — кузні, мяхоў, набору інструментаў, а таксама спецыяльных навыкаў. Займацца кавальствам мог далёка не кожны, а жалезныя прылады працы былі неабходныя ў кожнай хаце. Таму кавалі карысталіся асаблівай павагай. Была наладжана апрацоўка каляровых металаў (медзь, волава, свінец), з якіх выраблялі ўпрыгожанні.

У X ст. на нашых землях распаўсюдзіўся ганчарны круг, што дазволіла палепшыць якасць глінянага посуду. У выніку ганчарства таксама вылучылася ў самастойны від рамяства.

**3. Даніна і палюддзе ў IX—XI стст.** Князь, набліжаныя да яго людзі, дружына павінны былі знайсці сабе харчовае забеспячэнне, паколькі яны не ўдзельнічалі ў непасрэднай вытворчасці прадуктаў. Больш таго, княжацкая пасада прадугледжвала вылучэнне князя з астатняга грамадства адзеннем, дарагімі коньмі і інш. Князю заўсёды патрабаваліся сродкі для вядзення войнаў, прыёму замежных пасольстваў і г. д. Галоўным шляхам (але не адзіным) задавальнення запатрабаванняў князя і яго асяроддзя з'яўляўся збор даніны.

Князь са сваёй дружынай з'яўляўся ў паселішча і патрабаваў ад жыхароў даніну. Падуладнае яму насельніцтва несла футра, мёд, воск, прадукты харчавання. Пры зборы даніны князь разглядаў скаргі сваіх падуладных, вяршыў суд і караў вінаватых.



*Княжацкі дружыннік*

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

Сабраўшы даніну ў адным месцы, князь з дружынай пераязджаў у іншае. Збор князем даніны з насельніцтва называўся ***палюддзем***.

Палюддзе патрабавала асабістай прысутнасці князя. З развіццём дзяржавы і пашырэннем абавязкаў князя гэта станавілася немагчымым. Даніну сталі прывозіць у асобыя пункты — *пагосты*. З прыняццем хрысціянства дзесятую частку сваіх даходаў князь аддаваў царкве.

**4. Грашовае абарачэнне.** Праз беларускія землі праходзіў летапісны гандлёвы шлях «з варагаў у грэкі». Гэта садзейнічала актыўнаму развіццю ўнутранага і знешняга гандлю. Замежныя купцы былі даволі частымі гасцямі ў беларускіх гарадах. У некаторых гарадах нават існавалі іх пастаянныя паселішчы. Актыўны гандаль садзейнічаў больш хуткаму развіццю грашовага абарачэння. Сведчаннем таму з'яўляюцца шматлікія скарбы манет і зліткаў серабра, знойдзеныя на тэрыторыі Беларусі.

У IX—X стст. асноўнай грашовай адзінкай у беларускіх землях быў арабскі дырхем. Гэта сярэбраная манета вагой 2,5—4 г. Скарбы такіх манет сустракаюцца пераважна ў Падзвінні і Падняпроўі.

З канца X да канца XI ст. замест арабскага дырхема сталі выкарыстоўваць заходнееўрапейскі дэнарый. Дэнарый — гэта сярэбраная манета вагой 1,8—1,9 г. Шматлікія скарбы такіх манет былі знойдзены на тэрыторыі Беларусі. Большасць гэтых манет паходзіць з Германіі і Англіі. Ёсць манеты дацкія, французскія, візантыйскія, чэшскія, венгерскія і інш.

Найбольшая колькасць скарбаў з манетамі IX—XI стст. выяўлена на тэрыторыі Полацкай зямлі. Выгаднае геаграфічнае становішча садзейнічала ўдзелу Полацка і Віцебска ў актыўным міжнародным гандлі.

Аднак у канцы XI ст. прыток дэнарыяў ва ўсходнеславянскія зем-



*Скарб, знойдзены каля вёскі Вішчын Рагачоўскага раёна. Уключаў літоўскія, кіеўскія і наўгародскія сярэбраныя злiткі*

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

лі спыніўся. Надышоў так званы безманетны перыяд XII—XIII стст. Ён характарызуецца абарачэннем зліткавага серабра. Атрымалі распаўсюджанне своеасаблівыя грошы — сярэбраныя злішкі: літоўскія, ці заходнерускія, вагой звыш 100 г і кіеўскія вагой каля 165 г. Значна радзей на беларускіх землях сустракаюцца наўгародскія злішкі (каля 200 г). У пісьмовых крыніцах сярэбраныя злішкі называюцца грыўнямі.

**Гэта цікава.** Летапіс паведамляе, што менскі князь Глеб Усяславіч і яго жонка завяшчалі Кіева-Пячэрскаму манастыру 600 грыўняў серабра і 50 грыўняў золата. Гэта выплата была зроблена ў наўгародскіх грыўнях.

Грыўні з'яўляліся асноўнымі грашовымі і вагавымі адзінкамі на тэрыторыі Беларусі да пачатку XIV ст., аднак знойдзена іх няшмат. З іх дапамогай нельга было ажыццяўляць паўсядзённыя дробныя гандлёвыя аперацыі. Гісторыкі лічаць, што ў гэты час быў распаўсюджаны прамы абмен прадуктамі або гандаль з выкарыстаннем шкурак пушных звяркоў. Таму перыяд XII—XIII стст. і называюць безманетным.

**5. Узнікненне феадальных адносін.** У выніку распаду першабытнага грамадства ўзнікалі рабаўладальніцкія і феадальныя адносіны. Багатыя землеўладальнікі — князі, баяры — захоплівалі ўсё больш абшчынных зямель. Свабодныя земляробы станавіліся залежнымі ад іх. Паступова землеўладальнікі падпарадкоўвалі сабе цэлыя сёлы.



*Сядзіба баярына. Рэканструкцыя*

Правообладатель Издательский центр БГУ

Узніклі сядзібы баяр, з'явіліся княжацкія і баярскія сёлы. Цэнтрам сядзібы быў княжацкі або баярскі двор. Існаванне баярскіх двароў і сёл сведчыць аб развіцці феадальных адносін у Беларусі, узнікненні багатых землеўласнікаў і залежных ад іх сялян. Найбольш актыўна гэта пачало адбывацца ў XII ст.

У пісьмовых крыніцах XI—XII стст. часта сустракаецца слова ***«чэлядзь»***. Спачатку чалядзінамі называлі рабоў. Затым чэляддзю сталі лічыць усіх людзей, якія былі залежнымі ад свайго гаспадара і жылі ў яго сядзібе.

Сярод чэлядзі былі людзі, якія поўнасцю страцілі асабістую свабоду. У дакументах яны называюцца ***халопамі***. Па сваім становішчы халопы былі рабамі. Залежныя паўсвабодныя сяляне называліся ***смердамі***. Смерды мелі асабістую свабоду, аднак зямля, на якой яны працавалі, належала князю.

Абшчыннікі траплялі ў залежнасць рознымі шляхамі. Напрыклад, у сувязі з неўраджаем селянін мог звярнуцца да багатага чалавека і ўзяць у яго ку́пу (пазыку). Такі селянін станавіўся залежным і называўся *за́купам*.

Такім чынам, далейшае развіццё маёмаснай няроўнасці паступова вяло да фарміравання розных груп насельніцтва. Разам са свабоднымі абшчыннікамі і багатымі землеўласнікамі існавалі чэлядзь, халопы і іншыя залежныя сяляне. Развіццё феадальных адносін доўгі час яшчэ спалучалася з існаваннем рабскай залежнасці.

### Пытанні і заданні

1. Растлумачце паняцці: *прадукцыйнасць працы, сельская (суседская) абшчына, палюддзе, пагост, чэлядзь, халоп, смерд, закуп.*
2. Якую ролю адыгрывала абшчына ў Старажытнай Русі?
3. Чым быў выкліканы распад вялікай патрыярхальнай сям'і?
4. Пералічыце характэрныя рысы сельскай (суседскай) абшчыны.
5. Па якой прычыне ўзнікла даніна?
6. Выкажыце сваё меркаванне аб паходжанні назвы «палюддзе».
7. Што ўяўляла сабой грашовае абарачэнне на беларускіх землях у IX—XI стст.?
8. Чаму перыяд XII—XIII стст. называюць безманетным?
9. Як праяўляліся феадальныя адносіны на беларускіх землях у сярэдневякоўі?
10. Назавіце асноўныя групы залежных людзей ва ўсходніх славян у XII ст.

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 22. ГОРАД У IX — СЯРЭДЗІНЕ XIII ст.

**Успомніце**

1. З каго складалася насельніцтва сярэдневяковых гарадоў у краінах Заходняй Еўропы?
2. Чым займаліся гараджане?
3. Чаму сярэдневяковыя гарады былі ўмацаванымі?

**1. Шляхі ўзнікнення гарадоў.** Нашы продкі будавалі свае паселішчы і абносілі іх агароджай. Ад слоў «гарадзіць», «абгароджваць» і паходзіць назва «горад». Першапачатковы ***горад*** — гэта ўмацаванае паселішча.

Паколькі ў гарадах жылі ў асноўным рамеснікі і купцы, то горад мог узнікнуць там, дзе можна было займацца гандлем і рамяством: на берагах рэк, у зручных для прыстані вусцях, каля пераправаў праз рэкі, на скрыжаванні дарог.

**2. Першыя летапісныя ўпамінанні беларускіх гарадоў.** У сярэдневяковых пісьмовых крыніцах названа больш за 30 гарадоў на тэрыторыі Беларусі. Будаваліся яны ў розны час, таму ўзрост іх розны.

Самым старажытным беларускім горадам лічыцца Полацк. Першае летапіснае ўпамінанне аб ім адносіцца да IX ст.

Вось як выглядае пералік гарадоў, калі іх размясціць па ўзросце (па стагоддзях) паводле пісьмовых крыніц і летапісаў:

X ст. — Тураў (980 г.), Ізяслаўль (Заслаўе), Віцебск;



*Старажытны славянскі горад. Рэканструкцыя*

Правообладатель Издательский центр БГУ

XI ст. — Берасце (Брэст), Менск (Мінск) (1067 г.), Лукомль, Лагойск, Друцк, Орша, Копысь, Браслаў, Пінск;

XII ст. — Барысаў, Слуцк, Клецк, Прапошаск (Слаўгарад), Крычаў, Гомель, Рагачоў, Чачэрск, Брагін, Гародня (Гродна), Мазыр, Мсціслаў;

XIII ст. — Рэчыца, Ваўкавыск, Новагародак (Навагрудак), Кобрын, Капыль, Слонім, Магілёў.

Але на самай справе многія гарады ўзніклі раней, чым звесткі аб іх трапілі ў летапісы.

**3. Паходжанне назваў.** Назвы вельмі старажытных гарадоў Беларусі паходзяць ад назваў рэк, на берагах якіх яны ўзнікалі: Полацк — Палата, Мінск (Менск) — Менка, Віцебск — Віцьба, Друцк — Друць, Пінск — Піна, Слуцк — Случ і інш.

Ёсць гарады, назвы якіх паходзяць ад імён князёў, што іх заснавалі або жылі там. Гэта Тураў, Ізяслаўль (цяпер Заслаўе), Браслаў, Барысаў. Пра горад Барысаў ёсць цікавае паведамленне. У ім гаворыцца аб тым, што князь Барыс заснаваў яго ў 1102 г., насяліў палоннымі і назваў «у сваё імя».

Горад Навагрудак (Новагародак) паведамляе нам аб сваім узросце (Новы горад). Брэст (у мінулым Берасце) ушаноўвае назву пароды дрэва — бераст. А Камянец «ганарыцца» сваім збудаваннем — каменнай вежай. Назва горада — гэта часцінка яго гісторыі. Вось чаму цікава ведаць, адкуль яна паходзіць.

**4. Выгляд гарадоў.** У Беларусі гарады IX—XIII стст. былі выключна драўлянымі. Унутраная частка горада называлася «дзядзінец». ***Дзядзінец*** — гэта ўмацаваны валамі, равамі, сценамі цэнтр старажытнага горада. Назва «дзядзінец» утворана ад слова «дзед». Дзядзінцы старажытных гарадоў былі месцамі збору старэйшын — дзядоў. Каля ўмацаванага цэнтра ўзнікалі новыя паселішчы рамеснікаў і гандляроў. Яны называліся пасадамі. ***Пасад*** — гэта паселішча гараджан.

Важным грамадскім месцам горада быў рынак — *торг*. Звычайна ён размяшчаўся на беразе ракі недалёка ад дзядзінца. Вуліцы былі вузкімі, каля 3 м у шырыню.

У гарадах сваім знешнім выглядам значна выдзяляліся нешматлікія будынкі з каменю і цэглы. Гэта былі саборы і цэрквы, дзе людзі маліліся Богу. ***Сабор*** — галоўная царква горада. Сустракаліся таксама каменныя княжацкія церамы (палацы).

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Рамесныя вырабы: ключы і замок з раскопак Мінска*

У гарадах жылі князі, дружыннікі, баяры, іх слугі або чэлядзь. Але ў асноўным насялялі гарады рамеснікі і купцы. Рамеснікі падзяляліся на залежных і свабодных. Залежныя рамеснікі (княжацкія або баярскія) жылі ў дзядзінцах і абслугоўвалі сваіх гаспадароў. Свабодныя рамеснікі прадавалі свае вырабы на рынку.

У гарадах і побач з імі існавалі манастыры, пры якіх знаходзіліся цэрквы. Сярод жыхароў гарадоў былі манахі і святары.

**5. Рамяство і гандаль.** Буйныя гарады паступова ператвараліся ў цэнтры рамеснай вытворчасці. ***Рамесная вытворчасць*** — гэта выраб розных прадметаў ручным спосабам. У гарадах атрымалі больш шырокае развіццё кавальскае, ювелірнае, ганчарнае, гарбарнае (апрацоўка скур), шавецкае, бандарнае (выраб бочак) і іншыя рамёствы. У малых гарадах людзі займаліся і рамяством, і сельскай гаспадаркай. Пра сярэдневяковы горад гаварылі, што ён быў «напалову забудаваны, а напалову засеяны».

У беларускія гарады з Візантыі і краін Блізкага Усходу паступалі дарагія тканіны, пацеркі для маністаў, шкляны посуд. У вялікіх гліняных пасудзінах — амфарах — дастаўляліся віно і аліўкавы алей. Такія вырабы траплялі ў гарады ў невялікай колькасці. Яны ішлі на патрэбы княжацкага двара, буйных феадалаў, багатых гараджан.

З гарадоў вывозіліся футра, воск, мёд, сабраныя ў якасці даніны з падуладнага князю насельніцтва, а таксама рабы, захопленыя ў час войнаў.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**6. Роля гарадоў у грамадскім жыцці.** Узнікненне гарадоў — вынік аддзялення рамяства ад сельскай гаспадаркі. Рамесніцкія вырабы неабходна было абменьваць або прадаваць, што садзейнічала развіццю гандлю. Дзякуючы гандлю гарады падтрымлівалі эканамічныя сувязі з вёскамі, а таксама з замежнымі краінамі.

Пераважная большасць гарадоў мела абарончыя збудаванні. Гарады ў той час былі важнымі пунктамі абароны, насельніцтва іх пры неабходнасці магло стаць у шэрагі апалчэння.

У перыяд раздробленасці гарады сталі цэнтрамі асобных княстваў — валасцей. У іх жыў князь і яго службовыя асобы. Адсюль князь кіраваў сваёй воласцю. Таму гарады з'яўляліся адміністрацыйнымі цэнтрамі.

Пасля прыняцця хрысціянства ў гарадах будаваліся цэрквы і саборы, узнікалі манастыры, а пры іх — школы для дзяцей. Такім чынам, гарады выконвалі яшчэ ролю цэнтраў культуры.




**Пытанні і заданні**

1. Растлумачце паняцці: *горад, дзядзінец, пасад, торг, сабор, рамесная вытворчасць*.
2. У якіх месцах узнікалі гарады?
3. Якое паходжанне маюць назвы некаторых найбольш старажытных беларускіх гарадоў?
4. З дапамогай матэрыялаў пункта 2 прадоўжыце запаўненне лікавага ланцужка: IX ст. — 1 горад, X ст. — 3, XI ст. — ?, XII — ?, XIII ст. — ?, усяго гарадоў — ?
5. Якія віды рамяства атрымалі найбольшае распаўсюджанне ў гарадах?
6. Якія катэгорыі насельніцтва жылі ў гарадах?
7. У чым заключаецца грамадская роля гарадоў?

Правообладатель Издательский центр БГУ

8. Складзіце вусна ці пісьмова апавяданне «Падарожжа па сярэдневяковым горадзе».
9. Запоўніце табліцу.

| Знешні гандаль | |
|---|---|
| Тавары ўвозу | Тавары вывазу |
| | |

# § 23. ХРЫСЦІЯНСТВА НА ЗАХОДНІХ ЗЕМЛЯХ СТАРАЖЫТНАЙ РУСІ

**Успомніце**

1. Калі ўзнікла хрысціянства?
2. Чаму яно атрымала такую назву?
3. Што прымусіла кіеўскага князя Уладзіміра Святаславіча шукаць замену язычніцкім вераванням жыхароў сваёй дзяржавы?

**1. Прычыны прыняцця хрысціянства.** Язычніцтва мела глыбокія старажытныя карані на славянскіх землях. Яно давала свае адказы на пытанні аб паходжанні свету, людзей, розных прыродных з'яў і г. д. Але ў X ст. рэлігійныя ўяўленні нашых продкаў пачалі змяняцца.

Чым гэта было выклікана? У тыя часы ўзнікалі першыя дзяржаўныя ўтварэнні, усталёўвалася княжацкае адзінаўладдзе, развіваліся земляробства, гандаль, рамяство. Усё гэта выклікала патрэбу ў ведах, пісьменнасці, новых поглядах. Узнікла неабходнасць у цесных сувязях з іншымі дзяржавамі, перш за ўсё з Візантыйскай імперыяй, дзе вызнавалі хрысціянства. Хрысціянская вера адпавядала патрабаванням дзяржаўнай улады, паколькі абавязвала падпарадкоўвацца ўладзе, дадзенай ад Бога.

Найбольш важнай гістарычнай вяхой у распаўсюджанні хрысціянства сярод усходніх славян быў **988 г.** У гэты год вялікі князь кіеўскі Уладзімір Святаславіч прымусіў кіяўлян хрысціцца, прыняць хрысціянскую веру. Гэта падзея лічыцца пачаткам распаўсюджання хрысціянства ва ўсіх усходніх славян.

**2. Першыя хрысціяне беларускіх зямель.** Верагодна, першымі хрысціянамі ў Полацкім княстве былі Рагнеда і яе сын Ізяслаў. Летапіс свед-

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ

чыць, што Рагнеда перад смерцю ў 1000 г. была пастрыжана ў манашкі пад імем Анастасія. З летапісу таксама вядома, што і князь Ізяслаў быў вельмі набожным чалавекам і старанна чытаў рэлігійныя кнігі.

Пасля прыняцця хрысціянства Руссю ў 988 г. колькасць хрысціян сярод усходніх славян хутка павялічвалася. Паўсюдна, дзе жылі людзі, будаваліся цэрквы. Вядома, што першыя драўляныя цэрквы ў Полацку і Друцку былі прысвечаны Багародзіцы — маці Ісуса Хрыста.

Першыя манастыры на беларускіх землях узніклі толькі ў XII ст. У манастырах з'явіліся ***манахі*** — члены царкоўнай абшчыны, якія давалі абяцанне весці строгі лад жыцця з адмаўленнем ад матэрыяльных выгод і жыццёвых уцех.



*Святыя Барыс і Глеб. Абразок XII ст.*

**Гэта цікава.** Найбольш ранні манастыр быў пабудаваны каля Полацка ў пачатку XII ст. адным з полацкіх князёў, магчыма, Барысам Усяславічам. Манастыр знаходзіўся ля невялікай рэчкі Бельчыца і быў прысвечаны першым рускім святым Барысу і Глебу. Адсюль яго назва — Бельчыцкі Барысаглебскі манастыр. Узорам для яго паслужыў Кіева-Пячэрскі манастыр.

Адразу пасля прыняцця хрысціянства ў Старажытнарускай дзяржаве пачалося фарміраванне царкоўнай арганізацыі. На чале яе стаяў *мітрапаліт*, які знаходзіўся ў Кіеве. Руская *мітраполія* падзялялася на *епархіі*, якімі кіравалі ***епіскапы***. Да пачатку XIII ст. на Русі было створана 16 епархій, і сярод іх Полацкая і Тураўская. Гісторыкі мяркуюць, што ў Полацку епархія ўзнікла **каля 992 г.** Імёны першых полацкіх

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Амулет-змеявік, у якім спалучыліся хрысціянскія і язычніцкія матывы*

епіскапаў засталіся невядомымі. Толькі ў пачатку XII ст. узгадваецца полацкі епіскап Міна. Епархія ў Тураўскім княстве была заснавана ў **1005 г.** Першым яе епіскапам называецца Фама.

**3. Язычніцтва і хрысціянства.** З прыняццем хрысціянства пачалося шырокае будаўніцтва цэркваў і манастыроў. Так, у XII ст. у адным толькі Полацку было пабудавана не менш за дзесяць мураваных (каменных) цэркваў і заснавана тры манастыры. Драўляных цэркваў будавалі намнога больш, чым каменных. Поспехі царкоўнага будаўніцтва былі відавочнымі.

Іншая справа — укараненне хрысціянскай веры ў свядомасці людзей. Ім было вельмі складана парваць са звыклай язычніцкай верай, асабліва гэта датычыла сельскага насельніцтва. Вярхі грамадства (князі, баяры, княжацкія дружыннікі) і жыхары гарадоў хутчэй прымалі новую веру.

І пасля хрышчэння ўсходнія славяне доўгі час адзначалі язычніцкія святы і нават таемна маліліся старым багам. Старажытнарускі летапіс узгадвае аб з'яўленні і праз сто гадоў пасля хрышчэння Русі язычніцкіх жрацоў — валхвоў.

**Гэта цікава.** Адгалоскі язычніцкіх вераванняў захаваліся і ў княжацкім асяроддзі. Так, лічылася, што князь Усяслаў Брачыславіч нарадзіўся ад «валхвавання». Нават у творы, складзеным у канцы XII ст., — «Слове пра паход Ігаравы» — полацкі князь называецца «валхвом». Пад імем Волха Усяславіча ён застаўся вядомым у народных былінах.

Такім чынам, у сувязі з прыняццем хрысціянства на змену язычніцтву прыходзіла новая вера, але працэс гэты ішоў марудна. У выніку працяглы час на беларускіх землях існавала ***дваяверства*** — становішча, калі частка насельніцтва, якая прыняла хрысціянства, па-ранейшаму пакланялася язычніцкім багам.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**4. Вынікі і значэнне распаўсюджання хрысціянства.** Перш за ўсё хрысціянская вера ўзвышала чалавека над прыродай. Толькі чалавеку, вучыла царква, Бог даў розум і душу.

Вера ў вечнае жыццё, імкненне трапіць у рай натхнялі людзей рабіць дабро, дапамагаць бедным, цярпліва пераносіць пакуты зямнога жыцця.

*Хрысціянскія запаведзі* — шануй бацьку твайго і маці тваю, не забі, не ўкрадзі, не падмані — садзейнічалі ўсталяванню добрых адносін паміж людзьмі. З прыходам хрысціянства зніклі ахвярапрынашэнні (у тым ліку і чалавека), кроўная помста, мнагажонства.

Распаўсюджанне хрысціянства садзейнічала развіццю пісьменнасці і адукацыі. Пры цэрквах і манастырах адкрываліся школы, перапісваліся кнігі. Царкоўнікі былі не толькі самымі адукаванымі людзьмі, але і дарадчыкамі ў справах.

На беларускіх землях разгарнулася будаўніцтва мураваных храмаў. Саборы, цэрквы і манастыры сталі самымі прыгожымі і велічнымі будынкамі таго часу. Іх хараство далучала веруючых людзей да высокага мастацтва, уносіла ў іх паўсядзённае жыццё радасць пазнання прыгожага.

Для забеспячэння патрэб царквы князі выдзялялі дзесятую частку ўсіх сваіх даходаў — з даніны, судовых штрафаў, мытных пошлін і г. д. Але гэтая *царкоўная дзесяціна* дадатковым цяжарам клалася на плечы земляробаў, рамеснікаў, гандляроў. З цягам часу царква набыла землі з залежнымі сялянамі і такім чынам ператварылася ў феадала.

Тым не менш новая хрысціянская рэлігія, якая змяніла на землях усходніх славян язычніцтва, мела вельмі вялікае значэнне для развіцця грамадства.

### Пытанні і заданні

1. Дайце тлумачэнне дат: *988, каля 992, 1005*.
2. Растлумачце паняцці: *манах, мітрапаліт, епіскап, дваяверства, хрысціянскія запаведзі, царкоўная дзесяціна*.
3. Назавіце асноўныя прычыны распаўсюджання хрысціянства на беларускіх землях.
4. Адкуль і якім чынам пранікала хрысціянская вера ў Беларусь?
5. Раскажыце аб першых хрысціянах у Полацкім княстве.
6. Якія царкоўныя епархіі існавалі на беларускіх землях?

Правообладатель Издательский центр БГУ

7. Згадзіцеся, што ўвесь матэрыял тэмы можна назваць адным словам «хрысцiянізацыя». Паспрабуйце даць гэтаму слову ўласнае вызначэнне. Пастарайцеся, каб яно было па магчымасці кароткім.
8. Якімі былі вынікі і значэнне прыняцця хрысціянскай веры?

## § 24. РЭЛІГІЙНА-АСВЕТНІЦКІЯ ДЗЕЯЧЫ

### Успомніце

1. Хто клапаціўся аб распаўсюджанні хрысціянства ў Беларусі ў X—XI стст.?
2. Чаму хрысціянскай царкве былі патрэбны адукаваныя людзі?

**1. Хрысціянская царква і культура.** Хрысціянская вера прыйшла на землі ўсходніх славян з Візантыі. З гэтай краіны прыехала шматлікае духавенства, каб хрысціць усходнеславянскіх язычнікаў. Святары былі заснавальнікамі першых хрысціянскіх храмаў і манастыроў, вялі ў іх набажэнствы. Пры храмах і манастырах ствараліся школы. З Візантыі, а таксама з Балгарыі паступалі кнігі, неабходныя для набажэнства.

Прыняцце хрысціянства аказала значны ўплыў на развіццё культуры ўсходніх славян. Мураванае дойлідства, іканапіс, фрэскавы жывапіс з'явіліся на беларускай зямлі дзякуючы хрысціянству. Адразу пасля хрышчэння на Русі асвойвалася славянская пісьменнасць. Адбылося гэта таму, што ў свой час візантыйскія місіянеры, браты Кірыла і Мяфодзій, і іх вучні склалі славянскую азбуку і пераклалі кнігі для набажэнства. Праз пасрэдніцтва Візантыі ўсходнія славяне змаглі азнаёміцца са здабыткамі антычнай культуры.



*Малюнак святой са Спаса-Ефрасіннеўскай царквы ў Полацку*

**2. Ефрасіння Полацкая.** Князёўна Прадслава нарадзілася каля 1104 г. у княжацкай сям'і. Яна была ўнучкай знакамітага полацкага князя Усяслава Брачыславіча і дачкой яго малодшага сына Святаслава.

Правообладатель Издательский центр БГУ



Ефрасіння Полацкая

Юная князёўна зачароўвала ўсіх сваёй незвычайнай прыгажосцю. Да яе зачасцілі сваты. Бацька меў намер заручыць дачку з якім-небудзь княжычам. Калі Прадслава даведалася пра гэта, то тайна збегла з дому ў жаночы манастыр. Там яна атрымала новае імя — Ефрасіння.

Крыху пазней Ефрасінні дазволілі жыць у саборы Святой Сафіі. «І ўвайшла яна туды... і пачала пісаць кнігі сваімі рукамі, і прыбытак ад продажу іх аддавала тым, хто быў у беднасці».

Паводле легенды, аднойчы ноччу да яе нібыта з'явіўся анёл. Ён параіў Ефрасінні заснаваць свой манастыр у Сяльцы на рацэ Палаце. Здзейсніць гэта ёй дапамог полацкі епіскап Ілья, а таксама яе родзічы з княжацкай сям'і. У манастыры асветніца адкрыла школу для маладых жанчын. Пра гэта гаворыцца ў «Жыціі Ефрасінні Полацкай». ***Жыціем*** называюцца апавяданні пра жыццёвы шлях і дзейнасць служыцеля царквы ці іншага хрысціянскага героя.

Колькасць насельніц манастыра ўвесь час павялічвалася. Ефрасіння вырашыла пабудаваць каменную царкву ў імя Святога Спаса. *Спас* — рэлігійнае свята ў гонар Ісуса Хрыста — па-руску «спасителя», па-беларуску «выратавальніка». Гэтай царкве асветніца ў 1161 г. падаравала вельмі каштоўны крыж, вядомы зараз як крыж Ефрасінні Полацкай.

Ефрасіння заснавала ў Полацку і мужчынскі манастыр. Для яго яна пабудавала другую каменную царкву ў гонар Святой Багародзіцы — маці Ісуса Хрыста. Гэтай царкве Ефрасіння падаравала выдатны твор мастацтва — абраз Святой Багародзіцы, што быў прывезены з далёкай Візантыі.



*Абраз Святой Багародзіцы, прывезены з Візантыі*

На схіле жыцця Ефрасіння вырашыла адправіцца ў далёкае і цяжкае падарожжа ў Іерусалім, каб пакланіцца Святой зямлі, якая нарадзіла Ісуса Хрыста. З вялікай пашанай праводзілі яе жыхары Полацка.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

У розных краінах гасцінна сустракалі славутую палачанку. Памерла яна ў час свайго паломніцтва ў Іерусаліме 23 мая 1167 г. Пазней мошчы беларускай асветніцы былі перавезены ў Полацк у заснаваны ёю Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр.

Ефрасіння Полацкая была першай жанчынай на Русі, якую праваслаўная царква абвясціла святой.

**3. Кірыла Тураўскі.** Беларускі асветнік і рэлігійны дзеяч Кірыла Тураўскі нарадзіўся каля 1113 г. у Тураве. Ён вывучыў Святыя Пісанні, а пасля пайшоў у манастыр і стаў манахам.

**Гэта цікава.** У «Жыціі» Кірылы распавядаецца: «Сын заможных бацькоў, ён не любіў, аднак, багацця і тленнай славы гэтага свету, але найперш стараўся спасцігнуць вучэнне боскіх кніг і добра напрактыкаваўся ў Святых Пісаннях».

Сярод манахаў Кірыла карыстаўся вялікай павагай. У невялікай келлі, пры кволым святле ён чытаў кнігі, пісаў свае павучанні. Сваім незвычайным жыццём Кірыла Тураўскі набыў вялікую славу ва ўсім краі. Калі памёр тагачасны тураўскі епіскап, то па просьбе князя і тураўскага веча ён быў прызначаны на пасаду епіскапа.

Кірыла Тураўскі вядомы ў гісторыі і як выдатны для свайго часу пісьменнік і прамоўца. Вось чаму яшчэ пры жыцці яго называлі Златавустам. Ён напісаў шэраг «слоў» (зваротаў да вернікаў), малітваў, аповесцей-прытчаў. ***Прытча*** — невялікі рэлігійны твор, які мае павучальны змест. Свае творы Кірыла Тураўскі прызначаў для прамаўлення ў царкве перад шматлікімі слухачамі.

Творы асветніка былі добра вядомы пры яго жыцці. Потым іх перапісвалі, уключалі ў зборнікі. Літаратурная дзейнасць Кірылы Тураўскага дае ўяўленне аб высокай духоўнай культуры Турава і Турава-Пінскай зямлі.



*Першая старонка «Слова» Кірылы Тураўскага*

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**4. Значэнне дзейнасці рэлігійных асветнікаў.** Нялёгкім было для нашай Бацькаўшчыны XII стагоддзе — час раздробленасці, смуты і ўсобіц. І ў гэтыя цяжкія для народа гады яркім святлом на небасхіле нашай гісторыі нібыта зоркі зіхацелі імёны Ефрасінні Полацкай і Кірылы Тураўскага. Дзякуючы іх дзейнасці ў той складаны час развіваліся адукацыя, пісьменнасць, кніжная справа, усталёўвалася ў свядомасці людзей хрысціянская мараль.

Дзейнасць рэлігійных асветнікаў была прасякнута клопатамі аб тых, хто жыў у беднасці, хто трапіў у бяду. Сваімі думкамі і справамі яны імкнуліся зрабіць жыццё людзей больш светлым, асэнсаваным і чалавечным. Свой талент і веды, сваю жыццёвую мудрасць яны прысвяцілі служэнню Радзіме і свайму народу.

### Пытанні і заданні

1. Дайце тлумачэнне дат: *1104—1167, 1113*.
2. Растлумачце паняцці: *жыціе, прытча*.
3. Як вы лічыце, што ў дзейнасці Ефрасінні Полацкай было найбольш карысным для людзей і нашай Айчыны?
4. Чаму царква абвясціла Ефрасінню Полацкую святой?
5. Якія творы пісаў Кірыла Тураўскі?
6. Як вы ацэньваеце той факт, што праз 800 гадоў пасля смерці Кірылу Тураўскаму ўстанавілі на яго радзіме помнік?
7. Растлумачце, чаму дзейнасць беларускіх асветнікаў XII — пачатку XIII ст. была звязана з царквой.
8. У чым заключаецца значэнне дзейнасці рэлігійных асветнікаў?
9. Складзіце паведамленне пра асветніцкую ці рэлігійную (на выбар) дзейнасць Ефрасінні Полацкай.

## ДАКУМЕНТЫ І МАТЭРЫЯЛЫ

### З «Аповесці пра Ефрасінню Полацкую»

«...і кожны дзень навучала сёстраў (манашак) сваіх: старых вучыла цярпенню і ўстрыманню, юных — душэўнай чысціні і цялеснаму супакаенню... пры старэйшых маўчаць, мудрых слухаць, да старэйшых — пакоры, да роўных і меншых — любові некрывадушнай, мала казаць, а больш разумець... І не хацела яна бачыць, каб хто варагаваў: ні князь з князем, ні баярын з баярынам, ні з простых хто са сваім сябрам, але ўсіх жадала бачыць аднадушнымі...».

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# § 25. КУЛЬТУРА БЕЛАРУСКІХ ЗЯМЕЛЬ

**Успомніце**

1. Хто стварыў славянскую азбуку і паклаў пачатак славянскай пісьменнасці?
2. Якія стылі панавалі ў XI—XIII стст. у архітэктуры краін Заходняй Еўропы? Якімі характэрнымі асаблівасцямі вызначаўся кожны з іх?

**1. Царкоўнае будаўніцтва.** Першыя хрысціянскія цэрквы на беларускай зямлі будаваліся з дрэва. Цалкам верагодна, што іх ставілі на месцы былых язычніцкіх свяцілішчаў.

Выдатным дасягненнем сярэдневяковай беларускай культуры з'яўляюцца помнікі мураванага дойлідства, пераважна цэрквы. ***Муравanae дойлідства*** — гэта ўзвядзенне будынкаў з каменю і цэглы, змацаваных вапнавым растворам. Мураваныя будынкі прыгожа вылу-



*Спаса-Ефрасіннеўская царква ў Полацку*



*Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне*

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Збан-галаснік*

чаліся сярод драўляных збудаванняў сярэдневяковых гарадоў. Самай старажытнай мураванай пабудовай у Беларусі з'яўляецца Полацкі Сафійскі сабор.

Грандыёзны Сафійскі сабор у Полацку будаваўся ў сярэдзіне XI ст. Гэта трэці храм у землях усходніх славян, прысвечаны Сафіі, пасля наўгародскага і кіеўскага. Слова «Сафія» азначае «мудрасць», што, па ўяўленні вернікаў, кіравала Сусветам.

Велічны Полацкі сабор быў сімвалам магутнасці горада Полацка і яго князёў. Акрамя галоўнага прызначэння — месца, дзе людзі маліліся Богу, ён служыў для захавання архіва, бібліятэкі, дзяржаўнай казны. Першапачаткова храм меў сем купалоў.

У сярэдзіне XII ст. на беразе Палаты была пабудавана Спаская царква Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра. Будаваў яе полацкі дойлід Іаан (Іван).

**Гэта цікава.** Аднакупальнай Спаса-Ефрасіннеўскай царкве дойлід Іаан надаў ярусны вежападобны выгляд. Упершыню ва ўсходнеславянскім дойлідстве купал царквы быў аздоблены так званымі какошнікамі. Гэты новы тып будынкаў з'яўляецца адметнай рысай полацкай архітэктурнай школы.

Выдатным помнікам дойлідства XII ст. з'яўляецца Барысаглебская (у імя святых князёў Барыса і Глеба) царква ў Гродне. Часцей яе называюць Каложскай царквой, таму што яна была пабудавана на тэрыторыі Каложскага пасада.

**Гэта цікава.** Знадворныя сцены царквы ўпрыгожаны камянямі розных колераў, а таксама каляровымі пліткамі. Імі выкладзены розныя фігуры. Усё гэта надае будынку святочны выгляд. Унутры ў сцены былі ўмураваны гліняныя збаны-галаснікі. Дзякуючы ім у царкве лепш гучаў голас святара. Каложская царква з'яўляецца найбольш яркім прыкладам гродзенскай архітэктурнай школы дойлідства.

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Крыж Ефрасінні Полацкай*

**2. Мастацтва.** Хрысціянскія цэрквы звычайна ўпрыгожваліся фрэскамі і абразамі. Так, у Спаса-Ефрасіннеўскай царкве ўсе сцены і слупы былі размаляваны фрэскамі. ***Фрэска*** — гэта жывапіс вадзянымі фарбамі па свежай тынкоўцы. На цёмным фоне маляваліся постаці святых. Першае, што міжволі звяртае на сябе ўвагу, — твары людзей, іх дугападобныя бровы і вялікія, задуменныя вочы. Так мастакі імкнуліся перадаць унутраны свет веруючага чалавека, выказаць сваё разуменне прыгожага.

Сярэдневяковы жывапіс на беларускіх землях быў прадстаўлены таксама кніжнымі ***мініяцюрамі***. Яны ўяўлялі сабой прыгожыя шматкаляровыя малюнкі-ілюстрацыі да падзей, аб якіх распавядалася на старонках летапісаў і рукапісных кніг. Цудоўныя мініяцюры змешчаны ў «Тураўскім евангеллі» (XI ст.) і «Аршанскім евангеллі» (XIII ст.).

У беларускіх землях XI—XIII стст. былі распаўсюджаны розныя творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Сярод іх прадметы побыту, упрыгожанні, зброя, посуд, абразкі з выявамі святых, шахматныя фігуркі і інш.

Найлепшым узорам беларускага прыкладнога мастацтва з'яўляецца крыж Ефрасінні Полацкай. Зрабіў крыж у 1161 г. выдатны майстар Богша (у хрышчэнні — Лазар) па заказе Ефрасінні Полацкай. Беларуская асветніца падаравала яго Спаскай царкве.

**Гэта цікава.** Крыж меў 51 см у вышыню, таўшчыня яго складала каля 2 см. Зроблены ён быў з трывалага дрэва. Паверхня пакрыта залатымі пласцінамі, а з бакоў — вузкія сярэбраныя палоскі з выбітымі на іх доўгімі надпісамі кірыліцай. Тэкст надпісу папярэджваў: «І хай не выносяць яго з манастыра ніколі, і не прадаюць, і не аддаюць. Калі ж не паслухаецца хто і вынесе з манастыра, хай не дапаможа яму святы крыж ні ў жыцці гэтым, ні ў будучым...».

Правообладатель Издательский центр БГУ

На залатых пласцінах крыжа змяшчаліся выявы сына Божага — Ісуса Хрыста, Божай Маці, Іаана і іншых святых. Яны былі выкананы рознакаляровымі эмалямі з сінімі, чырвонымі, белымі, зялёнымі адценнямі. З выявамі святых чаргаваліся шматлікія арнаменты. У іх пераважалі крыжападобныя фігуры, сустракаліся таксама раслінныя ўзоры.



*Хрыстос Пантакратар. Фрэска са Спаса-Ефрасіннеўскай царквы ў Полацку. XII ст.*

Крыж Ефрасінні Полацкай з'ўляецца найкаштоўнейшым помнікам нашай гісторыі. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны крыж знік з Магілёўскага краязнаўчага музея, дзе ён захоўваўся, і яго лёс дагэтуль застаецца невядомым.

У наш час майстар з Брэста М. Кузьміч вырабіў копію крыжа. Яна захоўваецца ў Спаса-Ефрасіннеўскай царкве ў Полацку.

**3. Пісьменнасць. Помнікі пісьменства.** У XI ст. у Полацкай зямлі ўжо добра была вядома кірылічная пісьменнасць. Аб гэтым сведчыць надпіс на плоскім камяні, які быў знойдзены ў падмурку Полацкай Сафіі, а таксама надпісы на прасліцах, амфарах, камянях, берасцяныя граматы.

У рэчышчы Заходняй Дзвіны ў розных месцах знаходзіліся чатыры вялікія валуны з высечанымі крыжамі і надпісамі XII ст.: «Госпадзі, памажы рабу свайму Барысу». Каля Оршы быў выяўлены «Рагвалодаў камень» вышынёй 3 м з вялікай колькасцю надпісаў. Гэты унікальны помнік культуры ўсходніх славян да нашага часу не збярогся.



*Так выглядалі тагачасныя рукапісныя кнігі*

Выключную навуковую каштоўнасць маюць берасцяныя граматы. На баку бяросты, які прылягаў да дрэва, пры дапамозе піса́ла надрапвалі літары. Такія незвычайныя пісьмовыя крыніцы знойдзены ў Віцебску і Мсціславе. Берасцяныя граматы сведчаць аб тым, што

Правообладатель Издательский центр БГУ

ў гарадах пісьменнымі людзьмі былі не толькі прадстаўнікі духавенства і знаці, але і простыя гараджане.

Незаменнымі крыніцамі нашых ведаў аб мінулым з'яўляюцца летапісы. Агульны старажытны летапіс усходніх славян быў складзены ў Кіеве ў пачатку XII ст. Ён вядомы пад скарочанай назвай «Аповесць мінулых гадоў». Аповесць пачынаецца словамі: «Се повести временных лет, откуда есть пошла Руская земля, кто в Киеве нача первее княжити и откуду Руская земля стала есть». Летапіс утрымлівае каштоўныя звесткі аб гісторыі ўсіх усходніх славян, іх далёкай мінуўшчыне.

Сярод рукапісных царкоўных кніг самая ранняя — «Тураўскае евангелле» — створана ў XI ст. Акрамя мініяцюр, аб якіх вы даведаліся раней, ***евангелле*** ўпрыгожана загаловачнымі літарамі, якія намаляваны чырвонай, сіняй, зялёнай фарбамі.

Кнігі ў той час пісалі на *пергаменце* — спецыяльна выробленай тонкай скуры маладых жывёл. Лісты рукапісу складвалі ў сшыткі і сшывалі. Вокладкамі служылі дзве дошкі. Такая кніга мела выгляд скрынкі, якая зачынялася з дапамогай спражкі.

Такім чынам, насельніцтва беларускіх зямель у сярэдневякоўі мела своеасаблівую культуру даволі высокага ўзроўню.

### Пытанні і заданні

1. Дайце тлумачэнне даты: *1161*.
2. Растлумачце паняцці: *мураванае дойлідства, фрэска, мініяцюра, евангелле, пергамент*.
3. Як называецца самая старажытная мураваная пабудова ў Беларусі?
4. Пералічыце галоўнае і дадатковыя прызначэнні, якія выконваў Полацкі Сафійскі сабор.
5. Прывядзіце прыклады пабудоў полацкай і гродзенскай архітэктурных школ дойлідства. У чым іх асаблівасці?
6. Ахарактарызуйце мастацтва беларускіх зямель XI—XIII стст.
7. Якую гістарычную і мастацкую каштоўнасць мае крыж Ефрасінні Полацкай?
8. Як ствараліся рукапісныя кнігі?
9. Дакажыце на канкрэтных прыкладах, што на беларускіх землях ужо з XI ст. была распаўсюджана пісьменнасць.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Змест берасцяной граматы з Віцебска (XIII—XIV стст.)**

«Ад Сцяпана да Няжылы. Калі ты прадаў адзенне, то купі мне жыта на 6 грыўняў. А калі чаго не прадаў, то прышлі мне ў наяўнасці. Калі ж прадаў, то будзь ласкаў, купі мне жыта».

*На падставе прачытанага тэксту адкажыце, ці можна лічыць аўтара граматы чалавекам багатым. Сваю думку абгрунтуйце.*

## § 26. ПАЎСЯДЗЁННАЕ ЖЫЦЦЁ НАШЫХ ПРОДКАЎ У IX—XIII стст.

**Успомніце**

1. Як жылі людзі ў сярэдневяковай Заходняй Еўропе?
2. Якія катэгорыі людзей жылі ў сярэдневяковых гарадах? Чым яны займаліся?

**1. Усходнеславянскае (старажытнарускае) грамадства.** Усходнеславянскае, або старажытнарускае, грамадства, да якога адносілася таксама насельніцтва беларускіх зямель у IX—XIII стст., не было аднародным.

Аснову тагачаснага грамадства складалі простыя людзі — сяляне і рамеснікі. Як ужо адзначалася, сярод сялян вылучаліся свабодныя абшчыннікі — «людзі», паўзалежныя смерды, якія неслі на карысць князя павіннасці і плацілі яму даніну. Былі ў гэтыя часы і цалкам залежныя людзі — рабы. Яны называліся халопамі альбо чэляддзю. Большая частка жыцця простых людзей праходзіла ў працы. Нават зімой, калі работы ў полі прыпыняліся, сяляне даглядалі жывёлу, займаліся хатнімі промысламі — прадзеннем, ткацтвам, вырабам і рамонтам сялянскіх прылад працы.

Найбольш уплывовым, пануючым пластом тагачаснага грамадства з'яўляліся князі і набліжаныя да іх людзі — дружыннікі і «княжыя мужы». Да вярхоў княжацкай дружыны належалі баяры. У старажытнарускім зводзе законаў «Руская праўда» іх жыццё абаранялася вельмі вялікім штрафам у 80 грыўняў. Баяры кіравалі ў сваіх уладаннях, у выпадку патрэбы ваявалі з ворагам. Аднак яны мелі значна больш воль-

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Ігрышча.*
*Малюнак з летапісу*

нага часу, які праводзілі на паляваннях, у пірах і забавах.

**2. Паселішчы і жыллё.** Паселішчы сялян былі пераважна невялікімі. Яны называліся сёламі (вёскамі). У сяле пражывала каля дзесятка сялянскіх сем'яў.

Сяляне жылі ў невялікіх драўляных хатах, якія складаліся з аднаго памяшкання. Уваход рабіўся ў вузкай (тарцовай) сцяне. Хаты былі курныя — гэта значыць, ацяпляліся глінабітнай печчу без дымахода або, як і раней, печчу-каменкай. Калі палілі ў печы, дым ішоў на хату і выходзіў праз адтуліну, зробленую ў столі або ў верхніх бярвёнах зруба. Асвятлялася хата вельмі цьмяна. Для гэтага выкарыстоўвалі лучыну — смалістую трэску, якая ўстаўлялася ў сцяну і запальвалася. Жыллё сялян мела прамавугольную форму, чатырохсхільную страху (дах), пакрытую саломай або абчасанымі дошкамі. Сцены складваліся з бярвёнаў, паміж якімі для ўцяплення закладваўся мох. Акенцы ў сценах былі вузенькія і закрываліся драўлянай заслонкай або зацягваліся бычыным пузыром. Спалі сяляне на лавах ці палацях з дошак.

Побач з хацінай размяшчаліся гаспадарчыя пабудовы — хлеў для жывёлы і птушкі і гумно для збожжа, сена і саломы.

Жыллё простых людзей IX—XIII стст. няшмат чым адрознівалася ад пабудоў усходніх славян больш ранняга часу. А вось жыллё знаці ў часы Старажытнай Русі вылучалася сваімі памерамі і раскошай унутранай аздобы. Баярскія сядзібы разам з хатамі халопаў і рамеснікаў, якія тут працавалі, займалі значную тэрыторыю.



*Павозка*

**3. Харчаванне.** Аснову харчавання нашых продкаў складалі прадукты земляробства, агародніцтва, жывёлагадоўлі. Промыслы, якімі яны займаліся, давалі мёд, рыбу, мяса дзічыны, грыбы, арэхі, ягады.

Правообладатель Издательский центр БГУ

Галоўным прадуктам харчавання быў хлеб. Шырока ўжывалася ў ежу гародніна.

Харчаванне багатых людзей было больш разнастайным. У ім пераважалі мясныя стравы. Да стала знаці падавалі розныя пачастункі і заморскія віны.

**4. Сродкі зносін.** У часы Старажытнай Русі вялікую ролю адыгрываў водны транспарт — чаўны, ладдзі. Па рэках перавозілі даніну і розныя тавары для гандлю, перамяшчаліся войскі і перасяляліся людзі. На шчасце, Беларусь перасечана мноствам буйных рэк са шматлікімі прытокамі. Праз беларускія землі праходзіла частка гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі» і адно з яго адгалінаванняў па Заходняй Дзвіне.

Звычайным сухапутным транспартам былі розныя павозкі (вазы), а ў зімовы час — сані. У вазы запрагалі коней або валоў. Коні выкарыстоўваліся і для верхавой язды.

Вандраванне па дарогах у той далёкі час было складанай справай. Дарогі часта размываліся і ператвараліся ў непралазную гразь. Значныя тэрыторыі займалі лясы і балоты. Цяжка было перайсці праз рэкі. Аднак людзі на балотах уладкоўвалі з бярвёнаў гаці, праз рэкі рабілі масты. Добраўпарадкаванне дарог з часам ператварылася ў адну з павіннасцей насельніцтва.

**5. Ваенная справа і зброя.** Аснову войска Старажытнарускай дзяржавы складалі княжацкія дружыны. Па меры неабходнасці ў войска набіраліся гараджане і смерды. Яны ўтваралі апалчэнне. Для буйных ваенных паходаў у войска запрашалі наёмнікаў — варажскія дружыны і атрады качэўнікаў.



*Зброя беларускіх ваяроў XII—XIII стст.*

Галоўнай і найлепшай зброяй у той час быў меч. Выкарыстоўваліся таксама коп'і, баявыя сякеры,

Правообладатель Издательский центр БГУ



*Свісцёлка*



*Біла*



*Рогі*



*Дуда-валынка*

больш рэдка — булавы. Як сведчаць крыніцы, вялікага майстэрства дасягнулі ваяры Полацкай зямлі ў стральбе з лука.

На працягу X—XIII стст. удасканальвалася засцерагальная зброя: яна станавілася ўсё больш цяжкай і моцнай. Металічныя кальчугі абаранялі амаль усё цела. Пашырылася выкарыстанне пласцінкавых панцыраў. Ваяры карысталіся таксама разнастайнымі шлемамі і шчытамі.

Княжацкія дружыннікі звычайна мелі вельмі дарагую і якасную зброю і выступалі ў паход на конях. У той жа час у апалчэнні прысутнічалі бедныя ваяры. Яны былі пешымі, і іх узбраенне абмяжоўвалася шчытом, сякерай і кап'ём. Некаторыя маглі мець толькі кароткае кідальнае кап'ё — су́ліцу.

У час бітваў шырока прымяняліся ваенныя хітрасці: завалы дарог, засады, пасткі, падманныя манеўры войска, высочванні праціўніка і шмат іншага. Пісьмовыя крыніцы сведчаць аб тым, што ўсходнія славяне былі выключна мужнымі воінамі. У бітвах яны вызначаліся стойкасцю, вытрымкай, праявамі воінскага братэрства.

**6. Забавы.** Усе важныя падзеі ў жыцці людзей у тыя часы суправаджаліся спевамі, танцамі, музыкай. Вядомымі музычнымі інструментамі былі дудка і яе разнавіднасці — сапёлка, жалейка і іншыя, а таксама дуда-валынка, варган, біла, рог, свісцёлкі.

Добра ўмелі граць на розных інструментах старажытнарускія скамарохі. Сваёй музыкай, спевамі і танцамі яны забаўлялі насельніцтва гарадоў і вёсак. Скамарохі таксама былі фокуснікамі, акцёрамі, вадзілі за сабой прыручаных мядзведзяў. Гэтыя першыя акцёры пастаянна вандравалі і выступалі на розных святах і таргах.

Любімай забавай багатых людзей было паляванне. Палявалі з дапамогай сабак і драпежных птушак — ястрабаў і сокалаў. Князі па-

Правообладатель Издательский центр БГУ



Каменная шахматная ладдзя

лявалі нават з гепардамі. У той час іх называлі пардусамі. Пасля палявання яго ўдзельнікі балявалі, частаваліся стравамі з забітай дзічыны.

У час раскопак у Полацку былі выяўлены касцяныя канькі. Знаходка датуецца XII ст. Памеры канькоў сведчаць аб тым, што імі карысталіся дзеці.

Дарослыя бавілі час за гульнёй у шашкі і шахматы. Паўсюдна на тэрыторыі Старажытнай Русі археолагі знаходзяць шахматныя фігуркі, зробленыя з рогу, дрэва, каменю. Шмат іх знойдзена і на тэрыторыі Беларусі.

Такім чынам, у IX—XIII стст. паўсядзённае жыццё нашых продкаў было разнастайным. Яны шмат працавалі, але знаходзілі час і для розных забаў.

**Пытанні і заданні**

1. З якіх катэгорый складалася насельніцтва беларускіх зямель у IX—XIII стст.?
2. Хто адносіўся да пануючага слоя тагачаснага грамадства?
3. Як называліся паселішчы сялян?
4. Як выглядала жыллё сялян і баяр?
5. Чым адрознівалася сялянская ежа ад ежы багатых людзей?
6. Пералічыце ўзбраенне воінаў.
7. Як бавілі час людзі ў часы Старажытнай Русі?

## НАШ КРАЙ

**Заданне 1.** Даведайцеся, у які час ваш населены пункт упершыню згадваецца ў пісьмовых крыніцах. Ці адпавядае дата, зафіксаваная ў пісьмовых крыніцах, археалагічным дадзеным?

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Заданне 2.** Высветліце, да якога княства належаў ваш населены пункт у XI ст. і ў перыяд палітычнай раздробленасці (XII — першая палова XIII ст.).

**Заданне 3.** Даведайцеся, ад якіх ворагаў найбольш моцна пацярпеў ваш край у X — першай палове XIII ст. Якія легенды і паданні захаваліся на гэты конт у вашай мясцовасці?

**Заданне 4.** З дапамогай гістарычных карт высветліце, якія гандлёвыя шляхі праходзілі праз вашу мясцовасць. Выкажыце свае меркаванні наконт таго, якія тавары правозіліся па гэтых шляхах.

**Заданне 5.** Пабывайце ў музеях вашай мясцовасці, каб даведацца, якія рэчы захаваліся ў іх ад часоў Ранняга і Высокага сярэдневякоўя. Абапіраючыся на гэтыя рэчы, зрабіце высновы пра:

- развіццё рамёстваў у вашым краі;
- побыт насельніцтва;
- гандлёвыя сувязі вашай мясцовасці.

**Заданне 6.** Апішыце адзін са старажытных абрадаў, які захаваўся ў вашай мясцовасці з часоў Ранняга і Высокага сярэдневякоўя. Якія язычніцкія, дахрысціянскія рысы ў ім можна знайсці?

## УРОК АБАГУЛЬНЕННЯ

**Заданне 1.** Пакажыце на картасхеме:

а) Старажытную (Кіеўскую) Русь;
б) Полацкае і Тураўскае княствы;
в) найбольш старажытныя гарады на тэрыторыі Беларусі;
г) гарады на тэрыторыі Беларусі, якія сталі цэнтрамі асобных княстваў;
д) водны шлях «з варагаў у грэкі».

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Заданне 2.** Успомніце і назавіце падзеі, якія звязаны з наступнымі датамі: 862, 980, 988, 1019, 1067, 1203.

**Заданне 3.** Падлічыце, згодна з летапіснымі звесткамі, на колькі гадоў пералічаныя гарады старэйшыя адзін за другі:

- Полацк за Тураў;
- Тураў за Брэст;
- Брэст за Мінск.

**Заданне 4.** Вызначце, хто княжыў раней, а хто пазней:
Ізяслаў, Рагвалод, Усяслаў.

**Заданне 5.** Вызначце прыкладныя назвы тэм, да якіх могуць адносіцца наступныя гістарычныя паняцці:

а) дзяржава, народнасць, этнас;
б) палюддзе, даніна, смерды, чэлядзь, халопы;
в) раздробленасць, воласць, міжусобныя войны;
г) язычніцтва, хрысціянства, жыціе, абраз, прытча, евангелле.

**Заданне 6.** Складзіце ў вуснай форме кароткія апавяданні па наступных тэмах з выкарыстаннем пададзеных ніжэй паняццяў:

а) «Збор даніны ў славян» (князь, дружына, палюддзе, даніна);
б) «Сярэдневяковы горад» (дзядзінец, пасад, рамяство, гандаль, сабор, рынак);
в) «Прыняцце хрысціянства» (язычніцтва, хрысціянства, сабор, царква, евангелле);
г) «Развіццё культуры» (мураванае дойлідства, рукапісныя кнігі, фрэскі, летапісы).

**Заданне 7.** Знайдзіце і выпраўце памылкі:

- Полацкае княства размяшчалася на поўдні Беларусі;
- полацкага князя Ізяслава называлі Чарадзеем;
- самым старажытным горадам, паводле летапісных звестак, з'яўляецца Мінск;
- на змену хрысціянству ў беларускія землі прыйшло язычніцтва.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Заданне 8.** Выберыце правільнае азначэнне:

- Рагвалод — гэта: а) асветнік; б) князь; в) рэлігійны дзеяч.
- Кірыла Тураўскі — гэта: а) летапісец; б) князь; в) рэлігійны дзеяч.
- Якаў Палачанін — гэта: а) княжацкі дружыннік; б) князь; в) асветнік.

**Заданне 9.** Раскажыце аб наступных гістарычных падзеях і з'явах:

а) бітва на рацэ Нямізе;
б) узнікненне гарадоў;
в) барацьба з крыжакамі;
г) барацьба з мангола-татарамі;
д) прыняцце хрысціянства;
е) з'яўленне рукапісных кніг.

**Заданне 10.** Вызначце, кім былі:

- Рагвалод, Ізяслаў, Усяслаў;
- Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі.

**Заданне 11.** Дакажыце справядлівасць ці абгрунтуйце памылковасць наступных сцвярджэнняў:

а) насельніцтва беларускіх зямель прыняло хрысціянства, таму што баялася божай кары;
б) простаму народу пісьменнасць была непатрэбнай. Ёю займаліся багатыя людзі, каб было чым запоўніць вольны час;
в) галоўнай мэтай крыжакоў было не распаўсюджанне каталіцтва, а заваяванне літоўскіх і беларускіх зямель.

**Заданне 12.** Назавіце імёны князёў, якім адпавядаюць наступныя летапісныя звесткі:

- «...прыйшоў быў з-за мора і меў уласць сваю ў Полацку»;
- «...ад яго ж і тураўцы празваліся».

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

**Заданне 13.** Запоўніце параўнальную табліцу ў сшытку па гісторыі.

| Пытанні для параўнання | Полацкае княства | Тураўскае княства |
|---|---|---|
| Калі ўзнікла? | | |
| Якую тэрыторыю займала? | | |
| Як называлася сталіца? | | |
| Першыя летапісныя князі | | |
| | *Вывад:* | *Вывад:* |
| *Агульны вывад:* | | |

**Заданне 14.** Складзіце календары гістарычных падзей па наступных тэмах:

а) Полацкае княства ў IX—XIII стст.;
б) знешняя небяспека ў XIII ст.;
в) гарады IX — сярэдзіны XIII ст.;
г) хрысціянства на заходніх землях Старажытнай Русі.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Вось прачытана і перагорнута апошняя старонка вучэбнага дапаможніка. Вывучаючы яго, вы даведаліся, які доўгі, багаты на падзеі і нялёгкі шлях прайшлі нашы прашчуры на беларускіх землях ад з'яўлення тут старажытнага чалавека да сярэдзіны XIII ст.

Веды, набытыя вамі, дапамогуць лепш зразумець жыццё нашых продкаў, якія ўмелі ствараць і гандляваць, абараняць свае землі і плённа працаваць на іх прасторах. Іх велічныя ўчынкі і звычайныя будзённыя справы складаюць гісторыю насельніцтва беларускіх зямель. Яна яскрава пацвярджае, што наша гістарычная спадчына тых часоў не горшая, чым у іншых народаў Еўропы.

Мы маем усе падставы ганарыцца сваёй старажытнай і сярэдневяковай гісторыяй, гераічнымі і драматычнымі падзеямі, якія тады адбываліся.

Кожны перыяд у гісторыі Беларусі (як і ў сусветнай гісторыі) непазбежна змяняецца новым, больш развітым. Эпоха старажытнага грамадства саступіла месца Ранняму сярэдневякоўю. На змену Ранняму і Высокаму сярэдневякоўю прыйшло Позняе сярэдневякоўе і Ранні новы час, вывучаць гісторыю якіх вы будзеце ў наступным годзе.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# СЛОЎНІК ГІСТАРЫЧНЫХ ПАНЯЦЦЯЎ І ТЭРМІНАЎ

| | |
|---|---|
| Абра́ды, § 13 | спецыяльныя рытуальныя дзеянні, якія здзяйсняліся пры нараджэнні, паўналецці, вяселлі і, нарэшце, смерці. |
| Ба́лты, § 8 | плямёны індаеўрапейскага паходжання, продкі сучасных літоўцаў і латышоў. Да прыходу славян засялялі Паўночную і Сярэднюю Беларусь. |
| Бацько́ўскі род, § 6 | абшчына, у якой роднасць усіх яе членаў лічылася па мужчынскай лініі. |
| Бая́ры, § 17 | у Кіеўскай Русі так называліся нашчадкі родаплемяннной знаці, старшыя дружыннікі і буйныя землеўласнікі. У перыяд раздробленасці гэта багатыя і ўплывовыя феадалы, супернікі княжацкай улады. |
| Бо́ртніцтва, § 12 | збор мёду дзікіх пчол. Борцю ў славян называлася дупло ў дрэве, дзе сяліліся пчолы. |
| Вае́ннае апалчэ́нне, § 11 | першапачаткова ў яго ўваходзілі ўсе мужчыны аднаго племені, пазней ваенная сіла, якая складалася з гараджан і сельскага насельніцтва і называлася «полк». Ад слова «полк» паходзіць назва «апалчэнне». |
| Верв, § 21 | назва сельскай абшчыны ў славян; паходзіць ад слова «вяроўка», якой адмяралі ўчасткі зямлі, што належалі членам абшчыны. |
| Ве́ча, § 11 | народны сход у грамадстве ўсходніх славян, які склікаўся для вырашэння важных спраў. Правам удзелу ў ім карысталіся ўсе паўнапраўныя вольныя мужчыны. |
| Во́лак, § 16 | сухапутны шлях гандлёвых зносін, які ляжыць паміж дзвюма рэкамі. |
| Во́ласць, § 17 | княжацкае ўладанне ў перыяд раздробленасці. |
| Во́рнае земляро́бства, § 4 | новы, больш передавы від земляробства, які прыйшоў на змену падсечна-агнявому. Для апрацоўкі зямлі сталі выкарыстоўваць рала і саху. |

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

| | |
|---|---|
| Вытво́рчая гаспада́рка, § 4 | гаспадарка, пры якой людзі самі рабілі тое, што неабходна для жыцця: выводзілі новыя пароды жывёл, вырошчвалі новыя гатункі раслін. |
| Вялі́кая патрыярха́льная сям'я́, § 6 | сям'я, якая складалася з некалькіх пакаленняў блізкіх родзічаў (сваякоў), што вялі агульную гаспадарку. На чале такой сям'і стаяў мужчына. |
| Гарадзі́шча, § 6 | умацаванае паселішча, якое ўзнікла ў Беларусі ў канцы бронзавага і пачатку ранняга жалезнага веку. |
| Го́рад, § 22 | першапачаткова ўмацаванае паселішча; пазней адміністрацыйны, прамысловы, гандлёвы і культурны цэнтр. Ва ўсходніх славян гарады ўзніклі ў IX—X стст. |
| Дані́на, § 11 | натуральны падатак (футра, мёд і г. д.), які плацілі князю падуладныя яму людзі. |
| Дваяве́рства, § 23 | становішча, калі частка насельніцтва, якая прыняла хрысціянства, па-ранейшаму пакланялася язычніцкім багам. |
| Дзядзі́нец, § 22 | умацаваны цэнтр сярэдневяковага горада. Назва ўтворана ад слова «дзед». Дзядзінцы найбольш старажытных гарадоў былі месцамі збору старэйшын — дзядоў. |
| Дружы́на, § 11 | атрад узброеных і спецыяльна абучаных ваеннай справе людзей. Дружыну ўзначальваў князь. |
| Ева́нгелле, § 25 | раннехрысціянскі твор, у якім расказваецца пра жыццё Ісуса Хрыста. |
| Епі́скап, § 23 | вышэйшы сан (званне) у хрысціянскай царкве. |
| Жыцці́е, § 24 | апавяданне пра жыццёвы шлях і дзейнасць служыцеля царквы, рэлігійнага дзеяча. |
| І́дал, § 13 | вобразная выява бога, якому пакланяліся язычнікі. |
| Індаеўрапе́йцы, § 4 | плямёны жывёлаводаў-вандроўнікаў, якія рассяліліся на вялікай тэрыторыі, у тым ліку і ў Еўропе. Пасля змешвання іх з мясцовым насельніцтвам утварыліся групы плямён: балты, славяне, германцы. |
| Князь, § 11 | першапачаткова ваенны правадыр племені, пазней уладар княства. |

Правообладатель Издательский центр БГУ

| | |
|---|---|
| Крыжакі́, § 20 | нямецкія рыцары Тэўтонскага ордэна, якія ў мэтах распаўсюджання Хрыстовай веры ажыццяўлялі заваёўніцкія паходы. |
| Курга́н, § 7 | земляны насып над магілай памерлага. |
| Ле́тапіс, «Уводзіны» | пагадовыя запісы гістарычных падзей. |
| Мана́х, § 23 | член царкоўнай абшчыны, які даваў абяцанне весці строгі лад жыцця з адмаўленнем ад матэрыяльных выгод і жыццёвых уцех. |
| Манго́ла-тата́ры, § 20 | заваёўнікі, гістарычнай радзімай якіх былі стэпы Манголіі. Пасля заваявання большасці рускіх зямель утварылі на Ніжняй Волзе адну з найбуйнейшых дзяржаў сярэднявечча — Залатую Арду (адсюль іх іншая назва — ардынцы). |
| Мацяры́нскі род, § 3 | абшчына, у якой роднасць яе членаў лічылася па жаночай лініі. |
| Міжусо́бная вайна́, § 17 | узброеная барацьба паміж асобнымі князямі. |
| Мініяцю́ра, § 25 | малюнкі невялікіх памераў, якія змяшчаюцца ў старажытных летапісах і рукапісных кнігах. |
| Мітрапалі́т, § 15, 23 | кіраўнік хрысціянскай царквы ў Старажытнарускай дзяржаве. |
| Міф, § 7 | старажытнае народнае паданне аб легендарных героях, багах, аб паходжанні розных з'яў прыроды. |
| Мурава́нае до́йлідства, § 25 | узвядзенне будынкаў з каменю і цэглы, змацаваных вапнавым растворам. |
| Наро́днасць, § 15 | устойлівая супольнасць людзей, заснаваная на агульнасці мовы, тэрыторыі размяшчэння, гаспадарчага і культурнага жыцця. |
| Падсе́чна-агнявре́ земляро́бства, § 4 | від земляробства ў лясной паласе, які прыйшоў на змену больш старажытнаму матычнаму. Пры падсечна-агнявым земляробстве ўчастак лесу высякалі, палілі дрэвы і засявалі гэту плошчу. Падсекай, ці лядам, называлася ачышчаная ад дрэў лясная дзялянка. |

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

| | |
|---|---|
| Палю́ддзе, § 21 | збор князем даніны з падуладнага яму насельніцтва. |
| Паса́д, § 22 | паселішча рамеснікаў і гандляроў, якое размяшчалася каля ўмацаванага цэнтра горада — дзядзінца. |
| Печ-до́мніца, § 5 | гліняная печ для атрымання з балотнай руды порыстай масы (крыцы) і крычнага жалеза. |
| Пле́мя, § 3 | трывалае аб'яднанне некалькіх родаў, звязаных агульнасцю паходжання. |
| Племянно́е кня́жанне, § 11 | славянскі саюз плямён, у якім існавала княжацкая ўлада. |
| Прадукцы́йнасць пра́цы, § 21 | колькасць вырабленай прадукцыі за адзінку часу. |
| Прысво́йвальная гаспада́рка, § 2 | від гаспадаркі, пры якім старажытны чалавек браў ад прыроды ўсё неабходнае для жыцця ў гатовым выглядзе. |
| Пры́тча, § 24 | невялікі рэлігійны твор павучальнага зместу. |
| Раздро́бленасць, § 17 | падзел дзяржавы на больш дробныя самастойныя часткі. |
| Раме́сная вытво́рчасць, § 22 | выраб розных прадметаў, неабходных для жыцця чалавека, ручным спосабам. |
| Расслае́нне грама́дства, § 6 | узнікненне сярод людзей маёмаснай няроўнасці, у выніку якой адбываецца падзел насельніцтва на пануючыя вярхі і залежныя нізы. |
| Ро́давая абшчы́на, § 3 | калектыў (невялікая група) старажытных людзей, якія былі звязаны паміж сабой сваёй роднасцю і агульнасцю паходжання, вялі агульную гаспадарку і сумесна валодалі прыладамі працы. |
| Сабо́р, § 22 | галоўная або вялікая царква горада. |
| Свяці́лішча, § 13 | месца, дзе язычнікі ўшаноўвалі сваіх багоў і прыносілі ім ахвяры. |
| Скульпту́ра, § 7 | від мастацтва, звязаны са стварэннем аб'ёмнага вобраза. |
| Славя́не, § 9 | плямёны індаеўрапейскага паходжання, продкі сучасных беларусаў, рускіх, украінцаў, палякаў, чэхаў, балгараў, сербаў і інш. |

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

| | |
|---|---|
| Славянізáцыя бáлтаў, § 10 | паступовы працэс усё большага зближэння балцкага насельніцтва са славянскім, вынікам якога было канчатковае зліццё балтаў са славянамі. |
| Смерд, § 21 | залежны паўсвабодны селянін. Меў асабістую свабоду, аднак зямля, на якой ён працаваў, належала князю. |
| Старэ́йшына, § 3 | кіраўнік роду або племені, самы вопытны і звычайна сталы чалавек. |
| Стая́нка, § 1 | месца пасялення першабытнага чалавека. |
| Сусе́дская абшчы́на, § 12 | калектыў людзей, якія жылі асобнымі сем'ямі і займаліся пераважна сельскагаспадарчай працай. У такую абшчыну акрамя родзічаў уваходзіла значная колькасць суседзяў. |
| Тры́зна, § 13 | у язычнікаў развітанне з нябожчыкам у выглядзе ваеннай гульні ці спаборніцтва. Пасля трызны спраўляліся памінкі, на якіх ушаноўвалі (паміналі) нябожчыка. |
| Фрэ́ска, § 25 | жывапіс вадзянымі фарбамі па свежай тынкоўцы. |
| Хало́п, § 21 | чалавек, які страціў асабістую свабоду і трапіў у поўную залежнасць ад феадала. Па сваім становішчы халопы былі рабамі. |
| Чэ́лядзь, § 21 | першапачаткова рабы, пазней людзі, якія трапілі ў залежнасць ад гаспадара, жылі пры яго двары і па яго загадзе выконвалі розныя гаспадарчыя работы. Да чэлядзі адносіліся таксама слугі феадала. |
| Язы́чніцтва, § 13 | вера ў існаванне многіх багоў, што ўвасаблялі сілы прыроды, і пакланенне ім. |

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# АСНОЎНЫЯ ДАТЫ І ПАДЗЕІ

**100—35 тыс. гадоў таму — канец 3-га тысячагоддзя да н. э.** — каменны век у Беларусі.

**100—35 тыс. гадоў таму** — першыя спробы пранікнення на тэрыторыю Беларусі неандэртальца — старажытнага выкапнёвага чалавека.

**40—35 тыс. гадоў таму** — з'яўленне ў Еўропе краманьёнца — «чалавека разумнага» сучаснага тыпу.

**24 тыс. гадоў да н. э.** — найбольш старажытная стаянка чалавека ў Беларусі (вёска Юравічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці).

**21 тыс. гадоў да н. э.** — стаянка чалавека каменнага веку каля вёскі Бердыж Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці.

**Пачатак 2-га тысячагоддзя да н. э. — канец VIII ст. да н. э.** — бронзавы век у Беларусі.

**VII ст. да н. э. — канец V ст. н. э.** — жалезны век у Беларусі.

**VIII—IX стст.** — утварэнне аб'яднанняў усходніх славян на тэрыторыі Беларусі: крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў.

**862 г.** — першае ўпамінанне пра Полацк у летапісе.

**960-я гг. — 980 г.** — княжанне ў Полацку Рагвалода.

**980 г.** — першае ўпамінанне пра Тураў у летапісе.

**988 г.** — хрышчэнне Русі.

**Каля 992 г.** — заснаванне епархіі ў Полацку.

**1005 г.** — заснаванне епархіі ў Тураве.

**1044—1101 гг.** — княжанне Усяслава Брачыславіча ў Полацку.

**3 сакавіка 1067 г.** — бітва на Нямізе. Першае ўпамінанне пра Менск (Мінск) у летапісе.

**1101—1119 гг.** — княжанне Глеба Усяславіча ў Менску.

**1127 г.** — паход кіеўскага князя Мсціслава на Полацкую зямлю.

**1157—1162 гг.** — княжанне ў Тураве Юрыя Яраславіча.

**1203—1216 гг.** — барацьба Полацка супраць нямецкіх рыцараў.

**1241 г.** — уварванне на Берасцейшчыну войска мангола-татараў.

Правообладатель Издательский центр БГУ

# РАІМ ПАЧЫТАЦЬ

Аповесць мінулых гадоў: старонкі летапісу. Мінск, 1999.
*Арлоў, У.* Таямніцы Полацкай гісторыі / Уладзімір Арлоў. Мінск, 2002.
*Бутрамееў, У.* Вялікія і славутыя людзі зямлі Беларускай / Уладзімір Бутрамееў. Мінск, 2002.
Гісторыя Беларусі ў літаратурных вобразах: дакастрычніцкі перыяд / склад. М. Р. Гнеўка. Мінск, 1979.
*Дайнека, Л.* След Ваўкалака: раман / Леанід Дайнека. Мінск, 2001.
*Загорульский, Э. М.* Древний Минск / Э. М. Загорульский. Минск, 1963.
Из тьмы веков светлеющие лики. Минск, 1994.
*Калечыц, А. Г.* Першыя людзі на зямлі Беларусі / А. Г. Калечыц. Мінск, 2007.
*Караткевіч, У.* Зямля пад белымі крыламі / Уладзімір Караткевіч. Мінск, 1992.
*Лысенко, П. Ф.* Открытие Берестья / П. Ф. Лысенко. Минск, 2007.
*Ляўкоў, Э. М.* Маўклівыя сведкі мінуўшчыны / Э. М. Ляўкоў. Мінск, 1992.
*Марціновіч, А.* Залатавуст з Турава, альбо Якая яна, старажытная Тураўшчына? / Алесь Марціновіч. Мінск, 2000.
*Марціновіч, А.* Святая Ефрасіння, альбо Адкуль ёсць, пайшла Полацкая зямля / Алесь Марціновіч. Мінск, 1999.
Нам засталася спадчына. Мінск, 1996.
Праз смугу стагоддзяў / уклад. М. Багадзяж. Мінск, 1993.
*Рябцевич, В. Н.* О чем рассказывают монеты / В. Н. Рябцевич. Минск, 1977.
Слова пра паход Ігаравы / маст. апрац. у сучас. мову Р. Барадуліна. Мінск, 1988.
*Тарасаў, К.* Беларусь: гістарычнае падарожжа для дзяцей / Канстанцін Тарасаў. Мінск, 2000.
*Тарасаў, С. В.* Чарадзей сёмага веку Траяна: Усяслаў Полацкі / С. В. Тарасаў. Мінск, 1991.
*Чарняўскі, М. М.* Ілюстраваная гісторыя старажытнай Беларусі / М. М. Чарняўскі. Мінск, 1997.
*Чарняўскі, М. М.* Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: першабытны перыяд / М. М. Чарняўскі. Мінск, 2003.
*Чаропка, В.* Імя ў летапісе / Вітаўт Чаропка. Мінск, 2003.
*Штыхаў, Г.* Галасы далёкіх продкаў / Георгій Штыхаў. Мінск, 1968.
*Штыхаў, Г. В.* Археолагі дапаўняюць летапісцаў / Г. В. Штыхаў. Мінск, 2009.

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

# ЗМЕСТ

**Слова да вучняў** ........ 3
**Звесткі пра вучэбны дапаможнік** ........ 4
**Уводзіны** ........ 5
**РАЗДЗЕЛ I. Беларускія землі ў старажытныя часы** ........ 9
§ 1. Найстаражытнейшыя людзі каменнага веку ........ 9
§ 2. Жыццё людзей у пасляледавіковы перыяд ........ 13
§ 3. Супольнасці людзей каменнага веку ........ 16
§ 4. Першабытныя жывёлаводы і земляробы ў бронзавым і жалезным вяках ........ 19
§ 5. Пачатак выкарыстання металаў на беларускіх землях ........ 22
§ 6. Узнікненне няроўнасці ў грамадстве ........ 25
§ 7. Культура нашых продкаў ........ 29
**Наш край** ........ 33
**Урок абагульнення** ........ 33
**РАЗДЗЕЛ II. Жыццё насельніцтва беларускіх зямель у Раннім сярэдневякоўі (V—IX стст.)** ........ 37
§ 8. Балты на тэрыторыі Беларусі ........ 37
§ 9. Паходжанне і рассяленне славян ........ 43
§ 10. Усходнеславянскія плямёны на тэрыторыі Беларусі ........ 48
§ 11. На шляху да дзяржавы ........ 54
§ 12. Гаспадарка, рамяство і гандаль усходніх славян ........ 59
§ 13. Рэлігія і міфалогія ўсходніх славян ........ 64
§ 14. Матэрыяльная культура ўсходніх славян ........ 69
**Урок абагульнення** ........ 74

Правообладатель Издательский центр БГУ

**РАЗДЗЕЛ III. Сярэдневяковыя княствы на тэрыторыі Беларусі ў IX — сярэдзіне XIII ст.** ... 77
§ 15. Дзяржаўнасць усходніх славян ... 77
§ 16. Полацкае княства ў IX—XI стст. ... 81
§ 17. Полацкая зямля ў XII — сярэдзіне XIII ст. ... 85
§ 18. Тураўскае княства ... 90
§ 19. Пасожжа, Берасцейская зямля і Панямонне ... 92
§ 20. Знешняя небяспека ў першай палове XIII ст. ... 97
§ 21. Гаспадарчыя адносіны ... 101
§ 22. Горад у IX — сярэдзіне XIII ст. ... 108
§ 23. Хрысціянства на заходніх землях Старажытнай Русі ... 112
§ 24. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы ... 116
§ 25. Культура беларускіх зямель ... 120
§ 26. Паўсядзённае жыццё нашых продкаў у IX—XIII стст. ... 125
**Наш край** ... 129
**Урок абагульнення** ... 130
**Заключэнне** ... 134
**Слоўнік гістарычных паняццяў і тэрмінаў** ... 135
**Асноўныя даты і падзеі** ... 140
**Раім пачытаць** ... 141

Издательский центр БГУ

Правообладатель Издательский центр БГУ

(Назва і нумар школы)

| Вучэбны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Вучэбнае выданне

**Штыхаў** Георгій Васільевіч
**Цемушаў** Сцяпан Мікалаевіч
**Ракуць** Васіль Уладзіміравіч

**ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ**
**са старажытных часоў да сярэдзіны XIII ст.**

**Вучэбны дапаможнік для 6 класа агульнаадукацыйных устаноў**
**з беларускай мовай навучання**

Рэдактар *М. І. Рэменіца*
Вокладка мастака *А. А. Ждаnоўскай*
Мастацкі рэдактар *М. Я. Шкурпіт*
Тэхнічны рэдактар *К. У. Хвагіна*
Камп'ютэрная вёрстка *Н. Я. Бацюковай*
Карэктары *Н. Б. Кучмель, А. А. Сямашка, В. С. Ярмак*

Падпісана ў друк 08.04.2009. Фармат 70×90/16. Папера афсетная № 1.
Гарнітура Літаратурная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 10,53.
Ул.-выд. арк. 6,85. Тыраж 29 390 экз. Заказ 1246.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага універсітэта».
ЛИ № 02330/0494361 ад 16.03.2009. Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, г. Мінск.

Вытворчае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛП № 02330/0056853 ад 30.04.2004. Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.

Издательский центр БГУ
Правообладатель Издательский центр БГУ